

# КАЛЯНДАР

## ЗНАМЯНАЛЬНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ НА 2024 ГОД

2023

ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»
Аддзел краязнаўства

# *Каляндар знамянальных і памятных дат на 2024 год*

Віцебск, 2023

**ББК 92.5**
**К 17**

Складальнікі: Л. І. Рагачова, В. А. Дарафеева
Рэдактар: Л. І. Рагачова
Адказны за выпуск Т. М. Адамян

**Каляндар** знамянальных і памятных дат на 2024 год / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўства ; склад. Л. І. Рагачова, В. А. Дарафеева. – Віцебск, 2023. – 218 с. : іл.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2023

**КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ**
**НА 2024 ГОД**

2023 г.

Складальнікі: Рагачова Ларыса Іванаўна, Дарафеева Вольга Аляксееўна
Рэдактар Л. І. Рагачова
Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай
Дызайн вокладкі Н. П. Шпехт
Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, Віцебск, Леніна, 8–а
E–mail: vlib@vlib.by

## ПРАДМОВА

У «Каляндар» уключаны знамянальныя і памятныя даты, якія адлюстроўваюць важныя падзеі гісторыі, палітычнага, гаспадарчага, культурнага жыцця Віцебскай вобласці, а таксама юбілейныя даты выдатных землякоў і людзей, якія па месцы нараджэння не з’яўляюцца ўраджэнцамі вобласці, але пакінулі значны след у гісторыі і культуры нашага рэгіёна.

Дапаможнік адкрываецца храналагічным пералікам знамянальных і памятных дат, якія прадстаўлены па новым стылі.

«Каляндар» састаўлены на аснове даных з энцыклапедый, даведачных, перыядычных выданняў, якія знаходзяцца ў фондзе Віцебскай абласной бібліятэкі.

Наш «Каляндар» дапаможа краязнаўцам, бібліятэчным работнікам, выкладчыкам і іншым спецыялістам у вывучэнні і распаўсюджванні краязнаўчых ведаў.

У 2024 ГОДЗЕ СПАЎНЯЕЦЦА:

**1050 гадоў** таму (974) згодна з «Віцебскім летапісам» быў заснаваны г. Віцебск.

**995 гадоў** таму (1029) нарадзіўся Усяслаў Брачыславіч (Усяслаў Чарадзей; каля 1029–1101), князь полацкі, пры якім пабудаваны Полацкі Сафійскі сабор, адзін з герояў «Слова аб палку Ігаравым».

**980 гадоў** таму (1044) пачалося будаўніцтва Полацкага Сафійскага сабора – помніка архітэктуры XI–XVIII стст. Пабудаваны (1044–1066) з плінфы і бутавага каменю (таўшчыня сцен да 1,45 м).

**965 гадоў** таму (1059) першае ўпамінанне ў Ніканаўскім летапісе населенага пункта Копысь. У 1116 г. – горад Смаленскага княства. Зараз – г. п. Копысь Аршанскага раёна, прыстань на левым беразе р. Дняпро.

**880 гадоў** таму (1144) у г. Полацку Рагвалод Барысавіч (у праваслаўі Васілій) пры падтрымцы сваіх прыхільнікаў быў выбраны вечам на княжанне.

**865 гадоў** таму (1159) полацкі князь Рагвалод Барысавіч (у праваслаўі Васілій) стаў князем у Друцку.

**760 гадоў** таму (1264) Полацк заключыў мірны гандлёвы дагавор з Рыгай і Лівонскім ордэнам.

**730 гадоў** таму (1294) нарадзіўся Нарымонт, Нарымунт (у праваслаўі Глеб; каля 1294–1348), князь полацкі.

**670 гадоў** таму (1354) нарадзіўся Скіргайла (у праваслаўі Іван; каля 1354–1394), князь полацкі, трокскі і кіеўскі. У 1377 г. пасля выгнання з Полацка князя Андрэя вялікі князь Ягайла пасадзіў там княжыць Скіргайлу. У 1381 г. незадаволеныя палачане выгналі яго з княжання.



энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2007. – Т. 5 : Минск–Педиатрия. – С. 746.

22. **Пашкевіч** Нічыпар Еўдакімавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 12 : Палікрат–Праметэй. – С. 247.

23. **Пашкевіч** Нічыпар Еўдакімавіч // «Віцебскі рабочы» – 80 год / рэд.-склад. У. Р. Скапа. – Віцебск : рэд. абл. газеты «Віцебскі рабочы», 1997. – С. 39–40.

24. **Пашкевіч** Нічыпар Еўдакімавіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал.: У. У. Андрыевіч [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2015. – Т. 6 : М–Я. – С. 151.

25. **Савік, Л. С.** Пашкевіч Нічыпар / Л. С. Савік // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 1994. – Т. 4 : Лазарук–Перкін. – С. 512–513.

26. **Салтук, А.** Зямляк і калега / А. Салтук // Віцебскі рабочы. – 2004. – 11 снеж. – С. 4.

27. **Смыкава, І.** Нічыпар Пашкевіч / І. Смыкава // Беларускія пісьменнікі-лаўрэаты : рэк. бібліягр. паказальнік / І. У. Смыкава. – Мінск : Дзярж. б-ка БССР імя У. І. Леніна, 1973. – С. 112–115.

В. Коваленко // Неман. – 1970. – № 6. – С. 166–171. – Рец. на книгу: Пашкевич, Н. Е. На эпическом направлении : подвиг народа в белорусском романе / Н. Е. Пашкевич ; авториз. пер. с белорус. З. Крахмальниковой. – переработ. изд. – Москва : Советский писатель, 1969. – 326 с.

12. **Марчанка, С.** Дыялог, непадуладны забыццю / С. Марчанка // Полымя. – 1984. – № 12. – С. 185–188.

13. **Мехаў, У.** Годнасць / У. Мехаў // Літаратура і мастацтва. – 1994. – 9 снеж. (№ 49) – С. 12.

14. **Ненадавец, А. М.** Пашкевіч Нічыпар Еўдакімавіч / А. М. Ненадавец // Уладзімір Караткевіч : энцыклапедыя / рэдкал.: В. У. Ваніна [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя Петруся Броўкі, 2020. – С. 300.

15. **Никифор** Пашкевич // В атмосфере художественного поиска и стилевого многообразия: творчество витебских литераторов во второй половине 1960-х – начале 1990-х годов : монография : в 2 ч. / А. В. Русецкий, Ю. А. Русецкий. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2012. – Ч. 2. – С. 359–367.

16. **Никифору** Пашкевичу – 50 лет // Неман. – 1974. – № 12. – С. 162.

17. **Нічыпар** Еўдакімавіч Пашкевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.] ; мастак А. М. Хількевіч. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1988. – С. 645.

18. **Памяці** калегі і земляка: [Некралог] // Віцебскі рабочы. – 2003. – 8 лют. – С. 4.

19. **Пашкевіч, Н.** Нічыпар Пашкевіч: «У нас быў ясны арыенцір» / Н. Пашкевіч // Віцебскі рабочы. – 1993. – 14 верас. – С. 3.

20. **Пашкевич** Никифор Евдокимович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 290.

21. **Пашкевич** Никифор Евдокимович // Республика Беларусь :



**615 гадоў** таму (1409) першае ўпамінанне ў гістарычных крыніцах в. Пасаднік, на месцы якой пазней узнік г. Паставы.

**585 гадоў** таму (1439) упершыню згадваецца горад Лепель, цэнтр Лепельскага раёна на беразе Лепельскага возера. У Лівонскую вайну (1558–1583) быў пабудаваны замак, у 1563 г. – асноўны горад.

**540 гадоў** таму (1484) упершыню згадваецца вёска Аршанскага раёна Смальяны як маёнтак у Аршанскім намесніцтве (з XVI ст. – у Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства ВКЛ), уладанне князя С. І. Бельскага.

**520 гадоў** таму (1504) упершыню ў пісьмовых крыніцах згадваецца населены пункт Ветрына Полацкага раёна.

**520 гадоў** таму (1504) утварылася Полацкае ваяводства.

**520 гадоў** таму (1504) першыя пісьмовыя звесткі пра Чашнікі.

**520 гадоў** таму (1504) закладзены Іказненскі замак браслаўскім старостам Я. Сапегам. Існаваў у XVI–XVIII стст. у в. Іказнь Браслаўскага раёна.

**510 гадоў** таму (1514) упершыню ў летапісах Дуброўна ўпамінаецца як горад.

**510 гадоў** таму (1514) у літоўскай метрыцы ўпершыню ўпамінаецца Глыбокае.

**510 гадоў** таму (1514) упершыню згадваецца горад Мёры (цэнтр Мёрскага раёна) як маёнтак у Браслаўскім павеце ВКЛ на беразе возера Мёрскае.

**490 гадоў** таму (1534) нарадзіўся Гваньіні, Гвагнін Аляксандр (1534–1614), польскі гісторык, камендант Віцебска. З 1561 г. удзельнічаў у Інфлянцкай вайне (1558–1583). Ураджэнец г. Верона (Італія).

**480 гадоў** таму (1544) нарадзіўся Глябовіч Ян Янавіч (1544–1590), ваенны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ герба «Ляліва». У Інфлянцкую вайну 1558–1582 вызначыўся пры абароне Полацка ад войска Івана IV, трапіў у палон.

**470 гадоў** таму (1554) складзены інвентар (апісанне) Браслава.

**460 гадоў** таму (1564) адбылася Аршанская бітва 1564 у канцы студзеня або пачатку лютага паміж авангардам арміі Маскоўскай дзяржавы і атрадам войска ВКЛ у часы Лівонскай вайны (1558–1583).

**445 гадоў** таму (1579) адбылася асада і ўзяцце г. Полацка войскамі Вялікага Княства Літоўскага.

**445 гадоў** таму (1579) адбылася асада Езярышчанскага замка войскамі Стэфана Баторыя.

**425 гадоў** таму (1599) была пабудавана Троіцкая царква на месцы драўлянага храма пры базыльянскім манастыры ў в. Белая Царква Чашніцкага раёна – помнік архітэктуры ранняга барока. У 1830-я гады – разбурана.

**420 гадоў** таму (1604) заснаваны Львом Сапегам касцёл у Талачыне, які потым быў пераўтвораны ва ўніяцкую царкву.

**420 гадоў** таму (1604) у Талачыне пабудавана Пакроўская царква. У 1768–1769 гг. заснаваны Пакроўскі манастыр базыльянаў, на месцы былой царквы пачата ўзвядзенне новага каменнага храма, а побач з ім – каменнага кляштарнага корпуса (будаўніцтва завершана ў 1779 г.). У 2004 г. у захаваных будынках адкрыты Пакроўскі жаночы манастыр.

**415 гадоў** таму (1609) нарадзіўся Сапега Павел Ян (1609–1665), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ, ваявода віцебскі ў 1646–1656 гг.

**415 гадоў** таму (1609) нарадзіўся Андрайкевіч Ян Андрэй (сапр. Гінтаўт-Андрайкевіч; 1609–1673), беларускі рэлігійны дзеяч, пісьменнік, педагог, прэфект бібліятэкі Полацкага калегіума (1631–1633), рэктар Полацкага калегіума (1650–1653).

**395 гадоў** таму (1629) нарадзіўся Сімяон Полацкі (сапр. Пятроўскі-Сітняновіч Самуіл Гаўрылавіч; 1629–1680), пісьменнік, філосаф-асветнік, паэт, драматург, грамадскі і царкоўны дзеяч, ураджэнец г. Полацка.



шырокіх шляхах жыцця» Н. Е. Пашкевіч быў удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа. У 1974 годзе яму прысвоена званне «Заслужаны работнік культуры БССР». У 1975 годзе ў складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

Памёр Нічыпар Еўдакімавіч Пашкевіч 5 лютага 2003 года ў Мінску.

Узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Абрамовіч, С.** Чалавек, які жыў і пісаў па-сапраўднаму / С. Абрамовіч // Наша Талачыншчына. – 2009. – 12 снеж. – С. 10.

2. **Асіпенка, А.** Дарога без прыпынкаў / А. Асіпенка // Полымя. – 1974. – № 12. – С. 197–199.

3. **Белоусов, О.** Уроки ответственности: штрих к портрету времен / О. Белоусов // Советская Белоруссия. – 2002. – 21 мая. – С. 7.

4. **Бураўкін, Г.** Ён прыйшоў з вайны... / Г. Бураўкін // Літаратура і мастацтва. – 1974. – 13 снеж. (№ 50) – С. 5.

5. **Вярцінскі, А.** Жыццё як адказнасць / А. Вярцінскі // Літаратура і мастацтва. – 1999. – 10 снеж. (№ 49) – С. 7.

6. **Вярцінскі, А.** Пафас, народжаны ў сэрцы / А. Вярцінскі. А. Стук // Віцебскі рабочы. – 1974. – 13 снеж. – С. 3.

7. **Журналист**, критик, литературовед // Моя Толочинщина: страницы истории / А. Шнейдер. – 2-е изд, с изм. – Минск : Бизнесофсет, 2006. – С. 141–142.

8. **З жыццевых** крыніц // Беларусь. – 1974. – № 12. – С. 27.

9. **Карніловіч, Э.** Рэдактар газеты «ЛіМ» / Э. Карніловіч // Наша Талачыншчына. – 2013. – 4 верас. – С. 7.

10. **Клышка, А.** Плён пісьменніцкага жыццяпісу / А. Клышка // Звязда. – 1974. – 11 снеж. – С. 14.

11. **Коваленко, В.** Главное направление – художественная правда /

1979 года, а з красавіка 1979 года да выхаду на пенсію ў лістападзе 1987 года – галоўным рэдактарам кінастудыі «Беларусьфільм». У 1992–1994 гадах працаваў старшынёй праўлення Беларускага літаратурнага фонду Саюза пісьменнікаў Беларусі.

На літаратурнай ніве Н. Е. Пашкевіч пачынаў як паэт. Меў несумненныя паэтычныя здольнасці. Друкавацца пачаў з 1943 года. Першая публікацыя – верш «Буря грянет» у раённай газеце «Чырвоны хлебароб». Першае літаратурна-крытычнае выступленне Н. Е. Пашкевіча адбылося ў друку ў 1948 годзе. Тады ў абласной газеце «Віцебскі рабочы» пачалі з'яўляюцца яго крытычныя агляды і рэцэнзіі на творы літаратуры і мастацтва. Грунтоўна і стала ён уваходзіць у літаратуру пазней. Удумлівы крытык, дасведчаны літаратуразнавец, яго працы вызначаліся дасканалым веданнем літаратурнага працэсу, своеасаблівасці таленту асобных пісьменнікаў. Пісаў пра многае: розныя тэмы і жанры прыцягвалі яго ўвагу. Але асноўнай тэмай усё ж была вайна. Амаль усё, што напісана ім, звязана з ваеннай літаратурай. Кнігі «На шырокіх шляхах жыцця» (1965), «На эпічным напрамку» (1969), часопісныя і газетныя артыкулы скрупулёзна даследуюць творы аб подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У полі ўвагі Н. Е. Пашкевіча – раманы М. Лынькова, І. Мележа, І. Шамякіна, А. Кулакоўскага, А. Адамовіча, І. Навуменкі, У. Карпава, М. Ткачова, І. Гурскага, аповесці В. Быкава і іншых. Калі сабраць усе публікацыі крытыка ў перыядычным друку, дык атрымалася б некалькі тамоў літаратуразнаўчых кніг.

Але яго дзейнасць далёка не вычэрпвалася журналістыкай і крытыкай. Гады працы ў партыйным друку, на розных пасадах у рэдакцыях газет і часопісаў выявілі яго як здольнага грамадскага работніка, таленавітага арганізатара літаратурнага жыцця. Сваёй працай, сваім прыкладам Н. Е. Пашкевіч даваў павучальныя ўрокі прафесійнага майстэрства, сумленнага і прынцыповага служэння друкаванаму слову. Н. Е. Пашкевіч з 1958 года быў членам Саюза беларускіх пісьменнікаў. З 1970 года – кандыдатам філалагічных навук. У 1966 годзе за кнігу «На



**385 гадоў** таму (1639) у Глыбокім было пачата будаўніцтва касцёла Успення Багародзіцы кляштара ордэна кармелітаў босых з каменю на паўночным беразе возера Вялікае па фундацыі мсціслаўскага ваяводы І. Корсака. У 1867 г. рэканструяваны, у 1878 г. пераасвечаны ў царкву. Зараз – Глыбоцкі кафедральны сабор Раства Багародзіцы – помнік архітэктуры позняга барока.

**380 гадоў** таму (1644) у Віцебску пабудаваны драўляны Пушкінскі («Рынкоўскі», «Гарадскі», «Езуіцкі») мост.

**375 гадоў** таму (1649) складзена адзінае вядомае апісанне Браслаўскага замка.

**375 гадоў** таму (1649) князь Геранім Друцкі-Саколінскі ўзвёў у г. Оршы мураваны касцёл дамініканцаў (касцёл Святога Іосіфа Абручніка).

**370 гадоў** таму (1654) у Віцебску драўляны касцёл езуітаў на тэрыторыі Ніжняга замка перабудаваны ў праваслаўны Аляксееўскі манастыр.

**370 гадоў** таму (1654) адбылася асада і штурм маскоўскімі войскамі г. Дуброўна, у выніку чаго замак быў спалены, а мясцовыя жыхары вывезены ў Смаленск.

**370 гадоў** таму (1654) Віцебск наведаў другі цар Маскоўскай дзяржавы з дынастыі Раманавых Аляксей Міхайлавіч.

**370 гадоў** таму (1654) згадваецца як мястэчка гарадскі пасёлак Лёзна – цэнтр Лёзненскага раёна.

**360 гадоў** таму (1664) нарадзіўся Грабніцкі Фларыян (1664?–1762), уніяцкі царкоўны дзеяч Рэчы Паспалітай, доктар тэалогіі, каад'ютар (намеснік) архіепіскапа полацкага, епіскап віцебскі (1716–1719), архіепіскап полацкі (1719–1762), мітрапаліт кіеўскі (1748–1762). Паходзіў са шляхецкай сям'і Полацкага ваяводства.

**355 гадоў** таму (1669) заснавана праваслаўнае брацтва пры віцебскай царкве Успення Прасвятой Багародзіцы.

**350 гадоў** таму (1674) нарадзіўся Дзягілевіч Уладзіслаў (1674–1714), беларускі архітэктар. Скончыў Полацкі езуіцкі калегіум (1695–1698). Працаваў у Оршы (1704–1705; 1707–1709).

**320 гадоў** таму (1704) была пабудавана Спаса-Праабражэнская царква ў мястэчку Барань (зараз горад Аршанскага раёна).

**310 гадоў** таму (1714) у в. Губіна Лепельскага раёна пабудаваны касцёл Святога Антонія з цэглы – помнік архітэктуры барока.

**310 гадоў** таму (1714) пабудаваны мураваны кляштар трынітарыяў у г. Оршы.

**290 гадоў** таму (1734) нарадзіўся Лісоўскі Іраклій (свецкае імя Іосіф; 1734–1809). У 1784–1809 гг. – полацкі ўніяцкі архіепіскап, у 1806–1809 гг. – мітрапаліт уніяцкай царквы ў Расійскай імперыі, ураджэнец Полацкага ваяводства.

**285 гадоў** таму (1739) нарадзіўся Бжастоўскі Павел Ксаверы (1739–1827), дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, рэфарматар, мецэнат, перакладчык, заснавальнік першай у Еўропе «сялянскай рэспублікі», ураджэнец в. Мосар Ашмянскага павета Віленскага ваяводства (цяпер у Глыбоцкім раёне).

**280 гадоў** таму (1744) у в. Лужкі Шаркаўшчынскага раёна пабудаваны касцёл Святога архангела Міхаіла пры кляштары піяраў, помнік архітэктуры позняга барока. У 1843 г. – перабудаваны.

**275 гадоў** таму (1749) упершыню згадваецца вёска Дабрамыслі Лёзненскага раёна на рацэ Чарніца як сяло Аршанскага павета ВКЛ.

**265 гадоў** таму (1759) у Асвеі пры манастыры міласэрных сясцёр пабудаваны шпіталь Сясцёр Міласэрнасці, помнік архітэктуры XVIII ст. з элементамі стылю барока.



потым памочнікам камісара атрада па камсамоле, камісарам атрада імя Катоўскага. Удзельнічаў у выпуску талачынскай падпольнай газеты «Чырвоны хлебароб» як член рэдкалегіі (сакавік 1943 – чэрвень 1944).

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Н. Е. Пашкевіч быў прызначаны рэдактарам талачынскай раённай газеты «Чырвоны хлебароб» (1944–1945). З марай аб педагагічнай дзейнасці прыйшлося развітацца – умяшаліся жыццёвыя абставіны і ўласцівасць ахвяраваць сваімі жаданнямі на карысць грамадству. Пасляваенныя гады назаўсёды звязалі яго з друкам. З красавіка 1945 года Н. Е. Пашкевіч – загадчык аддзела прамысловасці, а потым аддзела сельскай гаспадаркі рэдакцыі абласной газеты «Віцебскі рабочы». У 1946 годзе яго накіроўваюць на вучобу ў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП Беларусі. Пасля заканчэння вучобы, у 1948 годзе, ён зноў вярнуўся ў Віцебск у абласную газету.

У 1951 годзе Н. Е. Пашкевіч завочна заканчвае гістарычны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. З 1951 да 1960 года працуе на розных пасадах у рэдакцыі рэспубліканскай газеты «Звязда»: загадчыкам аддзелаў, адказным сакратаром рэдакцыі.

У 1956 годзе ён паступае ў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС на кафедру тэорыі літаратуры і мастацтва, якую скончыў у 1960 годзе. І адразу быў накіраваны ў Маскву ў зноў створаную «Экономическую газету» на пасаду рэдактара аддзела культуры. Вяртанне ў Мінск у лютым 1961 года было абумоўлена прапановай узначаліць газету «Літаратура і мастацтва». Галоўным рэдактарам гэтай газеты Нічыпар Еўдакімавіч працаваў да верасня 1969 года. Потым была зноў Масква – да 1972 года праца рэдактарам газеты «Правда» аддзела прэсы, крытыкі і бібліяграфіі. З 1972 па 1974 годы – Н. Е. Пашкевіч першы намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Литературное обозрение». Апошняе вяртанне ў Мінск – студзень 1974 года. Тут на пасадзе намесніка дырэктара Інстытута літаратуры Акадэміі навук БССР працаваў да мая 1976 года, потым быў рэктарам Мінскага інстытута культуры да красавіка

# Снежань



**ПАШКЕВІЧ**
**НІЧЫПАР ЕЎДАКІМАВІЧ**
*100 год з дня нараджэння*
*(1924)*

**Пашкевіч Нічыпар Еўдакімавіч** (псеўданімы П. Зеляньkоўскі, А. Каліна, К. Кветка, А. Крушина, А. Крушына ; 1924–2003) – беларускі савецкі крытык, літаратуразнавец, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Нарадзіўся 12 снежня 1924 года ў в. Філістава Алёнавіцкага сельскага савета Коханаўскага раёна Аршанскай акругі (зараз вёска Аболецкага сельскага савета Талачынскага раёна) у сялянскай сям'і Еўдакіма Іванавіча і Марыі Барысаўны Пашкевічаў. У 1934 годзе бацька, сельскі актывіст, загінуў ад рук бандытаў. Маці ўвесь час працавала ў калгасе. У 1939 годзе, пасля заканчэння сямігодкі, Нічыпар Пашкевіч, які хацеў быць настаўнікам, паступіў у Мінскае педагагічнае вучылішча імя Н. К. Крупскай. Вучылішча, якое скончыла ледзь не палова беларускіх літаратараў. Актыўна ўдзельнічаў у камсамольскай рабоце. Але паспеў скончыць толькі два курсы – пачалася Вялікая Айчынная вайна. Ён вымушаны быў вярнуцца ў в. Малыя Міхінічы (Мяхінічы) Талачынскага раёна, дзе ў той час жыла маці. У 1942 годзе ўступіў у партызанскі атрад брыгады «Граза», якая дзейнічала ў Талачынскім раёне. Быў байцом,



**260 гадоў** таму (1764) нарадзілася Карніцкая Магдалена (па мужу і сцэнічнае прозвішча Дырэнталь), танцоўшчыца, ураджэнка г. Паставы.

**260 гадоў** таму (1764) у Глыбокім было пачата будаўніцтва касцёла Святой Тройцы – помніка архітэктуры віленскага барока. У 1902–1908 гг. – перабудаваны.

**255 гадоў** таму (1769) быў закладзены Бачэйкаўскі парк на ўсходнім беразе ракі Ула ў мястэчку Бачэйкава (цяпер аграгарадок у Бешанковіцкім раёне).

**255 гадоў** таму (1769) пачата будаўніцтва Троіцкага касцёла на месцы былога драўлянага храма ў в. Дунілавічы Пастаўскага раёна. Завершана ў 1773 г.

**250 гадоў** таму (1774) акадэмікам І. Я. Старовым распрацаваны першы план развіцця і рэканструкцыі г. Віцебска.

**250 гадоў** таму (1774) узведзены мураваны базыльянскі кляштар у г. Оршы.

**250 гадоў** таму (1774) утворана Полацкая ўніяцкая духоўная кансісторыя – орган царкоўна-адміністрацыйнага кіравання, які існаваў у Полацкай уніяцкай архідыяцэзіі ў 1774–1839 гг.

**250 гадоў** таму (1774) у в. Лявонпаль Мёрскага раёна пабудавана Троіцкая царква, помнік драўлянага дойлідства з рысамі стылю барока.

**235 гадоў** таму (1789) адбылося адкрыццё народнага вучылішча ў г. Полацку.

**235 гадоў** таму (1789, па іншых звестках 1788, 1791) нарадзіўся Лужынскі Васіль (свецкае імя Бенядзікт Стафанавіч; 1789–1879), доктар багаслоўя (1825). Уніяцкі, потым праваслаўны царкоўны дзеяч, адзін з ініцыятараў Полацкага царкоўнага сабора (1839). Епіскап Аршанскі (1833–1840), архіепіскап Полацкі (1840–1866). Ураджэнец в. Старая Рудня Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Жлобінскім раёне Гомельскай вобласці).

**230 гадоў** таму (1794) нарадзіўся Баршчэўскі Ян (1794; па іншых звестках 1790 альбо 1796–1851), беларускі і польскі мысліцель, пісьменнік, выдавец, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры. Ураджэнец в. Мурагі (цяпер у Расонскім раёне).

**230 гадоў** таму (1794) у в. Лужкі Шаркаўшчынскага раёна пабудавана з цэглы царква Раства Багародзіцы, помнік архітэктуры пераходнага перыяду ад барока да класіцызму.

**230 гадоў** таму (1794) нарадзіўся Сухазанет Мікалай Ануфрыевіч (1794–1871), расійскі ваенны дзеяч, генерал артылерыі. У Айчынную вайну 1812 г. удзельнічаў у баях каля в. Клясціцы Расонскага раёна, на рацэ Сівошына, у Свольненскім баі, у баях каля Полацка, Чашнікаў, Віцебска.

**230 гадоў** таму (1794) нарадзіўся Хршчановіч Казімір-Вікенцій Мельхіёравіч (1794–1871), беларускі архітэктар, ураджэнец маёнтка Бястроск (іншыя назвы Безтроск, Безстроск) Барысаўскага павета Мінскай губерні (каля былой в. Шунеўка Докшыцкага раёна).

**225 гадоў** таму (1799) Свяцейшы Сінод Рускай Праваслаўнай Царквы заснаваў сабор у Оршы.

**215 гадоў** таму (1809) у Дрысе (Верхнядзвінск) пабудаваны касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі з цэглы – помнік архітэктуры класіцызму ( у 1867 г. – адноўлены, у 1980-я гг. – рэстаўрыраваны).

**215 гадоў** таму (1809) у Дуброўне пабудавана Троіцкая царква з цэглы, помнік архітэктуры класіцызму.

**215 гадоў** таму (1809) у Дуброўне пабудаваны касцёл і манастыр бернардзінцаў на месцы былога драўлянага манастыра.

**215 гадоў** таму (1809) нарадзіўся Паклеўскі-Козел Альфонс Фаміч (1809–1890), расійскі прадпрымальнік, мецэнат, ураджэнец маёнтка Быкаўшчына (цяпер вёска ў Полацкім раёне).



его жены и дочери / Е. Климович // Сельская газета. – 2014. – 6 нояб. – С. 30–31.

7. **Копыл, С. П.** Народный вожак / С. П. Копыл // Полацкі веснік. – 2020. – 16 кастр. – С. 21.

8. **Ломсадзе, Л.** Лица Победы: Дмитрий Тябут / Л. Ломсадзе // Дело. – 2019. – № 6. – С. 12–13.

9. **Мартинкевич, А.** Его война и мир / А. Мартинкевич // Советская Белоруссия. – 2014. – 28 нояб. – С. 10.

10. **Тябут, Д. В.** Сквозь огонь : записки комбрига / Д. В. Тябут. – 3-е доп. изд. – Минск : Беларусь, 1979. – 366 с.

11. **Тябут** Дмитрий Васильевич // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 530–531.

12. **Тябут** Дмитрий Васильевич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. – Т. 7 : Снегирь–Ящерицын. – С. 293.

13. **Цябут, Т. Д.** Добры ўрач спіць спакойна / Т. Д. Цябут ; гутарыла Д. Каско // Звязда. – 2016. – 27 жн. – С. 8.

14. **Цябут** Дзмітрый Васілевіч // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : біяграфічны даведнік : у 5 т. / рэдкал. І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1981. – Т. 5. – С. 642.

15. **Цябут** Дзмітрый Васільевіч // Памяць: Полацкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: І. Б. Каросцік, Р. І. Маслоўскі, А. Л. Петрашкевіч ; уклад. С. С. Чарняўская ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Вышэйшая школа, 1999. – С. 203.

16. **Чарняўская, С.** Таварыш камбрыг / С. Чарняўская // Полацкі веснік. – 2004. – 5 лістап. – С. 2.

Героя не было прысвоена.

Памёр Дзмітрый Васілевіч Цябут 3 студзеня 1987 года. Пахаваны на Усходніх могілках у г. Мінску.

Імем Д. В. Цябута названа адна з вуліц г. Полацка. Яго імя носіць Ветрынская сярэдняя школа, у фае якой 16 красавіка 2005 года адбылося ўрачыстае адкрыццё яго гарэльефа, як даніна памяці настаўніку, камбрыгу, дзяржаўнаму дзеячу. У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваюцца дакументы, фотаздымкі і асабістыя рэчы партызанскага камбрыга перыяду Вялікай Айчыннай вайны. У музеі Ветрынскай сярэдняй школы пастаянна дзейнічае экспазіцыя, прысвечаная знакамітаму камбрыгу і яго баявым саслужыўцам.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Барановский, Е.** Не получили золотых звёзд, но героями остались / Е. Барановский // Рэспубліка. – 1998. – 15 кастр. – С. 7.

2. **Вер'ясава, І.** Слаўны шлях партызанскага камбрыга / І. Вер'ясава // Патрыёт (Ушачы). – 2009. – 18 лістап. – С. 2.

3. **Из истории** партизанской бригады им. Ворошилова Витебской области об организации партизанских отрядов в Ветринском районе в 1942 г. // Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): документы и материалы : в 3-х т. – Минск, Беларусь, 1967. – Т. 1 : Зарождение и развитие партизанского движения в первый период войны (июнь 1941 – ноябрь 1942). – С. 638–639.

4. **Карасёў, В.** Настаўнік, камбрыг, дзяржаўны дзеяч : да 90-годдзя з дня нар. Дзмітрыя Васілевіча Цябута. Жыццё ў ветрынскі перыяд / В. Карасёў // Полацкі веснік. – 2004. – 17 снеж. – С. 7.

5. **Карасёў, В. Р.** У памяці людской назаўжды / В. Р. Карасёў. – Барысаў : Барысаўская ўзбуйненая друкарня імя 1 Мая, 2010. – 267 с.

6. **Климович, Е.** Долговечно то, что справедливо : каким он был – легендарный комбриг и руководитель Дмитрий Васильевич Тябут глазами



**210 гадоў** таму (1814) у Віцебску пры трынітарскім кляштары пачалося будаўніцтва мураванага касцёла ў гонар Ісуса. Пабудаваны ў 1821 г.

**210 гадоў** таму (1814) пабудаваны першы мураваны мост цераз р. Віцьба ў г. Віцебску.

**205 гадоў** таму (1819) у Дрысе (г. Верхнядзвінск) пабудавана царква ў імя свяціцеля Мікалая Цудатворца з цэглы – помнік архітэктуры класіцызму.

**205 гадоў** таму (1819) у Полацку створана пажарная служба.

**200 гадоў** таму (1824) у Браславе быў пабудаваны касцёл Раства Найсвяцейшай Дзевы Марыі – помнік архітэктуры неараманскага стылю.

**195 гадоў** таму (1829) у Віцебску жыў і працаваў Грыгаровіч Іван Іванавіч (1790–1852), настаўнік Аляксандраўскай гімназіі, рэктар павятовага і прыходскага вучылішчаў, археограф і гісторык царквы, протаіерэй.

**190 гадоў** таму (1834) заснавана Віцебская настаўніцкая семінарыя – першая на Беларусі спецыяльная навучальная ўстанова. Існавала да 1839 г.

**190 гадоў** таму (1834) заснавана Гарадоцкае пачатковае вучылішча.

**185 гадоў** таму (1839) адбыўся Полацкі царкоўны сабор, сход іерархаў уніяцкай царквы на Беларусі і Украіне (у межах Расійскай імперыі), які прыняў рашэнне аб яе далучэнні да Рускай Праваслаўнай Царквы.

**180 гадоў** таму (1844) быў створаны Віцебскі балет Піёна (1844–1847).

**180 гадоў** таму (1844) пабудаваны каменны Праабражэнскі сабор у г. Лепелі.

**170 гадоў** таму (1854) нарадзілася Гардзялкоўская Тэрэза (1854–1933), беларуская перакладчыца, выдавец. У 1908 г. арганізавала ў сядзібе Габрылёва-Папоўка (зараз – Талачынскі раён) беларускую школу, у якой настаўнікам працаваў Я. Колас.

**170 гадоў** таму (1854) пабудавана дарога Віцебск–Смаленск.

**165 гадоў** таму (1859) нарадзіўся Дваржэцкі-Баганавіч Фама Восіпавіч (1859–1920), рускі і савецкі архітэктар, акадэмік Імператарскай Акадэміі мастацтва, член Маскоўскага архітэктурнага таварыства. У 1885 г. атрымаў званне класнага мастака архітэктуры I ступені. З 1893 года выкладаў у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, разьбярства і дойлідства. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўваходзіў у склад Тэхнічнай рады Будаўнічага аддзела Рады раённых дум Масквы. Ураджэнец г. Віцебска.

**160 гадоў** таму (1864) узведзена мураваная Свята-Аляксееўская царква ў в. Смальяны Аршанскага раёна.

**160 гадоў** таму (1864) пачаў будавацца Храм Уваскрасення Хрыстова з цэглы ў г. Дзісна на Мёршчыне – помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

**160 гадоў** таму (1864) у в. Цвеціна Мёрскага раёна было пачата будаўніцтва Крыжаўздзвіжанскай царквы з цэглы (1864–1867), помніка архітэктуры рэтраспектыўнага стылю.

**155 гадоў** таму (1869) у Оршы адкрыта тэлеграфная станцыя.

**155 гадоў** таму (1869) адкрыта Ёдскае народнае вучылішча ў мястэчку Ёды (цяпер аграгарадок у Шаркаўшчынскім раёне).

**150 гадоў** таму (1874) нарадзіўся Сумарокаў Аляксандр Аляксандравіч (1874–1969), акцёр, рэжысёр. У 1919–1921 гг. жыў і працаваў у Віцебску.

**150 гадоў** таму (1874) пачало дзейнічаць Таварыства віцебскіх урачоў, створанае па ініцыятыве выконваючага абавязкі інспектара ўрачэбнай управы Ф. П. Купчынскага. Падчас Першай сусветнай вайны дзейнасць прыпынена. У пачатку 1917 г. Таварыства пераўтворана ў прафесійны саюз урачоў.

**150 гадоў** таму (1874) пачала выдавацца газета Полацкай праваслаўнай духоўнай кансісторыі «Полоцкие епархиальные ведомости». Выдавалася да 1917 г.



Пасля вызвалення тэрыторыі раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў з чэрвеня 1944 года па студзень 1950 года Д. В. Цябут працаваў першым сакратаром Ветрынскага райкама КПБ. У перыяд з 1950 да 1954 гг. – другім, а затым першым сакратаром Полацкага абкама КПБ. Са студзеня 1954 года па май 1961 года – другім сакратаром Віцебскага абкама КПБ. У гэты жа перыяд з верасня 1955 года быў вызвалены ад пасады і накіраваны на вучобу ў г. Маскву, у Акадэмію грамадскіх навук, на двухгадовыя курсы па падрыхтоўцы першых сакратароў абкамаў, крайкамаў, ЦК саюзных рэспублік. Пасля заканчэння курсаў ён зноў абраны другім сакратаром Віцебскага абкама.

У маі 1961 года Д. В. Цябут быў зацверджаны на пасадзе першага намесніка, а затым міністра вытворчасці і нарыхтовак БССР. На гэтай пасадзе працаваў да красавіка 1962 года, да таго часу, калі сесія Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных выбірае Д. В. Цябута старшынёй. У снежні таго ж года, у сувязі з пераменамі ў структурах КПСС, раздзелам камітэтаў партыі на два – прамысловы і сельскі –Дзмітрый Васілевіч абраны першым сакратаром Мінскага сельскага абласнога камітэта Камуністычнай партыі. А праз два гады, пасля ліквідацыі сельскіх абкамаў, 24 снежня 1964 года ён выбіраецца старшынёй выканкама Мінскага абласнога Савета народных дэпутатаў. На гэтым пасту быў да студзеня 1976 года. Пасля гэтага і да апошніх дзён свайго жыцця Д. В. Цябут працаваў старшынёй рэвізійнай камісіі Кампартыі Беларусі.

Дзмітрый Васілевіч Цябут абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і Вярхоўнага Савета СССР двух скліканняў.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна (тройчы), Чырвонага Сцяга, Кутузава I ступені, Айчыннай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), медалямі. У 1965 годзе Д. В. Цябут у ліку найбольш вядомых кіраўнікоў партызанскага руху прадстаўляўся да звання Героя Савецкага Саюза. Першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў звярнуўся да Л. І. Брэжнева з прапановай аб прысваенні звання 17 прадстаўнікам Беларусі, у тым ліку Д. В. Цябуту. Але па волі лёсу Д. В. Цябуту званне

Марыйскай АССР. У маі 1942 года Д. В. Цябут прызначаны камандзірам узвода 33-й запасной стралковай брыгады Асобага беларускага збору. Гэта адбылося пасля таго, як Цэнтральным камітэтам Усесаюзнай Камуністычнай партыі (ЦК ВКП) было прынята рашэнне аб стварэнні на акупіраваных тэрыторыях падпольных абкамаў і райкамаў партыі і арганізацыі барацьбы з ворагам. Пасля месячнай падрыхтоўкі для адпраўкі ў тыл ворага, з мэтай арганізацыі партызанскага руху і абароны Полацка-Лепельскай зоны, Д. В. Цябут быў прызначаны камандзірам атрада «Мсцівец». 14–15 ліпеня 1942 года атрад праз «Суражскія вароты» перайшоў лінію фронту і праз 6 дзён прыбыў у Ветрынскі раён на месца сваёй першай дыслакацыі.

Гэты атрад у колькасці 46 чалавек, дасланы Штабам партызанскага руху, стаў ядром, вакол якога пачала арганізоўвацца партызанская брыгада імя Варашылава пад камандаваннем Д. В. Цябута (снежань 1942 – ліпень 1944 гг.). Адначасова з верасня 1942 года Дзмітрый Васілевіч быў сакратаром падпольнага райкама КПБ.

Вось адзін з прыкладаў баявой дзейнасці брыгады Д. В. Цябута, якi прыводзіць на сваім сайце Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Партызанскія брыгады пад кіраўніцтвам Д. В. Цябута, В. В. Мельнікава і полк І. Ф. Садчыкава ў ноч на 1 лютага 1944 г. здзейснілі налёт на чыгуначны ўчастак Полацк–Круляўшчызна. За ноч партызаны падарвалі 2500 рэльсаў, 7 мастоў, знішчылі некалькі кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі. Авіяцыя 1-га Прыбалтыйскага фронту, наведзеная партызанамі на вялікую колькасць варожых эшалонаў на станцыях, паспяхова завяршыла партызанскую баявую справу. Такіх баявых аперацый на ліку брыгады Д. В. Цябута было шмат.

Дзейнасці атрада «Мсцівец» і брыгады імя К. Варашылава, пасляваеннаму адраджэнню гаспадаркі прысвечаны кнігі ўспамінаў Д. В. Цябута «Путь к Победе» (1959), «Праз агонь» (1962), «Сквозь огонь» (1968, 1975, 1979), «На освобожденной земле» (1982). «На земле опаленной» (1984).



**145 гадоў** таму (1879) у Расонах пабудавана царква ў гонар Узнясення Гасподняга з бутавага каменю, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю. У 1990-я гг. – адрэстаўрыравана.

**140 гадоў** таму (1884) выйшла ў свет кніга А. П. Сапунова «Историческая записка 75-летия Витебской гимназии».

**140 гадоў** таму (1884) першае згадванне пра Полацкі вінаробны завод як «Полацкая вінакурня».

**135 гадоў** таму (1889) Віцебск наведаў рускі пісьменнік Іван Бунін (1870–1953).

**135 гадоў** таму (1889) нарадзіўся Калнін Аўгуст Янавіч (1889–1941), дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, старшыня Віцебскага губпрафсавета (1922–1923), загадчык аддзела мясцовай гаспадаркі Віцебскага губкама партыі (1923–1924), ураджэнец в. Відземе Ліфляндскай губерні (цяпер у Латвіі).

**130 гадоў** таму (1894) у Віцебску быў пракладзены вадаправод.

**130 гадоў** таму (1894) нарадзіўся Лагун Іосіф Васілевіч (1894–1920), удзельнік барацьбы за савецкую ўладу на Беларусі, ураджэнец в. Мікіцёнкі Дзісенскага павета Віленскай губерні (цяпер у Шаркаўшчынскім раёне).

**130 гадоў** таму (1894) у Паставах была пабудавана мураваная Свята-Мікалаеўская царква – помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

**130 гадоў** таму (1894) Віцебскае аддзяленне Расійскага таварыства веласіпедыстаў-турыстаў правяло ў горадзе спаборніцтвы на лепшага ездака.

**125 гадоў** таму (1899) адбыўся першы з’езд урачоў Віцебскай губерні.

**125 гадоў** таму (1899) Віцебская група РСДРП выдала сваю першую лістоўку «К витебским рабочим».

**125 гадоў** таму (1899) у Оршы пачаў дзейнічаць цагельны завод І. С. Зархі. У 1908 г. на прадпрыемстве працавала 35 рабочых.

**125 гадоў** таму (1899) у Віцебску пад уплывам сацыял-дэмакратычнага камітэта Бунда адбыліся выступленні рабочых. Побач з экалагічнымі выстаўляліся і палітычныя патрабаванні.

**125 гадоў** таму (1899) пачаў дзейнічаць Віцебскі тэатр Дзянісава (1899–1900 гг.)

**125 гадоў** таму (1899) нарадзіўся Рыськін Арон Барысавіч (1899–1984), прафсаюзны і партыйны дзеяч. З 1923 г. – сакратар Магілёўскіх павятовага і акруговага, Віцебскага акруговага камітэтаў КП(б)Б. Ураджэнец в. Ціхінічы Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Гомельскай вобласці).

**125 гадоў** таму (1899) нарадзілася Марусевіч Алена Карлаўна (1899–?), прафсаюзны і дзяржаўны дзеяч. З 1915 г. – матальшчыца, у 1925–1928 гг. – арганізатар Віцебскай ільнопрадзільнай фабрыкі «Дзвіна». Ураджэнка г. Вільня Віленскай губерні (цяпер г. Вільнюс, Літва).

**120 гадоў** таму (1904) у Віцебску адбыліся гастролі актрысы Малога тэатра А. А. Яблачкінай (1866–1964).

**120 гадоў** таму (1904) у Віцебску адбыліся гастролі спявачкі А. Д. Вяльцавай (1817–1913).

**120 гадоў** таму (1904) зняты натурны план г. Віцебска (склаў каморнік Г. А. Маісееў), які ў якасці дадатку з каментарыямі А. П. Сапунова быў змешчаны ў «Памятной книжке Витебской губернии на 1905 год».

**120 гадоў** таму (1904) Д. П. Яфімаў выдаў у Маскве серыю паштовак з выявамі Оршы.

**120 гадоў** таму (1904) на Браслаўшчыне было пачата будаўніцтва Відзаўскага касцёла Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі з чырвонай цэглы на месцы былога храма 1481 года. Завершана – у 1914 г. Помнік архітэктуры неаготыкі.



Дапамагаў бацькам па гаспадарцы. Бацька вельмі клапаціўся і рабіў усё, каб даць сыну адукацыю, а калі не хапала сродкаў, нават прадаў каня. Вучыцца Дзмітрый пачаў з 7 год. Спачатку гэта была Тураўлянская пачатковая школа. Скончыўшы яе, працягнуў вучобу ва Усвяцкай чатырохкласнай школе. А пасля яе заканчэння паспяхова вытрымаў экзамены ў 5-ты клас Першай полацкай савецкай адзінай працоўнай школы. Пасведчанне аб заканчэнні полацкай сямігодкі атрымаў у 1931 годзе. У той жа год Дзмітрый Цябут паступае ў Полацкае педагагічнае вучылішча. Праз год рашэннем кіраўніцтва ўстановы яго перавялі на завочнае аддзяленне і накіравалі настаўнікам у сельскую школу: спачатку ў Маласітнянскі сельсавет, а ў 1933 годзе ў в. Шпакоўшчына Ветрынскага раёна. Кіраўніцтва раёна заўважыла арганізатарскія здольнасці маладога педагога. Летам 1936 года рашэннем Ветрынскага РК КПБ Д. В. Цябут быў зацверджаны на пасаду інспектара раённага аддзела народнай адукацыі, а ў кастрычніку ўзначаліў яго. Пасля завяршэння вучобы ў педтэхнікуме ў 1937 годзе паступае на завочнае аддзяленне гістарычнага факультэта Аршанскага педагагічнага інстытута, які скончыў у 1940 годзе.

Дзмітрый Васілевіч Цябут у 1939 годзе быў прызваны на ваенную службу і ў званні старшага лейтэнанта ўдзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай арміі супраць буржуазнай Польшчы. Са студзеня 1940 года ён на рабоце, з невялікімі перапынкамі (работа сакратаром райкама камсамола, рэдактарам раённай газеты), у апараце Ветрынскага раённага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі (РК КПБ). 5 студзеня 1941 года Д. В. Цябут на сесіі Ветрынскага раённага Савета народных дэпутатаў аднагалосна абраны яго старшынёй. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны – ён адзін з кіраўнікоў і арганізатараў эвакуацыйных мерапрыемстваў у раёне. Сам Д. В. Цябут толькі праз два месяцы пасля таго, як пакінуў раён, з вялікімі цяжкасцямі дабраўся да месца прызначэння ў Калінінскую вобласць. З 10 верасня 1941 года да красавіка 1942 года ён – палітрук 2-й вучэбнай роты 1-га асобнага вучэбнага батальёна 38-га стралковага палка, 48-й стралковай брыгады, якая дыслацыравалася ля станцыі Суроп

прызыў (Орша). – 1990. – 15 мая. – С. 3.

14. **Шаруха, І.** Даследчык Сібіры / І. Шаруха // Віцебскі рабочы. – 1991. – 9 лют. – С. 4.

15. **Шарухо, И.** Н. В поисках земли Санникова... / И. Н. Шарухо // Магілёўшчына: [зборнік краязнаўчых артыкулаў] / [адказ. рэд. С. І. Бяспанск]. – Магілёў : Абласны краязнаўчы музей, 1993. – Вып. 4. – С. 79–83.

16. **Шарухо, И. Н.** Имена белорусов на карте мира / И. Н. Шарухо, А. В. Шадраков, В. Г. Хомяков // Геаграфія. –2014. – № 4.– С. 3–9.

# *Лістапад*



**ЦЯБУТ**
**ДЗМІТРЫЙ ВАСІЛЕВІЧ**
*110 год з дня нараджэння*
*(1914)*

**Цябут Дзмітрый Васілевіч** (1914–1987) – партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну.

Нарадзіўся 6 лістапада 1914 года ў Пуканаўка-1 Полацкага павета Віцебскай губерні (зараз Полацкі раён) у сялянскай сям'і Васіля Васілевіча і Ганны Васілеўны Цябутаў. Рана спазнаў сялянскую працу.



**115 гадоў** таму (1909) нарадзіўся Маісееў Стэфан Сяргеевіч (1909–1988), географ, астраном. Стварыў адзін з першых у СССР пункт па назіранні за штучнымі спадарожнікамі Зямлі, вынаходнік дзясяткаў мадэляў, у т.л. нябеснай сферы для адначасовай дэманстрацыі сучаснага і гадавога руху Зямлі. Ураджэнец м. Копысь Горацкага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Аршанскім раёне).

**115 гадоў** таму (1909) у Віцебску выдавалася інфармацыйна-рэкламная газета «Витеблянин». Вядомы 4 нумары.

**115 гадоў** таму (1909) выдадзена першая каляровая паштоўка «Орша. Мост цераз Дяпро».

**115 гадоў** таму (1909) нарадзіўся Канашэнка Сцяпан Мікалаевіч (1909–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец в. Узніцы Полацкага павета (цяпер Полацкі раён).

**115 гадоў** таму (1909) у в. Празарокі Глыбоцкага раёна пабудавана царква ў імя святых апосталаў Пятра і Паўла з цэглы, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

**110 гадоў** таму (1914) пачалося будаўніцтва чыгуначнай лініі Орша–Унеча. Уведзена ў строй у 1923 г.

**110 гадоў** таму (1914) нарадзіўся Сямашка Мікола (сапр. Мікалай Пятровіч; 1914–1941), паэт, ураджэнец в. Барылы (пазней зліласся з в.Катушонкі) Полацкага павета (цяпер Полацкі раён).

**110 гадоў** таму (1914) нарадзіўся Краўчанка Міхаіл Панцялеевіч (1914–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец с. Галоўшчына Курскай губерні (цяпер Белгародская вобласць, Расія).

**110 гадоў** таму (1914) у в. Галубічы Глыбоцкага раёна пабудавана царква Раства Багародзіцы – помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.

**110 гадоў** таму (1914) у в. Забор'е Глыбоцкага раёна пабудавана на месцы былога храма царква ў імя свяціцеля Мікалая Цудатворца.

**105 гадоў** таму (1919) у Віцебску адкрылася дзіцячая музычная школа № 1.

**105 гадоў** таму (1919) у Віцебску адбылася першая губернская спартыўная алімпіяда.

**105 гадоў** таму (1919) у Віцебску пачалі выдавацца плакаты «Окна «РОСТА». Апошні выйшаў у 1921 г.

**105 гадоў** таму (1919) у Віцебску пачаў выдавацца часопіс «Коммунистическая мысль» (да № 17), у 1922 г. – перайменаваны ў «Коммунистический труд» (з № 18). Выдаваўся ў 1919–1923 гг.

**105 гадоў** таму (1919) у Віцебску праведзена першая дзяржаўная выстава карцін мясцовых і маскоўскіх мастакоў.

**105 гадоў** таму (1919) тэрыторыя сучаснага Гарадоцкага раёна ўвайшла ў склад РСФСР.

**105 гадоў** таму (1919) у г. Віцебску заснаваны вучэбна-паказальны сад на аснове прыватнага саду. З 1924 г. – батанічны сад Ветэрынарнага інстытута, з 1931 г. – гарадскі школьны, з 1954 г. – аграбіястанцыя, з 1979 г. – вучэбнае і навуковае падраздзяленне Віцебскага педагагічнага інстытута. Зараз Батанічны сад Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

**105 гадоў** таму (1919) Віцебскі педагагічны інстытут перайменаваны ў Віцебскі інстытут народнай адукацыі.

**105 гадоў** таму (1919) створаны Віцебскі тэатр рэвалюцыйнай сатыры, Віцебскі тэрэвсат, агітацыйна-прапагандысцкі тэатр мініяцюр (1919–1920).

**105 гадоў** таму (1919) у Віцебску пры Доме культуры чыгуначнікаў створаны драматычны гурток. З 1977 г. – Віцебскі народны тэатр.



3. **Батыгин, А.** Огурцы с 66-й параллели / А. Батыгин // СБ. Беларусь сегодня. – 2006. – 7 сент. – С. IV. – (Прилож.: Союз Беларусь–Россия).

4. **Брылеўскі, М. М.** Выхадцы з Беларусі ў даследаваннях Бліжняга і Дальняга Замежжа : вучэбны матэрыял да ўрока № 9 / М. М. Брылеўскі // Геаграфія. – 2015. – № 12. – С. 37–43.

5. **Бялыніцкі-Біруля** Аляксей Андрэевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.:Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 3 : Беларусы–Варанец. – С. 402.

6. **Бялыніцкі-Біруля** Аляксей Андрэевіч // Імёны, асобы, лесы : ураджэнцы Віцебшчыны ў далёкім і блізкім замежжы / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. – Минск : Літаратура і мастацтва, 2012. – С.47–49.

7. **Грицкевич, В. П.** За розовой чайкой В. П. Грицкевич // От Немана к берегам Тихого океана / В. П. Грицкевич. – Минск : Полымя, 1986. – С. 266–269.

8. **Грыцкевіч, В. П.** За ружовай чайкай / В. П. Грыцкевіч // Віцебскі рабочы. – 1972. – 23 сак. – С. 4.

9. **Грыцкевіч, В. П.** Бялыніцкі-Біруля Аляксей Андрэевіч / В. П. Грыцкевіч // Памяць: Орша. Аршанскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] ; склад.: Т. Г. Ігнацьева [і інш.] ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2000. – Кн. 2. – С. 420.

10. **Літвіновіч, Я.** Дзе зімуе «бургамістр»? / Я. Літвіновіч // Літаратура і мастацтва. – 2022. — 23 верас. (№ 38). – С. 15.

11. **Перчёнок, Ф. Ф.** Академия наук на «великом переломе» / Ф. Ф. Перчёнок // Звенья: исторический альманах / ред.-сост. Н. Г. Охотин, А. Б. Рогинский. – Москва : Прогресс ; Феникс, 1991. – Вып. 1. – С. 163–239.

12. **Подлипский, А.** Первый метеоролог Витебщины / А. Подлипский // Неман. –1983. – № 4. – С. 174–175.

13. **Шаруха, І.** Беларускі прыродазнаўца / І. Шаруха // Ленінскі

членам пяці навуковых таварystваў: Санкт-Пецярбургскага таварыства прыродазнаўцаў (1892), Рускага энтамалагічнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу (1895), Імператарскага таварыства суднаходства (1899), членам Імператарскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пры Імператарскім Маскоўскім універсітэце геаграфічнага таварыства (1906), ганаровым членам Рускага энтамалагічнага таварыства (1919). Геаграфічная дзейнасць А. А. Бялыніцкага-Бірулі ў 1924 годзе была адзначана вышэйшай узнагародай Рускага геаграфічнага таварыства – Канстанцінаўскім медалём. У 1935 яму без абароны была прысвоена ступень доктара біялагічных навук.

А. А. Бялыніцкі-Біруля не менш вядомы і як мастак. Галоўная тэма яго мастацкіх твораў – арктычныя пейзажы, якія ён ствараў на аснове сваіх экспедыцыйных замалёвак. У 1908 годзе яго абралі акадэмікам Расійскай акадэміі мастацтваў.

Памёр Аляксей Андрэевіч Бялыніцкі-Біруля 18 чэрвеня 1937 года і пахаваны ў Санкт-Пецярбургу. Рэабілітаваны 30 чэрвеня 1989 года.

У Архіве Расійскай акадэміі навук ёсць імянны фонд А. А. Бялыніцкага-Бірулі пад нумарам 291 (утвораны ў 1937 годзе). Дакументы, якія ахопліваюць перыяд за 1864–1930 гады, былі перададзены жонкай вучонага М. С. Бялыніцкай-Біруляй.

Яго імем названы заліў і гара на ўзбярэжжы паўвострава Таймыр, а таксама рака на поўначы вострава Новая Сібір, від раслін – Cerastium Bialynicki A. Tolm, роды, віды і падвіды розных жывёл.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **[Аляксей** Андрэевіч Бялыніцкі-Біруля] // Беларускія вучоныя, даследчыкі і вынаходнікі ў галіне тэхнічных і натуральных навук (другая палова XVII — першая чвэрць XX ст.) / В. Я. Бездзель, В. М. Хаданёнак. – Віцебск : ВДТУ, 2018. – С. 92–94.
2. **Аляксей** Бялыніцкі-Біруля // Гісторыя праз лёсы / А. Марціновіч. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – Т. 2. – С. 198–207.




**105 гадоў** таму (1919) у г. Віцебску заснаваны Дом кнігі на базе бібліятэкі-чытальні. У 1928 г. прысвоена імя М. Горкага, у 1975 г. атрымаў статус цэнтральнай бібліятэкі. Зараз – Віцебская цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага.

**105 гадоў** таму (1919) заснаваны саўгас «Адаменкі» ў Лёзненскім раёне. З 2001 г. – КУСП. У 2003 г. далучаны СВК «Станіслававa». З 2013 г. – ААТ «Адаменкі». З 2022 г. – пад знешнім кіраваннем ААТ «БелВітуніфарм».

**105 гадоў** таму (1919) створана Віцебскае раённае ўпраўленне Заходне-Дзвінскага ўчастка воднага транспарту, у распараджэнні якога знаходзілася 19 параходаў, якія здзяйснялі перавозкі.

**105 гадоў** таму (1919) у Віцебску створана прадстаўніцтва цэнтральнага інфармацыйнага органа Рэспублікі Саветаў – Віцебскае аддзяленне Расійскага тэлеграфнага агенцтва «ВіцРОСТА». З 1924 г. – у складзе БЕЛТА.

**105 гадоў** таму (1919) створана раённая арганізацыя Беларускага прафсаюза чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў ТРУП «Віцебскае аддзяленне Беларускай чыгункі».

**105 гадоў** таму (1919) пачалася работа па стварэнні Полацкага краязнаўчага музея. У 1926 г. – адкрыты для наведвальнікаў, з 1985 г. – філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**105 гадоў** таму (1919) у Полацку заснавана цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны як цэнтральная гарадская бібліятэка.

**105 гадоў** таму (1919) у Шуміліне заснавана цэнтральная раённая бібліятэка.

**105 гадоў** таму (1919) у Коханаве заснавана гарпасялковая бібліятэка. З 1975 г. – Коханаўская гарпасялковая бібліятэка-філіял № 2 Талачынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.

**105 гадоў** таму (1919) у Ветрыне заснавана гарпасялковая бібліятэка-філіял № 2. З 1979 г. – у складзе Полацкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.

**105 гадоў** таму (1919) у Оршы заснавана бібліятэка-філіял № 3. З 1977 г. – у складзе Аршанскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.

**105 гадоў** таму (1919) заснаваны Палац культуры і тэхнікі чыгуначнікаў Віцебскага культурна-спартыўнага цэнтра Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі ў г. Віцебску як клуб «Суботнік».

**100 гадоў** таму (1924) заснаваны Віцебскі мясакамбінат. З 1998 г. – ААТ.

**100 гадоў** таму (1924) у Оршы заснавана турысцка-аздараўленчае прыватнае УП «Орша» як дом адпачынку. З 1990 г. – турысцка-экскурсійны комплекс, з 1996 г. – турысцка-аздараўленчы комплекс, з 2004 г. – сучасная назва.

**100 гадоў** таму (1924) у Оршы створана прамыслова-гандлёвая фірма «Світанак» як аб’яднанне «Праца калектыў». З 1967 г. фабрыка спецыялізавалася на пашыве дзіцячага адзення. З 1991 г. – арэнднае прадпрыемства, з 1996 г. – ЗАТ.

**100 гадоў** таму (1924) у Оршы заснавана метэаралагічная станцыя «Орша».

**100 гадоў** таму (1924) Віцебск наведаў беларускі пісьменнік Янка Купала (1882–1942).

**100 гадоў** таму (1924) ва Ушачах адбылася першая раённая настаўніцкая канферэнцыя.

**100 гадоў** таму (1924) ва Ушачах адкрылася першая раённая сельгасвыстава.

**100 гадоў** таму (1924) пачата будаўніцтва Бігосаўскага чыгуначнага вакзала Верхнядзвінскага раёна на чыгуначнай лініі Полацк–Даўгаўпілс.

**100 гадоў** таму (1924) у Віцебску пры ветэрынарным інстытуце арганізаваны першы ў рэспубліцы энтамалагічны музей.



справы яе мужа былі адхіленыя. Але з юрыдычнага аддзела Пампаліта ёй паведамілі, што А. А. Бялыніцкі-Біруля быў высланы ў Паўночны Край (накіраваны ў ссылку ў Архангельск) у лютым 1932 года на ўвесь астатак тэрміну яго зняволення, гэта значыць да 14 лістапада 1935 года. У Архангельску А. А. Бялыніцкі-Біруля быў залічаны ў мясцовае аддзяленне Дзяржаўнага акіянаграфічнага інстытута (ГАІН), а таксама аддалена працягваў супрацоўнічаць з Заалагічным інстытутам АН СССР.

Пасля заканчэння архангельскай ссылкі, Аляксей Андрэевіч атрымаў магчымасць прадоўжыць працу ў Алма-Аце старэйшым заолагам у заалагічным сектары Казахстанскага філіяла Акадэміі навук СССР. У 1935 годзе філіял знаходзіўся ў працэсе станаўлення. Заалагічны сектар займаў часовыя памяшканні. Для эфектыўнай працы не хапала лабараторных інструментаў, матэрыяльнага абсталявання, літаратуры. А. А. Бялыніцкі-Біруля з усёй сваёй энергіяй узяўся за работу, і ў хуткім часе ўзначаліў заалагічны сектар. Жадаючы ўзняць на якасна новую вышыню работу сектара, Аляксей Андрэевіч у 1936 годзе выступіў з прапановай стварэння заалагічнага парка ў горадзе Алма-Аце, як навукова-даследчай базы для казахстанскіх вучоных. Заалагічны парк быў адкрыты ў лістападзе 1937 года, але ўжо без удзелу А. А. Бялыніцкага-Бірулі.

У 1937 годзе ён скончыў працу над рукапісам манаграфіі «Фалангі (салпугі)» са шматлікімі графічнымі і каляровымі выявамі сальпуг (вынік шматгадовай працы па вывучэнні гэтага атрада павукападобных). Перад аўтарам паўстала пытанне аб выданні працы. Ёсць сведчанні таго, што А. А. Бялыніцкі-Біруля ў пачатку 1937 года вярнуўся ў г. Ленінград і дамовіўся з Заалагічным інстытутам Акадэміі навук аб выданні сваёй працы. Прыняты ў друк рукапіс быў ужо пасля яго смерці, 22 ліпеня 1937 года. Апошняя навуковая праца Аляксея Андрэевіча ўбачыла свет у 1938 годзе.

Адкрыцці і даследаванні Аляксея Андрэевіча Бялыніцкага-Бірулі былі высока ацэнены навуковым асяроддзем. Ён быў абраны сапраўдным

экспедыцыях, але і з калекцыямі Заалагічнага музея і музеяў з іншых гарадоў і краін, дасланых яму на апрацоўку. Ён аўтар больш за 100 апублікаваных навуковых прац па сістэматыцы і біягеаграфіі жывёл, па насякомых, млекакормячых, птушках на рускай і нямецкай мовах. А. А. Бялыніцкі-Біруля свае працы суправаджаў уласнымі ілюстрацыямі.

У 1920-я гады А. А. Бялыніцкі-Біруля займаў пасаду намесніка старшыні Пастаяннай палярнай камісіі Акадэміі навук, уваходзіў у склад Пастаяннай камісіі па вывучэнні трапічных краін, удзельнічаў у рабоце Камісіі па вывучэнні Якуцкай АССР, працаваў у Географа-эканамічным даследчым інстытуце пры геаграфічным факультэце Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1919 г. на Канферэнцыі маскоўскіх і петраградскіх спецыялістаў удзельнічаў у выпрацоўцы Дэкрэта аб паляванні. У 1923 годзе Бялыніцкі-Біруля быў абраны членам-карэспандэнтам Расійскай акадэміі навук, а ў 1925 годзе стаў членам-карэспандэнтам Акадэміі навук СССР.

У 1929 годзе пачалася рэарганізацыя Заалагічнага музея Расійскай акадэміі навук, дырэктарам якога на той час быў А. А. Бялыніцкі-Біруля. Працавала ўрадавая камісія. 23 лістапада 1929 г. А. А. камісіяй па праверцы апарату Акадэміі навук Бялыніцкі-Біруля быў зняты з пасады дырэктара і пераведзены на пасаду старшага заолага, а 15 лістапада 1930 года арыштаваны па «справе Акадэміі навук». 10 лютага 1931 года ён быў асуджаны тройкай АДПУ пры Ленінградскай ваеннай акрузе тэрмінам на 5 гадоў папраўчых працоўных лагераў і быў накіраваны адбываць тэрмін у Белбалтлаг на станцыю Май-Губа Мурманскай чыгункі на рубку лесу і яго транспарціроўку. Але ўжо ў верасні таго ж 1931 года Аляксей Андрэевіч быў зняты з фізічных прац і пераведзены ў іншы лагер, размешчаны ў пасёлку Сегеж лекпомам (памочнікам лекара). Гэта здарылася пасля звароту жонкі А. А. Бялыніцкага-Бірулі да кіраўніка праваабарончай арганізацыі Палітычны Чырвоны Крыж (Пампаліт) А. П. Пешкавай (зварот ад 31.07.1931). Усе далейшыя звароты М. С. Бялыніцкай-Бірулі аб пераглядзе



**100 гадоў** таму (1924) Полацк і Полацкі павет увайшлі ў склад БССР.

**100 гадоў** таму (1924) у Віцебску адкрыты навукова-даследчы санітарна-бактэрыялагічны інстытут.

**100 гадоў** таму (1924) Віцебскі вышэйшы педагагічны інстытут аб'яднаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

**100 гадоў** таму (1924) быў створаны Высачанскі раён у Віцебскай акрузе – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР у 1924–1931 гг.

**100 гадоў** таму (1924) нарадзіўся Грыгор'еў Георгій Сцяпанавіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944), ураджэнец в. Лажкі (Ложкі) Мажайскага павета Маскоўскай губерні (цяпер у Маскоўскай вобласці, Расія).

**100 гадоў** таму (1924) нарадзіўся Ермалаеў Рыгор Дзмітрыевіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1945), ураджэнец в. Шылаўка Сярдобскага павета Саратаўскай губерні (цяпер у Саратаўскай вобласці, Расія).

**95 гадоў** таму (1929) адкрыты Аршанскі чыгуначны тэхнікум.

**95 гадоў** таму (1929) адкрыты Лепельскі педтэхнікум (з 1944 г. – педвучылішча). Было закрыта ў 1956 г.

**95 гадоў** таму (1929) ва Ушачах адкрыліся раённыя курсы піянерважатых.

**95 гадоў** таму (1929) у Віцебску заснавана арцель «8 Сакавіка», пазней – Віцебская фабрыка мастацкіх вырабаў «Купава».

**95 гадоў** таму (1929) у г. п. Обаль Шумілінскага раёна заснаваны Обальскі керамічны завод як цагляны завод № 37, камунальнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства, вядучае прадпрыемства галіны па вытворчасці высакаякаснай цэглы, з 1969 г. – сучасная назва. У 1974–1977 гг. пабудаваны завод керамічных вырабаў са шкілернай падрыхтоўкай глінамасы, у 1980 г. абодва

предпрыемствы аб’яднаны ў адно з сучаснай назвай. З 2002 г. – КУПП.

**95 гадоў** таму (1929) быў ліквідаваны Валынецкі раён у Полацкай акрузе – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР у 1924–1929 гг.

**95 гадоў** таму (1929) у Віцебску заснавана лесагаспадарчае прадпрыемства Беларускага дзяржаўнага трэста лясной прамысловасці. З 1984 г. – Віцебскае вытворчае лесанарыхтоўчае аб'яднанне «Віцебсклес», з 1995 г. – ААТ.

**95 гадоў** таму (1929) у г. п. Багушэўск Сенненскага раёна заснавана арцель «Чырвоны шавец», з 1959 г. – «Шлях камунізму», з 1960 г. – Багушэўскі КБА, з 1992 г. – КУП бытавога абслугоўвання насельніцтва «Прэстыж».

**95 гадоў** таму (1929) заснавана Віцебская акружная прафтэхшкола медыцынскіх сясцёр. З 1930 г. – медыцынскі тэхнікум, з 1939 г. – фельчарска-акушэрская школа, у 1941 г. – ліквідавана, у 1953 г. зноў створана пры Віцебскім медыцынскім інстытуце, з 1954 г. – самастойная навучальная ўстанова, з 1955 г. – Віцебскае медыцынскае вучылішча, у 1959 г. – ліквідавана, у 1963 г. – адноўлена.

**95 гадоў** таму (1929) пабудаваны Петрапаўлаўскі касцёл (архітэктар Л. Вітан-Дубейкаўскі, помнік драўлянага дойлідства ў в. Дрысвяты Браслаўскага раёна. У 1991 г. – рэканструяваны.

**95 гадоў** таму (1929) заснаваны калгас «Светлы шлях» у Талачынскім раёне. З 1956 г. – калгас імя Заслонава. З 2003 г. – СВК «Красноселье». З 22.12.2010 г. – ААТ «Коханава-АГРА».

**95 гадоў** таму (1929) нарадзілася Фянько Марыя Антонаўна (1929–2013), народны майстар, мастачка, прадстаўнік інсітнага мастацтва, ураджэнка в. Мярэцкія Глыбоцкага раёна.



1921 г. – выконваючым абавязкі дырэктара, а з 1927 г. дырэктарам Заалагічнага музея Расійскай акадэміі навук. З 1917 года – рэдактар «Штогодніка Заалагічнага музея».

Як вучоны-натураліст, пачынаючы з 1891 года А. А. Бялыніцкі-Біруля праводзіў навуковыя даследаванні ў Закаўказзі, вывучаў марскую фаўну на біялагічнай станцыі на Салавецкіх астравах. У 1897–1898 гадах працаваў у Камітэце для дапамогі паморам Рускай Поўначы, таксама ў Міжведамаснай камісіі па арганізацыі зубрынага запаведніка на Кубані; у 1913–1916 гадах узначальваў Дэпартамент земляробства па вывучэнні здабычы собаляў і арганізацыі собалевых запаведнікаў. У 1898 годзе ён быў узнагароджаны Малым сярэбраным медалём Расійскага геаграфічнага таварыства па аддзяленні матэматычнай і фізічнай геаграфіі.

У 1899 годзе Бялыніцкі-Біруля ўдзельнічаў у Шпіцбергенскай экспедыцыі. У 1900–1903 гадах у якасці старшага заолага – у першай рускай палярнай экспедыцыі Акадэміі навук на караблі «Заря» пад кіраўніцтвам геолага і географа Э. В. Толя па пошуках Зямлі Саннікава. У ходзе экспедыцыі Аляксей Андрэевіч Бялыніцкі-Біруля ўпершыню апісаў расліннае покрыва мыса Чалюскін. Падчас зімоўкі ля берагоў паўвострава Таймыр ён здзейсніў двухмесячны маршрут да гэтага мыса, сабраўшы багаты заалагічны матэрыял і склаўшы карту ўзбярэжжа ад месца зімоўкі да мыса Сцерлігава. За час пяцімесячнага знаходжання з экспедыцыяй на архіпелагу Новасібірскія астравы даследаваў жывёльны і раслінны свет астравоў. Асноўным вынікам назіранняў вучонага стала манаграфія «Нарысы з жыцця птушак палярнага ўзбярэжжа Сібіры».

Наогул, вобласць інтарэсаў Аляксея Андрэевіча Бялыніцкага-Бірулі даволі шырокая. Заолаг, заагеограф, палеазаолаг, энтамолаг, даследчык Арктыкі, спецыяліст па палярнай марской фаўне, ён займаўся вывучэннем геаграфічнага распаўсюджвання і сістэматыкай розных груп жывёл – ад кішачнаполасцевых да млекакормячых. Ён адзін з заснавальнікаў даследаванняў па паразіталогіі ў СССР. А. А. Бялыніцкі-Біруля працаваў не толькі з матэрыяламі, сабранымі ім самім у

# Кастрычнік



**БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ**
**АЛЯКСЕЙ АНДРЭЕВІЧ**
*160 год з дня нараджэння*
*(1864)*

**Бялыніцкі-Біруля Аляксей Андрэевіч** (1864–1937) – рускі і савецкі вучоны, заолаг, заагеограф, краязнавец, падарожнік.

Нарадзіўся Аляксей Андрэевіч Бялыніцкі-Біруля 5 лістапада 1864 года ў в. Бабкоў (Бабкова?) альбо маёнтак Бабкі (Бабіна?) Аршанскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Аршанскі раён Віцебскай вобласці), па іншых звестках у маёнтку Новае Каралёва Віцебскага павета Віцебскай губерні ў сям'і прыродазнаўца, метэаролага Андрэя Сімпліцыянавіча Бялыніцкага-Бірулі і яго жонкі Сафіі Францаўны (народжанай Лісоўскай). Бацька будучага вучонага ў сваім маёнтку Новае Каралёва ў 18 вёрстах ад г. Віцебска стварыў метэастанцыю (1864–1941). Аляксей Бялыніцкі-Біруля з дзяцінства цікавіўся батанікай, заалогіяй, збіраў гербарыі, вывучаў навакольную прыроду. У 1886 годзе ён скончыў класічную гімназію ў г. Вязьме. У 1891 годзе пасля заканчэння прыродазнаўчага аддзялення фізіка-матэматычнага факультэта Пецярбургскага ўніверсітэта, застаўся ва ўніверсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. З 1893 г. ён працаваў вучоным захавальнікам, з 1894 г. – малодшым заолагам, з 1897 г. – старшым заолагам, у 1919 г. стаў намеснікам дырэктара, з



**95 гадоў** таму (1929) заснаваны калгас «Новы шлях» у Верхнядзвінскім раёне (у 1949 г. – далучаны калгасы «Камунар» і «Кастрычнік», у 1959 г. – «Камінтэрн», у 2002 г. – «Праўда»). З 2003 г. – перайменаваны ў СПК «Шайцерава». З 2008 г. – ААТ «Шайцерава».

**95 гадоў** таму (1929) у Аршанскім раёне выяўлены С. А. Дубінскім археалагічны помнік-гарадзішча Вусце, у 1971 і 1981 гг. – абследаваны.

**90 гадоў** таму (1934) у Віцебску пабудаваны ваенны аэрадром. У 1978 г. грамадзянскі аэрапорт быў перанесены за межы горада (з 1996 г. – міжнародны). З 2000 г. – аэрапорт «Віцебск» – Віцебскі філіял дзяржаўнага прадпрыемства паветранага руху «Белаэранавігацыя».

**90 гадоў** таму (1934) нафтасклад у г. Віцебску перайменаваны ў нафтабазу.

**90 гадоў** таму (1934) у Віцебску прайшла першая алімпіяда дзіцячай самадзейнасці.

**90 гадоў** таму (1934) у Дрысе (Верхнядзвінску) пабудавана электрастанцыя.

**90 гадоў** таму (1934) нарадзіўся Вальшонак Захарый Сямёнавіч, прафесар Расійскай акадэміі ваенных навук, працаваў у навукова-даследчым цэнтры Інстытута Паветрана-касмічнай абароны, палкоўнік. Ураджэнец г. Віцебска.

**90 гадоў** таму (1934) быў выяўлены Гарадоцкі курганны могільнік – археалагічны помнік на паўднёва-заходняй ускраіне горада.

**90 гадоў** таму (1934) нарадзілася Краско Антаніна Аляксееўна, вучоны ў галіне льнаводства. Кандыдат сельскагаспадарчых навук (1977). З 1967 г. – малодшы навуковы супрацоўнік у Віцебскай абласной сельскагаспадарчай вопытнай станцыі (зараз Віцебскі занальны інстытут сельскай гаспадаркі НАН Беларусі). Ураджэнка Варанкоўскага раёна Бранскай вобласці.

**90 гадоў** таму (1934) у Оршы заснавана прадпрыемства «Элуіз» грамадскага аб’яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» як майстэрні таварыства сляпых. З 1991 г. – Аршанскае навучальнае вытворчае прадпрыемства, з 2000 г. – УП з сучаснай назвай, з 2004 г. – ПУП з сучасным статусам.

**85 гадоў** таму (1939) адбылося ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

**85 гадоў** таму (1939) была створана Вілейская вобласць (1939–1944 гг.) – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, у якую ўваходзіла частка тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці.

**85 гадоў** таму (1939) утвораны Дзісненскі павет, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка (1922–1939) у складзе Польшчы.

**85 гадоў** таму (1939) пабудаваны з цэглы і бутавага каменю Ідоўцкі касцёл Божай Маці Шкаплернай у в. Ідоўта (Ідолта) Мёрскага раёна.

**85 гадоў** таму (1939) у Віцебску створаны ДЭУ для абслугоўвання дарог абласнога значэння. Зараз – прадпрыемства па праектаванні, будаўніцтве, утрыманні і рамонце мясцовых аўтамабільных дарог агульнага карыстання «Віцебскаблдарбуд».

**85 гадоў** таму (1939) у Оршы заснаваны малочны завод. У 1958, 1976–1978 гг. на прадпрыемстве праведзены рэканструкцыі. З 1996 г. – ААТ «Аршанскі малочны камбінат».

**85 гадоў** таму (1939) у Пастаўскім раёне на базе памешчыцкай карпавай гаспадаркі (плошча 114 га) на рацэ Плісаўка заснавана рыбная гаспадарка «Навінкі».

**85 гадоў** таму (1939) заснаваны Пастаўскі малочны завод. З 1949 г. – галаўны маслазавод Маладзечанскага абласнога трэста «Маслапрам». У 1963 г. уведзены ў эксплуатацыю новы завод сухога абястлушчанага малака, у 1988–1992 гг. – вытворчы ўчастак Глыбоцкага малочнакансервавага камбіната. З 1992 г. – ААТ з сучаснай назвай.



3. **Короткая** Валентина Прокофьевна : [некролог] // Наша Талачыншчына. – 2012. – 25 сент. – С. 8.

4. **Короткая** Валентина Прокофьевна // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 517–518.

5. **Короткая** Валентина Прокофьевна // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 257.

6. **Короткая** Валентина Прокофьевна // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биографический справочник / сост. И. Н. Кулан, В. И. Козак, Е. Е. Соколов ; под общ. ред. А. Н. Новикова. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2014. – С. 128.

7. **Мясников, А.** Продолжение подвига / А. Мясников // Знаменоносцы трудовой славы / сост.: Г. С. Гужва, В. Г. Скопа, Е. Я. Рыклин. – Минск : Беларусь, 1984. – С. 167–171.

8. **Нікалаеў, В.** Гераіня «паўночнага шоўку» / В. Нікалаеў // Ленінскі прызыў (Орша). – 1962. – 17 лют. – С. 1.

9. **Мяснікоў, А. Ф.** Працоўны подзвіг / А. Ф. Мяснікоў // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.] ; мастак А. М. Хількевіч. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1988. – С. 604–605.

10. **Петраков. И.** Наша озерецкая / И. Петраков // Сельская жизнь. – 1962. – 19 марта.

11. **Поздравляем**! // Наша Талачыншчына. – 2009. – 5 верас. – С. 1.

12. **Шнейдер, А. А.** Короткая Валентина Прокофьевна / А. Шнейдер. // Моя Толочинщина: страницы истории / А. Шнейдер. – 2-е изд, с изм. – Минск : Бизнесофсет, 2006. – С. 121.

АН БССР і аграномамі гаспадаркі В. П. Кароткая змагла павялічыць працэнт усходжасці новага, больш перспектыўнага гатунку лёну, і атрымаць 6 цэнтнераў насення і 20 цэнтнераў валакна з гектара. Калгас за выручаныя ад продажу лёну-даўгунцу грошы набыў тэхніку (5 трактараў, 3 камбайны, 7 аўтамашын), пабудаваў шэраг вытворчых памяшканняў (кароўнік, млын, гараж, кармацэх, лазню). Калі звяно В. П. Кароткай атрымала самы высокі ўраджай у рэспубліцы, за вопытам у калгас паехалі шматлікія дэлегацыі з РСФСР, Літвы, Латвіі, Эстоніі.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 18 студзеня 1958 года за поспехі ў павелічэнні вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў і ўкараненне ў вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыту Валянціне Пракопаўне Кароткай было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Звеннявая стала ў вобласці прызнаным майстрам высокіх ураджаяў, праводзіла вялікую працу па прапагандзе і ўкараненні ў сельгасвытворчасць перадавога вопыту. У 1958–1966 гг. была абрана дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР (Аршанская выбарчая акруга). З 1959 года – член Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

У 2010 годзе В. П. Кароткай прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Талачынскага раёна». Апошнія гады жыла ў дачкі ў г. Мінску. Памерла Валянціна Пракопаўна Кароткая 21 студзеня 2012 года.

Узнагароджана залатым медалём «Серп і Молат» Героя Сацыялістычнай Працы, ордэнам Леніна, медалямі ВДНГ СССР.

***Біяграфія прадстаўлена краязнаўцам Канстанцінам Гайдуковым***

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Королев, Г.** Валентина Короткая / Г. Королев // Колхозная правда. – 1962. – 3 марта.

2. **Кароткая** Валянціна Пракопаўна // Беларуская Савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1972. – Т. 5 : Зуйкі–Кішы. – С. 456.



**85 гадоў** таму (1939) адбыўся першы выпуск Гарадоцкай СШ № 1.

**85 гадоў** таму (1939) заснавана СШ № 1 у г. Паставы. Зараз – ДУА «Сярэдняя агульнаадукацыйная школа №1 г. Паставы».

**85 гадоў** таму (1939) у Браславе заснаваны Дом сацыялістычнай культуры. У1944 г. перайменаваны ў раённы Дом культуры, з 1990 г. – гарадскі Дом культуры, з 1999 г. – Браслаўскі раённы Дом культуры.

**85 гадоў** таму (1939) заснавана Браслаўская цэнтральная бібліятэка.

**85 гадоў** таму (1939) заснавана Відзаўская гарпасялковая бібліятэка. З 1977 г. у складзе цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Браслаўскага раёна.

**85 гадоў** таму (1939) адкрыта Пастаўская цэнтральная раённая бібліятэка. З 1978 г. узначальвае сетку бібліятэк раёна і набыла статус цэнтральнай раённай.

**85 гадоў** таму (1939) заснавана Шаркаўшчынская цэнтральная раённая бібліятэка як публічная. У 1944 г. пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў зноў створана як раённая, у 1978 г. набыла сучасны статус, з 1983 г. – у будынку раённага Дома культуры.

**85 гадоў** таму (1939) нарадзілася Мацецкая Вера Уладзіміраўна, полацкі майстар народнай творчасці па вязанні на прутках і кручком, ураджэнка в. Забалацце Мёрскага раёна.

**80 гадоў** таму (1944) была ліквідавана Вілейская вобласць (1939–1944 гг.) – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, у якую ўваходзіла частка тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці.

**80 гадоў** таму (1944) у Віцебску створаны зямельны аддзел. З 1947 г. – упраўленне сельскай гаспадаркі. З 1953 г. – упраўленне сельскай гаспадаркі і нарыхтовак. З 1954 г. – Віцебскае абласное ўпраўленне сельскай гаспадаркі. З 1962 г. – упраўленне вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў. З 1965 г. – упраўленне сельскай гаспадаркі

выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных. З 1997 г. – камітэт па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

**80 гадоў** таму (1944) у Віцебску заснавана абласная кінарамонтная майстэрня. З 1955 г. – «Аблкультрамснаб», з 1962 г. – абласны рамонтна-прамысловы камбінат, з 1968 г. – рамонтна-вытворчы камбінат, з 1988 г. – вытворчы камбінат ВА «Белпрамкультура». Зараз – ААТ «Віцебск-Белпрамкультура», прадпрыемства па вытворчасці мэблі для офісаў і гандлю.

**80 гадоў** таму (1944) у Полацку створаны аблрэмбудтрэст. У 2001–2021 гг. – аб'яднанне «Полацксельбуд», камунальнае ўнітарнае вытворчае праектна-будаўнічае прадпрыемства.

**80 гадоў** таму (1944) у г. Глыбокае на месцы бойні заснаваны мясакамбінат. У 1949 г. – аб'яднаны з міжраённай нарыхтоўчай канторай у Глыбоцкі птушкакамбінат. З 1964 г. – Глыбоцкі мясакамбінат. З 1997 г. – ААТ.

**80 гадоў** таму (1944) у г. Докшыцы створана машынна-трактарная станцыя. З 2003 г. – ААТ «Докшыцкі райаграсэрвіс».

**80 гадоў** таму (1944) адкрыта Пастаўскае педагагічнае вучылішча. Існавала да 18.08.1955 г.

**80 гадоў** таму (1944) адкрыта школа фабрычна-завадскога навучання № 14 у г. п. Сураж (праз месяц пераведзена ў Віцебск). З 1946 года – рамесніцкае вучылішча № 20 тэкстыльшчыкаў, з 1949 – школа фабрычна-завадскога навучання № 92, з 1954 – Віцебская школа фабрычна-завадскога навучання № 3 будаўнікоў, з 1955 – Віцебская будаўнічая школа № 3, з 1957 – Віцебскае будаўнічае вучылішча № 3, з 1963 – Віцебскае гарадское прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 59 будаўнікоў, з 1979 – Віцебскае сярэдняе гарадское прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 59 будаўнікоў, з 1985 – Віцебскае сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 59



гаспадаркі ў родных мясцінах. Працоўны шлях пачала паляводам калгаса «Чырвоны сцяг» Талачынскага раёна. У 1950–1951 гадах працавала падвязчыцай ільновалакна на Талачынскім ільнозаводзе.

З 1951 па 1979 год працягвала працу ў калгасе «XVIII партз'езд». У студзені 1953 года Валянціну Пракопаўну Кароткую прызначалі звеннявой ільнаводчага звяна. Прызначалі ў той час, калі ў раёне былі створаны першыя спецыялізаваныя льнаводчыя брыгады, і пачалася па-сапраўднаму актыўная работа па ўдасканальванні працэсаў вырошчвання лёну. Звеннявая і яе невялікі калектыў да сваёй першай сяўбы падрыхтаваўся грунтоўна. Былі назапашаны ўгнаенні, апрацавана глеба. І першая вялікая працоўная перамога звяна В. П. Кароткай прыйшла. Сорт лёну «Светач» даў нябачаны да таго часу ў гаспадарцы ўраджай – па 7 цэнтнераў семя і 8 цэнтнераў валакна з гектара. Звяно заваявала першынства ў калгасе па ўраджайнасці і даходнасці гэтай сельскагаспадарчай культуры. А звеннявая В. П. Кароткая праз год стала ўдзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставы ў г. Маскве (з 1959 г. – Выставы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР). З гэтага часу Валянціна Пракопаўна пастаянна ўдзельнічала ў яе рабоце. Неаднаразова ўзнагароджвалася медалямі і дыпломамі Галоўнага выставачнага камітэта.

У пачатку 1955 года В. П. Кароткая, адна з лепшых звеннявых раёна, стала ўдзельніцай рэспубліканскай нарады перадавікоў сельскай гаспадаркі, на якой атрымала магчымасць расказаць пра свой вопыт работы па вырошчвання лёну і пазнаёміцца з вопытам работы іншых льнаводаў. Падчас нарады адбылося яе знаёмства з навуковым супрацоўнікам АН БССР М. С. Пекер, якая прапанавала талачынцам для пасеву новы эксперыментальны гатунак лёну Л1120. І ўжо вясной новы гатунак быў пасеяны. Ён павінен быў даць яшчэ лепшы ўраджай, чым «Светач».

У 1957 годзе звяно В. П. Кароткай, ужываючы навукова-абгрунтаваныя правілы агратэхнікі па сяўбе, вырошчванні і зборы лёну, дасягнула таго, што лён вырас да 1,5 метра вышынёй. Сумесна з вучонымі

І. Б. Каросцік, Р. І. Маслоўскі, А. Л. Петрашкевіч ; уклад. С. С. Чарняўская ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Вышэйшая школа, 1999. – С. 201.

21. **Образцова, В.** Сквозь огненные вихри / В. Обрацова // Транспортный веснік. – 1999. – 19 июня. – С. 1–2.

22. **Резкина, Т. Ю.** В жизни всегда есть место подвигу... / Т. Ю. Резкина, А. С. Кучиц // Полацкі веснік. – 2020. – 19 чэрв. – С. 24.

# Верасень



## КАРОТКАЯ ВАЛЯНЦІНА ПРАКОПАЎНА

*100 год з дня нараджэння*

*(1924)*

**Кароткая Валянціна Пракопаўна** (1924–2012) – ільнавод, Герой Сацыялістычнай Працы.

Нарадзілася 5 верасня 1924 года ў в. Вугалеўшчына Талачынскага раёна Аршанскай акругі (цяпер Азярэцкі сельскі савет Талачынскага раёна) у сялянскай сям’і Пракопа Фёдаравіча і Фядосіі Андрэеўны Асіповічаў. Атрымала няпоўную сярэднюю адукацыю. У гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася на акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі. Рана выйшла замуж за аднавяскоўца Мікалая Сцяпанавіча Кароткага. У 1943 годзе нарадзіла сына Міхаіла. Пасля вызвалення раёна летам 1944 года прымала ўдзел у аднаўленні сельскай



будаўнікоў». У 2003–2014 гг. – УА «Віцебскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 2 будаўнікоў». У 2014 г. далучаны да Віцебскага дзяржаўнага тэхнічнага каледжа.

**80 гадоў** таму (1944) у Паставах заснавана СШ № 2. Зараз – ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Паставы імя Надзеі Міхайлаўны Асяненкі».

**80 гадоў** таму (1944) у Оршы заснавана Аршанская цэнтральная раённая бібліятэка, якая размяшчалася ў будынку рэдакцыі газеты «Ленінскі прызыў». У 1978–2013 гг. – цэнтральная бібліятэка ЦБС Аршанскага раёна. З 2008 г. знаходзіцца ў в. Бабінічы. З 2013 г. у сувязі з аб’яднанем раённай і гарадской ЦБС – Бабініцкая сельская бібліятэка-філіял № 54.

**80 гадоў** таму (1944) у г. Дрысе (зараз – г. Верхнядзвінск) была заснавана раённая бібліятэка. У 1977 г. было прысвоена імя беларускага пісьменніка-земляка Т. Хадкевіча, у 1979 г. – набыла статус цэнтральнай раённай бібліятэкі. Зараз – Верхнядзвінская цэнтральная раённая бібліятэка імя Т. Хадкевіча.

**80 гадоў** таму (1944) створаны Браслаўскі народны тэатр пры раённым Доме культуры як тэатральны гурток. У 1959 г. прысвоена званне «Народны аматарскі тэатр» і сучасная назва.

**80 гадоў** таму (1944) адкрыты Шаркаўшчынскі раённы Дом культуры. З 1982 г. знаходзіцца ў спецыяльна пабудаваным будынку.

**80 гадоў** таму (1944) створаны Віцебскі філіял Саюза мастакоў Беларусі.

**80 гадоў** таму (1944) нарадзілася Якушэнка Галіна Віктараўна, мастачка, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, жыхарка в. Гуркі Гарадоцкага раёна, ураджэнка г. Кіева (Украіна).

**80 гадоў** таму (1944) нарадзілася Крупская Дзіна Іванаўна, народны майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з г. п. Ушачы. Працуе ў тэхніцы выцінанкі.

**80 гадоў** таму (1944) нарадзілася Швед Людміла Мікалаеўна, член народнага клуба аматараў фларыстыкі «Анюта» і клуба аматараў рукадзелля «Натхненне» Цэнтра народных рамёстваў і мастацтваў «Дзвіна» г. Віцебска. Ураджэнка г. Хабараўск на Далёкім Усходзе (Расія).

**75 гадоў** таму (1949) у Віцебску заснаваны вучэбна-вытворчыя майстэрні. З 1999 г. перайменаваны ў «Галант» – прадпрыемства па вытворчасці швейных вырабаў, тэкстыльнай галантарэі, мэблі, радыётэхнічнай вытворчасці ГА «Беларускае грамадства глухіх». З 2004 г. – ПУП.

**75 гадоў** таму (1949) адкрыта школа механізацыі сельскай гаспадаркі ў в. Боркавічы Верхнядзвінскага раёна. З 1953 г. – Боркавіцкае СПТВ № 33 механізацыі сельскай гаспадаркі. З 1984 г. – СПТВ-170. З 2001 г. – Боркавіцкае ДПТВ-170. З 2005 года перайменаваны ва УА «Боркавіцкі дзяржаўны прафесійны ліцэй сельскагаспадарчай вытворчасці».

**75 гадоў** таму (1949) заснаваны Докшыцкі тэатр раённага Дома культуры. З 1982 г. мае званне «народны».

**75 гадоў** таму (1949) нарадзілася Кушнярова Вера Паўлаўна, мастачка (жывапіс), майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (вышыўка). Жыхарка в. Дабрамыслі Лёзненскага раёна, ураджэнка г. Уладзімір (Расія).

**75 гадоў** таму (1949) нарадзіўся Плыгаўка Іван Парфір'евіч, мастак, спецыялізуецца на разьбе па дрэве, ураджэнец в. Лапліна Докшыцкага раёна.

**70 гадоў** таму (1954) пачала працаваць Віцебская ЦЭЦ.

**70 гадоў** таму (1954) пачалося будаўніцтва Лепельскай гідраэлектрастанцыі. Уступіла ў строй у 1956 г.



Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 94.

12. **Минин** Александр Александрович // Твои сыновья, Беларусь! Герои Советского Союза : биографический справочник / ред.: Ю. В. Баженов [и др.] ; худ. ред. П. В. Баранов. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2015. – С. 95–96.

13. **Минин** Александр Александрович // Энциклопедия Победы : Беларусь – Москва / сост.: А. И. Докучаев, Б. Д. Долготович, Л. В. Языкович ; фотохудож.: П. В. Кострома, А. П. Дрибас ; авт. ст.: Е. И. Барановский [и др.]. – Минск ; Москва. : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі ; Армпресс, 2009. – С. 567.

14. **Мінін, А. А.** Той бой мне не забыць / А. А. Мінін ; гутарыў У. Ліхачоў // Сцяг камунізму (Полацк). – 1984. – 3 студз. – С. 2.

15. **Мінін, А. А.** У жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу / А. А. Мінін // Сцяг камунізму (Полацк). – 1980. – 16 студз. – С. 2.

16. **Мінін** Аляксандр Аляксандравіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2000. – Т. 10 : Малайзія–Мугаджары. – С. 386.

17. **Мінін** Аляксандр Аляксандравіч // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл імя П. Броўкі, 1981. – Т. 5 : біяграфічны даведнік. – С. 423.

18. **Мінін** Аляксандр Аляксандравіч // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси / склад.: В. Ц. Осіпаў [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Праляскоўскі, Л. У. Языковіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – С. 647.

19. **Мінін** Аляксандр Аляксандравіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; мастак Э. Э. Жакевіч – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1999. – Т. 5 : М–Пуд. – С. 145.

20. **Мінін** Аляксандр Аляксандравіч // Памяць: Полацкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.:

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Вальковский, И.** В списке «Почётных граждан Могилёва» – пополнение / И. Вальковский // Магілёўскія ведамасці. – 2001. – 22 мая. – С. 1.

2. **Лихачев, В.** Разведчик / В. Лихачев. – Химик (Новополоцк). – 1979. – 13 сент. – С. 3.

3. **Минин** Александр Александрович // Герои Советского Союза : краткий биографический словарь : [в 2 т.] / редкол: И. Н. Шкадов (председатель) [и др.]. – Москва : Воениздат, 1988. – Т. 2 : Любов–Ящук. – С. 82.

4. **Минин** Александр Александрович // Навечно в сердце народном : [справочник / гл. ред. И. П. Шамякин]. – 3-е изд., доп. и испр. – Минск : БелСЭ имени П. Бровки, 1984. – С. 352.

5. **Минин** Александр Александрович // Неман. –1967. – № 6. – С. 95.

6. **Минин** Александр Александрович // Почетные граждане белорусских городов : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск : Беларусь, 2008. – С. 328.

7. **Минин** Александр Александрович // Профессиональные союзы Беларуси : энциклопедия : [в 2 т.] / [редколл.: Л. П. Козик (пред.) и др.] ; под общ. ред. Л. П. Козика. – Минск : Федерация профсоюзов Беларуси, 2011. – Т. 1 : А–М. – С. 800–801.

8. **Минин** Александр Александрович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 127–128.

9. **Минин** Александр Александрович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки, 2021. – Т. 6 : Могилевская область : в 2 кн. – Кн. 2 : Л–Я. – С. 60.

10. **Минин** Александр Александрович // Республика Беларусь : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2005. – Т. 4 : Картография–Миноговые. – С. 753–754.

11. **Минин** Александр Александрович // Слава и гордость земли



**70 гадоў** таму (1954) у Оршы адкрыты кінатэатр «Перамога».

**70 гадоў** таму (1954) у Віцебску ўпершыню з'явілася легкавое таксі.

**70 гадоў** таму (1954) заснаваны Бягомльскі гарадскі Дом культуры Докшыцкага раёна.

**70 гадоў** таму (1954) заснаваны Полацкі гарадскі Палац культуры як Дом культуры, з 1994 г. – сучасная назва.

**70 гадоў** таму (1954) у Віцебску створаны ансамбль танца «Лявоніха» пры гарадскім Доме культуры (з 2007 г. – Цэнтр культуры «Віцебск»). У 1971 г. прысвоена званне «народны», у 2007 г. – «Заслужаны аматарскі калектыў».

**70 гадоў** таму (1954) нарадзіўся Абраменка Мікалай Адамавіч, майстар разьбы па дрэве, ураджэнец г. Полацка.

**70 гадоў** таму (1954) нарадзіўся Гільніч Міхаіл Паўлавіч, майстар па лозапляценні, удзельнік наваполацкага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў «Прамень», ураджэнец г. Докшыцы.

**70 гадоў** таму (1954) нарадзіўся Палаценка Уладзімір Мікалаевіч, вучоны ў галіне льнаводства. Працаваў намеснікам старшыні калгаса імя Кірава і старшынёй калгаса «Ленінская іскра» Аршанскага раёна. З 2002 г. – навуковы супрацоўнік лабараторыі якасці льнапрадукцыі РУП «Інстытут ільну», ураджэнец г. Крычаў Магілёўскай вобласці.

**70 гадоў** таму (1954) нарадзіўся Пасюцін Анатоль Яўгенавіч. Займаецца разьбой па дрэве, такарскай справай і жывапісам. Жыхар в. Ламіншчына Талачынскага раёна, ураджэнец в. Славені Талачынскага раёна.

**70 гадоў** таму (1954) нарадзіўся Чэрнін Міхаіл Давыдавіч, віцебскі народны майстар па лозапляценні, ураджэнец г. Арэнбург (Расія).

**70 гадоў** таму (1954) нарадзілася Чэрніна Наталля Аляксандраўна, віцебскі майстар па лозапляценні.

**65 гадоў** таму (1959) створана Віцебскае абласное аддзяленне Саюза журналістаў БССР. Зараз – Віцебская абласная арганізацыя Беларускага саюза журналістаў.

**65 гадоў** таму (1959) у Віцебску заснаваны завод сантэхдэталяў № 2, 1964 г. – завод санітарна-тэхнічных загатовак, з 1997 г. пераўтвораны ў філіял ААТ «Трэст Белсантэхмантаж № 1» – Віцебскі завод сантэхзагатовак.

**65 гадоў** таму (1959) у Полацку заснаваны ААТ «Нафтазаводмантаж».

**65 гадоў** таму (1959) у г. Наваполацку на базе структурнага падраздзялення завода жалезабетонных вырабаў будаўнічага трэста № 16 «Нафтабуд» створана мнагапрофільнае прамысловае прадпрыемства «Наваполацкжалезабетон». З 1994 г. – адкрытае акцыянернае таварыства. У 2013 г. у сувязі з рэарганізацыяй дзейнасць прадпрыемсва спынена. З 2014 г. – філіял «Наваполацкжалезабетон» ААТ «Крычаўцэментнашыфер».

**65 гадоў** таму (1959) заснаваны завод «Зааветінструмент» у в. Бігосава Верхнядзвінскага раёна. З 1993 г. – ААТ «Інвет».

**65 гадоў** таму (1959) у Лепельскім раёне было знойдзена радовішча пясочна-гравійнага матэрыялу «Бароўка».

**65 гадоў** таму (1959) у г. п. Варапаева Пастаўскага раёна адкрыта музычная школа.

**65 гадоў** таму (1959) быў адкрыты Бешанковіцкі раённы Дом культуры ў спецыяльна пабудаваным будынку.

**65 гадоў** таму (1959) заснаваны клуб прафсаюзнага камітэта студэнтаў Віцебскага ветэрынарнага інстытута (з 1994 г. – Віцебская акадэмія ветэрынарнай медыцыны). Сучасная назва – Дом культуры УА «Віцебская ордэна "Знак Пашаны" дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны».



званне было прысвоена.

У далейшым удзельнічаючы ў наступальнай аперацыі на тэрыторыі Усходняй Прусіі 22 кастрычніка 1944 года А. А. Мінін быў паранены асколкам снарада ў нагу. Пасля лячэння ў сакавіку 1945 года накіраваны ў нестраявую частку ў Заходнюю Украіну. Высокую ўзнагароду малодшы лейтэнант А. А. Мінін атрымаў з рук Старшыні Вярхоўнага Савета СССР М. І. Калініна ў маскоўскім Крамлі 11 жніўня 1945 года.

Пасля дэмабілізацыі ў лістападзе 1945 года Аляксандр Аляксандравіч быў запрошаны на вучобу ў Мінскую партыйную школу пры ЦК КП Беларусі. Пасля заканчэння школы, з 1948 года, жыў і працаваў на партыйнай і прафсаюзнай рабоце ў г. Магілёве. У 1948 годзе прызначаны інструктарам Магілёўскага гаркама камсамола. У снежні гэтага ж года камандзіраваны на чыгунку – памочнікам начальніка палітаддзела камсамола. З 1962 г. А. А. Мінін – старшыня Магілёўскага абкама прафсаюза працаўнікоў сувязі, працоўных аўтамабільнага транспарту і шашэйных дарог (з 1968 – працоўных аўтамабільнага транспарту і шашэйных дарог). У 1963 годзе скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС. У 1977 годзе абраны старшынёй прафкама ПРБА (праектна-рамонтна-будаўнічага аб’яднання) «Магілёваблдарбуд». У 1984 годзе А. А. Мінін пайшоў на заслужаны адпачынак.

Памёр Аляксандр Аляксандравіч Мінін 6 жніўня 2001 года (па іншых звестках у 2002 годзе). Пахаваны на Машэкаўскіх могілках горада Магілёва.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны І ступені, «За службу Радзіме» ІІІ ступені, медалямі. У 2001 г. за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Магілёва».

прарвала блакаду праціўніка і злучылася з часткамі Савецкай арміі. А. А. Мінін быў залічаны радавым байцом 1126-га стралковага палка 334-й стралковай дывізіі, а потым пераведзены ва ўзвод разведкі. Ваяваў на 1-м Прыбалтыйскім, а потым на 3-м Беларускім франтах. Удзельнічаў у Беларускай стратэгічнай аперацыі «Баграціён»: у баях на Віцебскім кірунку (у Гарадоцкай наступальнай аперацыі, у прарыве абароны ў раёне г. Оршы), Мінскай, Каўнаскай і Вільнюскай наступальных аперацыях. Быў тройчы паранены.

За час знаходжання на фронце і наступлення нашых войскаў на тэрыторыі Беларусі і Літвы аддзяленнем разведкі пад камандаваннем А. А. Мініна было ўзята ў палон 29 жывых «языкоў» з умацаванай абароны, з іх 13 афіцэраў з глыбокага тылу праціўніка. У 1944 годзе А. А. Мінін быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

Асабліва вылучыўся Аляксандр Аляксандравіч Мінін пры фарсіраванні ракі Нёман падчас Вільнюскай наступальнай аперацыі. З 26 чэрвеня 1944 года ў складзе галаўнога дазору праследаваў ворага. Дзеля атрымання разведвальных дадзеных ён у ноч на 15 ліпеня на поўнач ад в. Мяркіне Варэнскага раёна Літвы каля шашы Гродна–Друскінінкай зайшоў у тыл праціўніка, зрабіў разведку яго сіл на левым (заходнім) беразе Нёмана, выявіў агнявыя кропкі, знайшоў месца для пераправы, першым у палку з 2 разведчыкамі фарсіраваў Нёман, а потым з групай гвардыі старшыны А. А. Снапляна, удзельнічаў у знішчэнні абарончага рубяжа на варожай тэрыторыі (падарваў 6 кулямётных гнёздаў і танк праціўніка). Такім чынам, была створана брэш у нямецкай абароне і ўмовы для пераправы палка. Рака Нёман была фарсіравана са значна меншымі стратамі, і адразу было пачата наступленне ўглыб варожых войскаў.

Улічваючы заслугі перад Радзімай, камандаванне палка і дывізіі 31 ліпеня 1944 года прадставіла А. А. Мініна да вышэйшай дзяржаўнай узнагароды – звання Героя Савецкага Саюза. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 года яму гэта ганаровае



**65 гадоў** таму (1959) створаны Віцебскі народны хор народнай песні пры Доме культуры чыгуначнікаў (з 2006 г. – Культурна-спартыўны цэнтр Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі). У 2006 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**65 гадоў** таму (1959) адкрыты Ушацкі раённы Дом культуры.

**65 гадоў** таму (1959) адкрыты Лёзненскі раённы Дом культуры.

**65 гадоў** таму (1959) адкрыты Лепельскі раённы Дом культуры.

**65 гадоў** таму (1959) нарадзілася Сяляева Святлана Леанідаўна, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва па вязанні на прутках і кручком. З 2007 г. – член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці, ураджэнка г. Віцебска.

**65 гадоў** таму (1959) нарадзіўся Шункевіч Сяргей Васілевіч, ганчар Гарадоцкага клуба народных майстроў і мастакоў «Вытокі». Ураджэнец п. Керамічны Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці.

**60 гадоў** таму (1964) у Віцебску заснаваны ўчастак рэспубліканскага камбіната «Белгандальмантаж». З 1974 г. – філіял № 1 рэспубліканскага вытворчага комплексу «Белгандальтэхніка», з 1988 г. – камбінат рэспубліканскага ВА «Белгандальпрагрэс». З 2000 г. – прадпрыемства па аказанні паслуг для забеспячэння бесперабойнай работы халадзільнага, тэхналагічнага абсталявання РВУП «Віцебскаргтэхніка».

**60 гадоў** таму (1964) у Чашніцкім раёне пачалося будаўніцтва Лукомскай ДРЭС – самай вялікай цеплавой электрастанцыі беларускай энергетычнай сістэмы, якая выпрацоўвае каля 40 % усёй электраэнергіі ў краіне. З 1989 г. – філіял РУП «Віцебскэнерга».

**60 гадоў** таму (1964) створаны горад Новалукомль на беразе возера Лукомскае ў сувязі з будаўніцтвам Лукомскай ДРЭС на месцы рабочага пасёлка Піянерны Бешанковіцкага раёна. З 1965 г. – у Чашніцкім раёне.

**60 гадоў** таму (1964) арганізаваны Ушацкі раён электрасетак.

**60 гадоў** таму (1964) заснаваны Міёрскі мясакамбінат, з 1996 г. – ААТ з сучаснай назвай.

**60 гадоў** таму (1964) у Лепелі адкрыўся філіял Аршанскага медвучылішча. Закрыты ў 1969 г.

**60 гадоў** таму (1964) у Віцебску пры Доме культуры чыгуначнікаў створаны ансамбль народнага танца. З 2000 г. – Віцебскі дзіцячы ансамбль танца «Ладачкі». У 2005 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**60 гадоў** таму (1964) створаны цымбальны аркестр пры абласным Палацы піянераў і школьнікаў (з 1992 г. – абласное аб’яднанне па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі). У 1983 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**60 гадоў** таму (1964) нарадзілася Арэхва Жанна Сяргееўна, народны майстар па лозапляценні, ураджэнка г. Глыбокае.

**60 гадоў** таму (1964) нарадзілася Бараўцова Алена Міхайлаўна, кераміст і майстар па мастацкім роспісе, член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці, ураджэнка г. Масквы.

**60 гадоў** таму (1964) нарадзіўся Грунтоў Сяргей Генадзевіч, народны майстар па лозапляценні, жыхар в. Ходцы Сенненскага раёна, ураджэнец в. Рамшына Лёзненскага раёна.

**60 гадоў** таму (1964) нарадзіўся Гушча Пётр Яўгенавіч, майстар разьбы па дрэве, ураджэнец г. Гарадок.

**60 гадоў** таму (1964) нарадзіўся Зінкевіч Валерый Анатолевіч, майстар разьбы па дрэве, ганчар Браслаўскага клуба народных майстроў і мастакоў «Ля возера», ураджэнец г. Салдус (Латвія).

**60 гадоў** таму (1964) нарадзіўся Шмак Андрэй Іванавіч, беларускі вучоны ў галіне анкалогіі, доктар медыцынскіх навук (2006), ураджэнец г. Віцебска.



# Жнівень



**МІНІН**
**АЛЯКСАНДР АЛЯКСАНДРАВІЧ**
*100 год з дня нараджэння*
*(1924)*

**Мінін Аляксандр Аляксандравіч** (1924–2001) – Герой Савецкага Саюза, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, прафсаюзны дзеяч.

Нарадзіўся 28 жніўня 1924 года ў в. Арлея Полацкага раёна ў сялянскай сям’і. У 1940 годзе, пасля заканчэння Трудаўскай сямігадовай школы, паступіў у Полацкі будаўнічы тэхнікум. Працаваў у калгасе і на Маласітнянскім участку Полацкага леспрамгаса. Вучоба ў тэхнікуме і мірная праца былі перапынены Вялікай Айчыннай вайной. Мястэчка Труды было акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі 17 ліпеня 1941 года. З пачаткам барацьбы з акупантамі Аляксандр Мінін падтрымліваў сувязь з партызанамі. А ў маі 1942 года ўступіў у партызанскі атрад пад камандаваннем А. Я. Марчанкі (з ліпеня 1942 года 3-я Беларуская партызанская брыгада). Удзельнічаў у разгроме варожых гарнізонаў, захопе жывых «языкоў», у аперацыях па знішчэнні аўтамабільнага і чыгуначнага транспарту, ваенных складоў і мастоў. У красавіку 1943 года быў узнагароджаны медалём «Партызану Айчыннай вайны» І ступені.

У лістападзе 1943 года брыгада пасля ўпорных і жорсткіх баёў

Лепелі / А. Карлюкевіч // Святло Айчыны : сустрэчы з землякамі / А. Карлюкевіч. – Мінск : Звязда, 2021. – С. 390–392.

5. **Крымов, В. В.** Мейлах Борис Соломонович / В. В. Крымов // Краткая литературная энциклопедия / гл. ред. А. А. Сурков. – Москва : Советская энциклопедия, 1967. – Т. 4 : Лакшин–Мураново. – С. 734.

6. **Макогоненко, Г.** Пушкин-художник и его время // Вопросы литературы. – 1959. – № 11. – С. 144–154. – Рец. на книгу: Мейлах, Б. Пушкин и его эпоха / Б. С. Мейлах. – Москва : Гослитиздат, 1958. – 698 с.

7. **Мейлах** Борис Соломонович // Большая Советская Энциклопедия : в 30 т. / гл. ред. А. М. Прохоров. – 3-е изд. – Москва : Советская энциклопедия, 1974. – [Т.] 16 : Мёзия–Моршанск. – С. 27.

8. **Михайлов, О.** Подвиг Льва Толстого / О. Михайлов // Знамя. – 1963. – № 3. – С. 222–224. – Рец. на книгу: Мейлах, Б. Уход и смерть Льва Толстого / Б. С. Мейлах. – Москва : Ленинград : Гослитиздат, 1960. – 406 с.

9. **Русецкий, А. В.** Известный советский пушкинист Борис Мейлах. А он-то из Лепеля / А. В. Русецкий, Ю. А. Русецкий // Віцебскі край / рэдкал.: Т. М. Адамян [і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2016. – Т. 4 : матэрыялы IV Міжнар. навук.-практ. канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці, 22 лістап. 2018 г., Віцебск. – С. 297–305.



**55 гадоў** таму (1969) у Віцебску пачаў працаваць Завод керамічных дрэнажных труб. Уваходзіў у склад Віцебскага камбіната будаўнічых матэрыялаў (цяпер ААТ «Кераміка»).

**55 гадоў** таму (1969) у Віцебску заснаваны індустрыяльна-педагагічны тэхнікум. З 1996 г. – індустрыяльна-педагагічны каледж, з 2001 – УА «Віцебскі дзяржаўны індустрыяльна-педагагічны каледж», з 2015 – Індустрыяльна-педагагічны каледж УА «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт».

**55 гадоў** таму (1969) археолаг Г. В. Штыхаў выявіў археалагічны помнік Захарнічы – курганны могільнік полацкіх крывічоў каля в. Захарнічы Полацкага раёна.

**55 гадоў** таму (1969) у Віцебску адкрыты помнік М. П. Шмырову.

**55 гадоў** таму (1969) выйшла ў свет кніга М. І. Пахомава, Н. І. Дарафеенкі, М. У. Дарафеенкі «Витебское подполье».

**55 гадоў** таму (1969) у Віцебску створана службовая гарадская пошта.

**55 гадоў** таму (1969) у в. Малыя Лётцы Віцебскага раёна быў адкрыты санаторый «Железнодорожник» транспартнага РУП «Віцебскае аддзяленне Беларускай чыгункі».

**55 гадоў** таму (1974) ва Ушачах была пабудавана новая раённая бальніца.

**55 гадоў** таму (1969) у Оршы знесены будынкі езуіцкіх касцёлаў па вуліцах Савецкай і Энгельса.

**55 гадоў** ва Ушачах адкрылася дзіцячая музычная школа, з 1999 г. – дзіцячая школа мастацтваў.

**55 гадоў** таму (1969) у г. Наваполацку створаны цырк «Юнацтва» Палаца культуры ААТ «Нафтан», лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. У 1972 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў», у 2010 г. званне – «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

**50 гадоў** таму (1974) заснаваны Віцебскі карданажна-паліграфічны камбінат «Пакроўскі» – прадпрыемства па вытворчасці ўпакоўкі з кардону для харчовай і лёгкай прамысловасці. З 2009 г. – ААТ.

**50 гадоў** таму (1974) створаны Глыбоцкі камбікормавы завод. У 2000 г. у склад прадпрыемства ўвайшла птушкафабрыка «Полацкая», з 2001 г. – УСВП у складзе Дэпартаменту па хлебапрадуктах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.

**50 гадоў** таму (1974) створаны Докшыцкі хлебазавод – філіял РУВП «Віцебскхлебпрам».

**50 гадоў** таму (1974) створана Віцебская абласная арганізацыя Беларускага саюза архітэктараў.

**50 гадоў** таму (1974) знойдзены ананімны беларускі празаічны твор сярэдзіны XVIII стагоддзя «Казане руске схизматичне», які, верагодна, узнік у г. Віцебску і стылізаваны пад праваслаўную («схізматычную» – раскольніцкую) пропаведзь.

**50 гадоў** таму (1974) выйшаў бібліяграфічны паказальнік Д. Генінай «Витебск в десяти веках».

**50 гадоў** таму (1974) выйшла ў свет кніга «Витебск. Историко-экономический очерк».

**50 гадоў** таму (1974) у Гарадку адкрыты мемарыяльны комплекс «Бессмяроцце» на вайсковых могілках.

**50 гадоў** таму (1974) у Полацкім раёне выяўлена радовішча будаўнічага пяску і пясчана-гравійнай сумесі «Канашы». Дэталёва разведана ў 1985–1988 гг.

**50 гадоў** таму (1974) у Віцебску была адкрыта абласная дзіцячая бальніца.

**50 гадоў** таму (1974) у Віцебску адкрыўся Палац урачыстых абрадаў.

**50 гадоў** таму (1974) заснаваны Лепельскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж як гідрамеліярацыйны тэхнікум. З 2002 г. – установа адукацыі з сучаснай назвай.



праблематыка жанру» (1969), тамы серыйнага выдання «Пушкін. Даследаванні і матэрыялы» і інш. Ён быў арганізатарам і кіраўніком некалькіх усесаюзных пушкінскіх канферэнцый. У 1974 г. выступіў на пасяджэнні Аддзялення літаратуры і мовы АН СССР з разгорнутым планам стварэння «Пушкінскай энцыклапедыі» і апублікаваў артыкул, які вызначаў яе структурныя прынцыпы.

З 1973 г. навуковая дзейнасць Б. С. Мейлаха звязана з працай Камісіі па комплексным вывучэнні мастацкай творчасці пры Савеце па гісторыі сусветнай культуры АН СССР. Пад яго рэдакцыяй ці пры яго непасрэдным удзеле выходзіць цэлая серыя спецыяльных зборнікаў, прысвечаных творчаму працэсу пісьменніка. У 1970–1980 гады Б. С. Мейлахам былі выдадзены яшчэ некалькі кніг пра Пушкіна, разлічаныя на шырокага карыстальніка і якія набылі чытацкую папулярнасць: «Жыццё Аляксандра Пушкіна» (1974), «Талісман» (1975, 1984). Ужо пасмяротна выйшла ў свет кніга яго артыкулаў «Дзекабрысты і Пушкін».

Памёр Барыс Саламонавіч Мейлах 4 чэрвеня 1987 года. Пахаваны ў Санкт-Пецярбургу на Камароўскіх могілках.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Гуревич, А.** По неизведанном маршруту / А. Гревич // Вопросы литературы. – 1964. – № 2. – С. 211–213. – Рец. на книгу: Мейлах, Б. С. Художественное мышление Пушкина как творческий процесс / Б. С. Мейлах. – Москва : Ленинград : Изд-во АН СССР, 1962. – 249 с.

2. **Измаилов, Н. В.** Борис Соломонович Мейлах: к 60-летию со дня рождения / Н. В. Измаилов // Русская литература. – 1969. – № 4. – С. 224–226.

3. **К 100-летию** со дня рождения Б. С. Мейлаха // Русская литература. – 2010. – № 2. – С. 69–81.

4. **Карлюкевіч, А.** Даследчык творчасці Пушкіна нарадзіўся ў

тэмай «Ленін і руская літаратура». Яго дысертацыйная праца «Ленін і праблемы рускай літаратуры канца XIX – пачатку XX ст.» у 1947 годзе была адзначана Сталінскай прэміяй другой ступені (з 1966 года прыраўняна да Дзяржаўнай прэміі СССР). У 1949 г. ён выступае як адзін з сурэдактараў XI тома вялікага акадэмічнага збору твораў А. С. Пушкіна.

Ужо з пачатку сваёй дзейнасці Б. С. Мейлах надаваў асаблівае значэнне пытанням папулярызацыі і прапаганды пушкінскай творчасці. Пра гэта сведчаць шматлікія артыкулы ў масавым друку, а таксама выдадзены ў 1949 годзе папулярны нарыс біяграфіі А. С. Пушкіна.

У 1958 годзе выходзіць адна з найбольш значных прац вучонага і прац у пасляваенным пушкіназнаўстве манаграфія «Пушкін і яго эпоха». Даследаванне шмат у чым з'яўляецца асновай для сучасных уяўленняў аб Ліцэі пушкінскага часу і аб шматлікіх сувязях Пушкіна з дзекабрысцкім рухам і дзекабрысцкай літаратурна-эстэтычнай традыцыяй. У 1960 годзе, пашыраючы круг сваіх інтарэсаў, Б. С. Мейлах выдае кнігу пра эпоху Л. Талстога «Адыход і смерць Льва Талстога».

Адной з адметных асаблівасцяў даследчага мыслення Б. С. Мейлаха было ўменне знаходзіць і вылучаць тэмы, актуальнасць якіх выяўлялася не адразу, а толькі праз некаторы час. Так адбылося з праблемай вывучэння псіхалогіі мастацкай творчасці А. С. Пушкіна. Пытанні, пастаўленыя ў кнігах Б. С. Мейлаха «Мастацкае мысленне Пушкіна як творчы працэс» (1962) і «Талент пісьменніка і праблемы творчасці» (1969), сталі прадметам сур'ёзных даследаванняў толькі ў 70–80-х гадах.

Яшчэ адной важнай якасцю Б. С. Мейлаха было яго ўменне арганізаваць навуковыя сілы для вырашэння актуальных задач. Яго талент арганізатара выявіўся ў поўнай меры, калі ён узначаліў працу групы Пушкіназнаўства Інстытута рускай літаратуры над некалькімі калектыўнымі працамі. Сярод іх гістарыяграфічная праца «Пушкін. Вынікі і праблемы вывучэння» (1966, сумесна з Б. П. Гарадзецкім і М. В. Ізмайлавым), калектыўная манаграфія «Руская аповесць. Гісторыя і



**50 гадоў** таму (1974) заснаваны Пастаўскі раённы краязнаўчы музей, у 1976 г. – адкрыты для наведвальнікаў

**50 гадоў** таму (1974) заснаваны Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей.

**50 гадоў** таму (1974) у г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна адкрыта дзіцячая музычная школа.

**50 гадоў** таму (1974) адкрыты Пастаўскі раённы Дом культуры як Дом культуры Савецкай арміі. З 1991 г. – сучасная назва.

**50 гадоў** таму (1974) у Гарадку створаны вакальна-танцавальны ансамбль «Яблынька» пры раённым Доме культуры (з 1991 г. – гарадскі Дом культуры). З 1983 г. – Гарадоцкі народны ансамбль песні і танца «Яблынька».

**50 гадоў** таму (1974) заснавана Віцебская абласная цэнтральная СДЮШАР прафсаюзаў па барацьбе «Волат» пры дабравольным спартыўным таварыстве прафсаюзаў «Чырвонае Знамя».

**50 гадоў** таму (1974) заснавана Віцебская абласная СДЮШАР прафсаюзаў па гульнявых відах спорту «Дзвіна».

**50 гадоў** таму (1974) створаны Наваполацкі палац воднага спорту «Садко» як спартыўны комплекс нафтаперапрацоўчага завода «Нафтан». З 2002 г. – Палац воднага спорту «Садко» сацыяльна-жыллёвага комплексу ААТ «Нафтан».

**50 гадоў** таму (1974) заснаваны Наваполацкі хакейный клуб «Хімік» як спартыўны комплекс «Хімік», з 1989 г. – спартыўны клуб «Хімік» ВА «Палімір», з 1994 г. – Палац спорту і культуры, з 2003 г. – камунальнае спартыўна-культурнае прадпрыемства «Палац спорту і культуры г. Наваполацка», у 2005 г. рэарганізаваны шляхам далучэння да камунальнага спартыўнага УП «Хакейны клуб «Хімік».

**45 гадоў** таму (1979) уведзены ў эксплуатацыю Аршанскі завод жалезабетонных вырабаў, спецыялізаваўся на вытворчасці вырабаў, якія выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы. З 1994 г. – ВРУП, з 1996 г. – даччынае КУПП у распараджэнні «Віцебскаблсельбуд».

**45 гадоў** таму (1979) у Віцебску створана аб'яднанне «Рамбыттэхніка». Зараз ААТ «Вітрамбыт».

**45 гадоў** таму (1979) у Віцебску ўстаноўлены бюст С. М. Кіраву.

**45 гадоў** таму (1979) у Браслаўскім раёне заснаваны азёрны заказнік, з 2007 г. – гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Рычы».

**45 гадоў** таму (1979) у Браслаўскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Забалацце».

**45 гадоў** таму (1979) у Віцебскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Запольскі».

**45 гадоў** таму (1979) у Віцебскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Мошна».

**45 гадоў** таму (1979) у Віцебскім раёне заснаваны заказнік-журавіннік. З 2007 г. – біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Чысцік».

**45 гадоў** таму (1979) створаны азёрны (зараз – гідралагічны) заказнік рэспубліканскага значэння «Белае» ў Глыбоцкім і Ушацкім раёнах.

**45 гадоў** таму (1979) у Глыбоцкім раёне заснаваны азёрны заказнік «Доўгае». З 2007 г. – гідралагічны.

**45 гадоў** таму (1979) у Полацкім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Лонна».

**45 гадоў** таму (1979) у Полацкім раёне заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Глыбокае–Чарбамысла».

**45 гадоў** таму (1979) у Полацкім раёне заснаваны азёрны заказнік. З 2007 г. – гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Глыбокое–Вялікае Астравіта».

**45 гадоў** таму (1979) у Расонскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Фаміно».

**45 гадоў** таму (1979) ва Ушацкім раёне заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Крывое».



паступіў у аспірантуру Інстытута новай рускай літаратуры (цяпер Інстытут рускай літаратуры (Пушкінскі Дом) АН СССР), дзе ў 1935 г. абараніў дысертацыю «Пушкін і рускі рамантызм», якая выйшла асобнай кнігай у 1937 годзе.

Б. С. Мейлаху ў савецкім пушкіназнаўстве належыць бясспрэчна значнае месца і як даследчыку, і як арганізатару даследаванняў. Ён прыйшоў у літаратуразнаўства ў перыяд станаўлення марксісцкіх метадалагічных прынцыпаў у навуцы, што знайшло адлюстраванне ў яго працах. У сваім першым буйным даследаванні Б. С. Мейлах абгрунтоўваў канцэпцыю барацьбы Пушкіна з «рэакцыйным» рамантызмам Жукоўскага і збліжэння з «прагрэсіўным», грамадзянскім рамантызмам пачатку XIX стагоддзя. Пры ўсіх дапушчаных недакладнасцях, гэтая праца была адной з першых у гэтым напрамку і давала перадумовы для далейшых навуковых даследаванняў. У кнізе «Пушкін і рускі рамантызм» узнята яшчэ адна праблема: праблема псіхалогіі пушкінскай творчасці, якая вывучаецца на матэрыялах чарнавых рукапісаў паэта. Адным з першых у савецкім літаратуразнаўстве Б. С. Мейлах пачаў даследаванне матэрыялаў Вольнага таварыства аматараў расійскай славеснасці, пра што сведчаць шматлікія працы вучонага. Іншыя даследаванні, якія Б. С. Мейлах пачынае ў перадваенныя гады, атрымалі завяршэнне значна пазней.

У 1941 годзе малады вучоны займае пасаду выконваючага абавязкі дырэктара Інстытута рускай літаратуры. З пачатку 1942 года Б. С. Мейлах у эвакуацыі ў Ташкенце: узначаліў Ташкенцкае аддзяленне Інстытута і адначасова кафедру рускай літаратуры ў Сярэднеазіяцкім дзяржаўным універсітэце. У 1944 г. абараняе дысертацыю на ступень доктара філалагічных навук. Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Б. С. Мейлах вяртаецца ў Ленінград. Адначасова з працай у Інстытуце ён выкладае ў Ленінградскім універсітэце (з 1955 г. – прафесар кафедры рускай літаратуры).

Б. С. Мейлаха заўсёды цікавілі праблемы эстэтыкі, тэорыі і метадалогіі літаратуры. Яшчэ ў 1939 годзе ён пачынае працаваць над

# Ліпень



**МЕЙЛАХ**
**БАРЫС САЛАМОНАВІЧ**
*115 год з дня нараджэння*
*(1909)*

**Мейлах Барыс Саламонавіч** (1909–1987) – савецкі філолаг, тэкстолаг, педагог, культуролаг, доктар філалагічных навук, пушкініст.

Нарадзіўся 9 ліпеня 1909 года ў горадзе Лепелі ў традыцыйнай яўрэйскай сям'і. Яго бацька быў настаўнікам у пачатковай яўрэйскай школе (хедэры). Падзарабляў перапляценнем кніг. Маці, магчыма, паходзіла са старадаўняга сефардскага роду. Сям'я стала ахвярай пагромаў, ад якіх вымушана была пераехаць у г. Тулу. Барыс Мейлах быў музычна адораным хлопчыкам, аднак займацца музыкай змог толькі пасля заканчэння грамадзянскай вайны. Для прафесійных заняткаў гэта было занадта позна, але любоў да музыкі захаваў на ўсё жыццё. І па ўспамінах сына, пасля наведвання канцэрта класічнай музыкі, часта садзіўся за раяль і выконваў па памяці пачуты музычны твор. Сярэднюю школу Барыс Мейлах закончыў у г. Туле. Вельмі рана, яшчэ будучы падлеткам, пачаў друкавацца ў мясцовай газеце. У 1928 годзе паступіў на літаратурны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Факультэцкую праграму прайшоў за тры гады, адначасова зарабляючы на жыццё журналістыкай. У 1931 годзе



**45 гадоў** таму (1979) у Шумілінскім раёне заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Сосна».

**45 гадоў** таму (1979) было адкрыта Віцебскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага рэзерву.

**45 гадоў** таму (1979) быў адкрыты Віцебскі абласны псіханеўралагічны дыспансер.

**45 гадоў** таму (1979) Верхнядзвінская раённая бібліятэка была рэарганізавана ў цэнтральную раённую бібліятэку.

**45 гадоў** таму (1979) у г. п. Бешанковічы быў заснаваны і адкрыты музей баявой славы. Зараз – Бешанковіцкі раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

**45 гадоў** таму (1979) у Оршы пры дзіцячай музычнай школе № 1 (з 2004 г. пры гарадскім Цэнтры культуры) быў створаны Аршанскі народны духавы аркестр. У 1986 г. было прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**45 гадоў** таму (1979) створаны хор «Вясёлка» пры СШ № 27 г. Віцебска. У 1989 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**45 гадоў** таму (1979) заснаваны Адаменскі народны фальклорны гурт «Медуніца» сельскага Дома культуры Лёзненскага раёна.

**45 гадоў** таму (1979) створаны духавы аркестр пры СШ № 1 г. Віцебска (з 2007 г. – гімназія № 3 імя А. С. Пушкіна). У 1982 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**45 гадоў** таму (1979) створаны хор пры школе мастацтваў № 1 г. Віцебска на базе харавога аддзялення. У 1983 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў». Зараз – Віцебскі ўзорны хор.

**40 гадоў** таму (1984) заснаваны Лёзненскі лясгас як дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова на тэрыторыі Лёзненскага раёна.

**40 гадоў** таму (1984) выйшла кніга В. М. Ляўко «Экскурсія па старажытнаму Віцебску».

**40 гадоў** таму (1984) у Аршанскім раёне выяўлены археалагічны помнік – стаянка каменнага веку «Берасценава». У 1987–1988 гг. У. П. Ксяндзоў даследаваў 829 м$^2$.

**40 гадоў** таму (1984) на тэрыторыі Полацкага Ніжняга замка знойдзены Полацкі рэчавы скарб.

**40 гадоў** таму (1984) у Браславе заснаваны гісторыка-краязнаўчы музей на базе школьнага музея. Зараз – Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў.

**40 гадоў** таму (1984) заснаваны Шумілінскі гісторыка-краязнаўчы музей, у 1986 г. – адкрыты для наведвальнікаў.

**40 гадоў** таму (1984) у Оршы заснаваны гарадскі Дом культуры. З 2004 г. – Аршанскі гарадскі Цэнтр культуры.

**40 гадоў** таму (1984) створаны Віцебскі камерны хор пры тэлевізійным заводзе (з 2007 г. – пры Цэнтры культуры «Віцебск»). У 1989 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**40 гадоў** таму (1984) у г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна быў створаны Арэхаўскі народны хор.

**35 гадоў** таму (1989) адноўлена Полацкая праваслаўная епархія – найстарэйшая ў Беларусі, датай заснавання якой лічыцца 992 год.

**35 гадоў** таму (1989) у Полацку быў адноўлены Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр.

**35 гадоў** таму (1989) у Віцебску заснаваны завод харчовых канцэнтратаў. Сучасная назва – Камунальнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Кандытарская фабрыка «Віцьба».

**35 гадоў** таму (1989) Віцебская абласная філармонія была створана на базе гастрольна-канцэртнага аддзялення Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

**35 гадоў** таму (1989) у Віцебску адкрыўся Літаратурны музей. Спыніў сваю дзейнасць у 2009 годзе.

**35 гадоў** таму (1989) у в. Валынцы Верхнядзвінскага раёна быў заснаваны Валынецкі краязнаўчы музей імя І. Д. Чэрскага. З 2009 г. – філіял «Валынецкі краязнаўчы музей імя І. Д. Чэрскага» дзяржаўнай установы культуры «Верхнядзвінскі гісторыка-краязнаўчы музей».



1995. – Т. 5 : Пестрак–Сяўрук. – С. 474–475.

2. **Краснова-Гусачэнка**, Т. За Радзіму – у смертны бой / Т. Краснова-Гусачэнка // Літаратура і мастацтва. – 2010. – 2 ліп. (№ 26). – С. 12.

3. **Мікола** Сямашка // Беларускія пісьменнікі (1917–1990) : даведнік / склад. А. К. Гардзіцкі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – С. 524–525.

4. **Мікола** Сямашка // Ішла вайна народная... : беларускія пісьменнікі ў Вялікай Айчыннай: біяграфіі, успаміны, творы / уклад. С. А. Міхальчука і Л. Я. Прокшы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1991. – С. 654.

5. **Мікола** Сямашка // Крывёю сэрца : [вершы] / уклад. А. Вялюгін ; рэдкал.: Р. Барадулін [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1967. – С. 172.

6. **Мікола** Сямашка // Мы іх не забудзем : зборнік, прысвечаны памяці пісьменнікаў Беларусі, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі / склад. А. Вялюгін. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, рэд. маст. літ., 1949. – С. 198–199.

7. **Сопікава, В. В.** На Ветрыншчыне, ля памятных знакаў / В. В. Сопікава // Полацкі веснік. – 2018. – 9 лістап. – С. 18.

8. **Сямашка** Мікола // Памяць: Полацкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: І. Б. Каросцік, Р. І. Маслоўскі, А. Л. Петрашкевіч ; уклад. С. С. Чарняўская ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Вышэйшая школа, 1999. – С. 644–645.

9. **Сямашка** Мікола // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-ці т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гл. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. – Т. 5 : Скамарохі–Яшчур. – С. 215.

10. **Фамічоў, У.** 70 год з дня нараджэння Міколы (Мікалая Пятровіча) Сямашкі // Полымя. – 1984. – № 12. – С. 215–216.

11. **Шушкевіч, С. П.** На Аршаншчыне ля сіняй ракі: Міколу Сямашку – паэту і салдату // Выбраныя творы : у 2 т. / С. П. Шушкевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1978. –. Т. 1 : Вершы, казкі. – С. 84–85.

рэдакцыі беластоцкай газеты «Вольная праца». З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны М. П. Сямашка знаходзіўся на фронце.

У сваіх вершах Мікола Сямашка натхнёна паэтызаваў прыгажосць роднага краю («Пачатак лета», «Дождж прайшоў», «Вечар на возеры»), выказваў захапленне магутнай Айчынай і аптымізмам савецкага чалавека («З вершаў аб Радзіме», «Чырвоная зорка», «У дазоры», «Граніца»). Асобныя вершы прысвечаны П. Броўку, А. Пушкіну, М. Горкаму, Ш. Руставелі. Калі ў яго грамадзянскіх вершах, напісаных з афіцыйнай ідэалагічнай пазіцыі, дамінуе пафаснасць і дэкларацыйнасць, то ў вершах асабістых, інтымных адчуваецца глыбокае лірычнае пачуццё, роздум («Жыццё нам б'е сваім чалом», «Ты выйдзі ў сад», «Непарушнае слова», «Студэнтцы»). У іх выразна адчуваецца ўплыў фальклорнай паэтыкі, што робіць іх празрыстымі, лёгкімі («Дзявочая», «Чаканне», «Дарэмныя трывогі»). Падчас работы М. Сямашкі ў Беластоку быў падрыхтаваны новы зборнік вершаў аб вызваленні Заходняй Беларусі. Зборнік быў аддадзены ў Дзяржаўнае выдавецтва БССР у чэрвені 1941 года, але свет ён так і не пабачыў. Паасобныя творы пасмяротна друкаваліся ў кнігах «Анталогія беларускай паэзіі (1961), «Крывёю сэрца» (1967), «Ішла вайна народная…» (1991). Некаторыя з яго вершаў перакладзены на рускую мову.

Загінуў Мікалай Пятровіч Сямашка ў 1941 годзе пры абароне г. Оршы.

У в. Нача Полацкага раёна па ініцыятыве сябра літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне», члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктара Карасёва ўсталяваны помнік пісьменнікам-землякам – Вісарыёну Гарбуку і братам Мікалаю і Сцяпану Сямашкам.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Багдановіч І. Э.** Сямашка Мікола / І. Э. Багдановіч, Г. І. Рэут // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.] ; маст. рэд. В. Г. Загародні. – Мінск : БелЭн,



**35 гадоў** таму (1989) у Віцебску здадзены ў эксплуатацыю Палац культуры і тэхнікі лёгкай прамысловасці. Зараз КЗ «Віцебск» Цэнтра культуры «Віцебск».

**35 гадоў** таму (1989) адкрыты Глыбоцкі Дом рамёстваў.

**35 гадоў** таму (1989) заснаваны ансамбль народнай музыкі «Таўкачыкі» пры Полацкай дзіцячай школе мастацтваў. У 1995 годзе прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**35 гадоў** таму (1989) створаны Верхнядзвінскі народны клуб народных майстроў і самадзейных мастакоў пры раённым Доме культуры. З 2005 г. дзейнічае пры раённым Доме рамёстваў.

**35 гадоў** таму (1989) заснаваны Дрысвяцкі фальклорны гурт «Вярба» сельскага Дома культуры Браслаўскага раёна. У 1998 г. прысвоена званне «Народны фальклорны калектыў».

**35 гадоў** таму (1989) у Віцебску створаны аркестр народных інструментаў пры Палацы культуры і тэхнікі прафсаюзаў. З 1993 г. дзейнічае пры СШ № 44. У 1993 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў». З 2000 г. – Віцебскі ўзорны аркестр народных інструментаў «Расінка».

**35 гадоў** таму (1989) заснаваны Каўшэлеўскі фальклорны ансамбль «Купалінка» сельскага Дома культуры Шаркаўшчынскага раёна. У 1999 г. прысвоена званне «Народны фальклорны калектыў».

**35 гадоў** таму (1989) створана Гарадоцкае народнае аматарскае аб'яднанне «Зялёная альтанка» пры раённай бальніцы (з 2001 г. – пры раённым краязнаўчым музеі). Зараз – пры Доме рамёстваў і фальклору. У 1995 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**35 гадоў** таму (1989) створаны Віцебскі тэатр гульні на базе гарадскога Цэнтра культуры (з 2007 г. – Цэнтр культуры «Віцебск»). У 1995 г. прысвоена званне «Народны аматарскі тэатр».

**35 гадоў** таму (1989) у Віцебску створаны гурток «Фальклор» пры гімназіі № 7. У 1999 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў» і сучасная назва – узорны фальклорны тэатр «Пралеска».

**35 гадоў** таму (1989) створаны Віцебскі фальклорны калектыў «Зорачкі» пры СШ № 15 (з 1994 г. – гімназія № 1). У 2006 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**35 гадоў** таму (1989) створаны народны клуб ветэранаў «Чырвоныя гваздзікі» пры гарадскім Цэнтры культуры г. Дзісна Мёрскага раёна. У 2003 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**35 гадоў** таму (1989) у Полацку пры гарадскім Палацы культуры створана літаратурнае аб'яднанне «Полоцкая ветвь». У 2005 г. – прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**35 гадоў** таму (1989) створаны Лепельскі ўзорны тэатр-студыя «Сюрпрыз» пры дзіцячай школе мастацтваў на базе тэатральнага і харэаграфічнага аддзяленняў. У 2000 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі тэатр».

**35 гадоў** таму (1989) створаны Лепельскі народны клуб народных майстроў і самадзейных мастакоў «Скарбонка». У 1991 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**30 гадоў** таму (1994) у Віцебску заснавана ЗАТ са спецыялізацыяй па забеспячэнска-збытавай дзейнасці ў галіне малой і сярэдняй энергетыкі. З 2000 г. – прадпрыемства па вытворчасці і рэалізацыі вадаачышчальнага абсталявання.

**30 гадоў** таму (1994) у г. Віцебску заснавана ТАА «Рубікон» – прадпрыемства па вытворчасці і рэалізацыі ветэрынарных прэпаратаў, інструментаў і абсталявання.

**30 гадоў** таму (1994) створана Наваполацкае ТАА фірма «Белсэрвіс» – будаўніча-мантажнае і праектнае прадпрыемства.



# *Чэрвень*



**СЯМАШКА**
**МІКАЛАЙ ПЯТРОВІЧ**
*110 год з дня нараджэння*
*(1914)*

**Сямашка Мікола** (сапр. Мікалай Пятровіч; 1914–1941) – беларускі савецкі паэт, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Нарадзіўся ў 1914 годзе ў в. Барылы Полацкага павета Віцебскай губерні (зараз Полацкі раён) у сялянскай сям'і. Вучыўся ў сямігодцы. Рана пачаў пісаць вершы, стаў селькорам. У артыкулах, якія дасылаў у газеты, найперш у раённую, расказваў аб справах аднавяскоўцаў, пра тыя змены што адбываліся на роднай зямлі ў першыя гады савецкай улады. Пасля заканчэння сямігодкі, здольнага аўтара запрасілі на працу ў рэдакцыю ветрынскай раённай газеты. Гады журналісцкай дзейнасці сталі для М. Сямашкі гадамі творчага станаўлення і адначасова вывучэння жыцця. Першы верш з'явіўся ў друку ў 1926 годзе ў газеце «Чырвоная Полаччына». Потым былі шматлікія вершы ў газетах «Чырвоная змена», «Калгаснік Беларусі», «Літаратура і мастацтва», «Вольная праца», часопісе «Полымя рэвалюцыі». Першая і адзіная кніга яго паэзіі «Шчырасць» выйшла ў Мінску ў 1939 годзе. У той жа год ён быў мабілізаваны ў Чырвоную армію. Радыстам зенітнай часці ўдзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі. З 1940 года і да чэрвеня 1941 года, пачатку Вялікай Айчыннай вайны, працаваў загадчыкам літаратурнага аддзела

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Віктараў, В.** Тры зоркі / В. Віктараў // Ленінская праўда (Віцебск). – 1981. – 14 лістап. – С. 2.

2. **Газин, Д.** Дело тонкое – разведка / Д. Газин // Віцьбічы = Витьбичи. – 2004. – 29 мая. – С. 4.

3. **Газин, Д.** От Усвячи до Эльбы / Д. Газин // Жыцце Прыдзвіння (Віцебск). – 1998. – 19 жн. – С. 2.

4. **Герой** войны и труда // Память: историко-документальная хроника Шумилинского района / редкол.: И. П. Шамякин [и др.] ; худож. А. Н. Хилькевич. – Минск : БелСЭ им. П. Бровки, 1985. – С. 506.

5. **Кандраценка, М.** За пяцігодку – два планы / М. Кандраценка // Віцебскі рабочы. – 1977. – 13 крас. – С. 2.

6. **Кондратенко** Михаил Борисович : [некралог] // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2004. – 17 жн. – С. 4.

7. **Кондратенко** Михаил Борисович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 509.

8. **Кондратенко** Михаил Борисович // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 255.

9. **Кондратенко** Михаил Борисович // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биографический справочник / сост. И. Н. Кулан, В. И. Козак, Е. Е. Соколов ; под общ. ред. А. Н. Новикова. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2014. – С. 126.

10. **Мезенцев, В.** Жизнь Героя / В. Мезенцев // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2004. – 30 крас. – С. 2.



**30 гадоў** таму (1994) у Наваполацку заснавана прадпрыемства «Любава». Зараз – ТАА «Любава ЛЮКС». Спецыялізуецца на выпуску верхніх і бялізнавых швейных трыкатажных вырабаў дзіцячага і дарослага асартыменту.

**30 гадоў** таму (1994) швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» пераўтворана ў ААТ.

**30 гадоў** таму (1994) у Віцебску адбыўся І Міжнародны Шагалаўскі пленэр, творчая сустрэча мастакоў. У 1997 г. адбылася другая сустрэча.

**30 гадоў** таму (1994) створаны Віцебскі Цэнтр народных рамёстваў і мастацтваў «Задзвінне». З 2010 – Цэнтр народных рамёстваў і мастацтваў «Дзвіна», з 2011 – ДУ «Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна».

**30 гадоў** таму (1994) заснаваны Аршанскі гарадскі Дом рамёстваў пры гарадскім Палацы культуры. З 1997 г. – самастойная арганізацыя, з 2008 г. размяшчаецца ў рэканструяваным будынку былой бурсы калегіума езуітаў.

**30 гадоў** таму (1994) адкрыты Полацкі гарадскі Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур.

**30 гадоў** таму (1994) створаны Віцебскі дзіцяча-юнацкі тэатр моды «Наш стыль» пры абласным аб'яднанні па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі. У 2004 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**30 гадоў** таму (1994) створана мастацкая студыя «Цюбікі» пры Віцебскім мастацкім музеі. У 1998 г. прысвоена званне «Узорная мастацкая студыя».

**30 гадоў** таму (1994) створана пачатковая студыя-школа выяўленчага мастацтва «Парасткі» пры Віцебскім абласным аб’яднанні па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі. У 2001 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**30 гадоў** таму (1994) у Віцебску пры СШ № 3 створаны гурток «Паэтычны тэатр». У 2006 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў» і сучасная назва. Зараз – узорны тэатральны калектыў «Прэм’ера».

**30 гадоў** таму (1994) створана Аршанская ўзорная студыя эстраднай песні «Рафлезія» пры гарадскім Доме культуры (з 2004 г. – гарадскі Цэнтр культуры). У 1996 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**30 гадоў** таму (1994) у Аршанскім раёне створаны Андрэеўшчынскі народны сямейны клуб «Надзея» пры сельскай бібліятэцы-філіяле № 34 Аршанскай раённай цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы.

**30 гадоў** таму (1994) створаны Верхнядзвінскі народны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Ярыца» пры раённым Доме культуры. У 1996 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**30 гадоў** таму (1994) створаны артыстычны калектыў у в. Дзеркаўшчына Глыбоцкага раёна. Зараз – народны драматычны калектыў Дзеркаўшчынскага цэнтра культуры.

**30 гадоў** таму (1994) у Наваполацку спартыўны клуб «Хімік» ВА «Палімір» перайменаваны ў Палац спорту і культуры, з 2003 г. – камунальнае спартыўна-культурнае прадпрыемства «Палац спорту і культуры г. Наваполацка», у 2005 г. рэарганізаваны шляхам далучэння да камунальнага спартыўнага УП «Хакейны клуб «Хімік».

**25 гадоў** таму (1999) у Віцебску было заснавана замежнае ПУВП «Вителла» – прадпрымства па вытворчасці шакаладнай, какавазмяшчаючай глазуры, сухіх сумесяў для шакаладных паст, цукрыстых кандытарскіх вырабаў. З 2000 г. – рэзідэнт свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск».

**25 гадоў** таму (1999) створана РУП «Віцебскі станкабудаўнічы завод імя С. М. Кірава «ВІСТАН» шляхам далучэння да станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава Віцебскага спецыяльнага канструктарскага бюро зубаапрацоўчых, шліфавальных і заточных станкоў. Зараз – ААТ «ВІСТАН».



прадпрыемства «Дабееўскі мох» Шумілінскага раёна. У 1957 годзе скончыў спецыяльныя курсы. Працаваў машыністам экскаватара, а затым на працягу 22 гадоў – машыністам торфаўборачных машын (Тэмп-2М, УМПФ-7), якія, як рацыяналізатар і вынаходнік, сам рэканструяваў. Дзякуючы гэтаму ўдасканаленню тэхнікі значна ўзрасла прадукцыйнасць працы. Наогул, Міхаіл Барысавіч Кандраценка адрозніваўся высокім прафесійным майстэрствам, дысцыплінаванасцю, непрымірымасцю да праяў безгаспадарлівасці.

Значнымі працоўнымі дасягненнямі ён праславіўся на працягу трох пяцігодак. Асаблівы поспех прыйшоў у гады 8-й пяцігодкі. Кожны яе год Міхаіл Барысавіч выконваў за сезон па два гадавых заданні. За працоўную доблесць у 8-й пяцігодцы былому воіну-франтавіку Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 20 красавіка 1971 г. было прысвоена высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы. Пацвердзіў гэтае высокае званне М. Б. Кандраценка і ў 10-й пяцігодцы. Пяцігадовае заданне па здабычы фрэзернага торфу для патрэб сельскай гаспадаркі ён выканаў яшчэ летам 1978 г., а да 23 чэрвеня 1980 г. выканаў яшчэ адно пяцігадовае заданне – пры плане на 10-ю пяцігодку 33,7 тыс. тон торфу здабыў 70 тыс. тон.

М. Б. Кандраценка выбіраўся дэлегатам 27-га з’езда Камуністычнай партыі Беларусі і 13-га з’езда прафсаюзаў Беларусі, на працягу некалькіх скліканняў быў дэпутатам Мазалаўскага сельсавета.

На заслужаны адпачынак, пенсію па ўзросту, ветэран, інвалід Вялікай Айчыннай вайны пайшоў у 1984 годзе. Жыў, не змяняючы традыцыям продкаў, у невялікай вёскі Лужкі Віцебскага раёна ў хаце, якую пабудаваў сам.

Памёр Міхаіл Барысавіч Кандраценка 15 жніўня 2004 года.

За мужнасць і адвагу ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі (1943), ордэнам Славы III ступені (1945), ордэнам Айчыннай вайны I ступені (1985), медалём «За адвагу»; за працоўныя дасягненні – ордэнам Леніна і медалём «Серп і молат» (1971), медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна» (1969), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР і іншымі ўзнагародамі.

## *Май*



**КАНДРАЦЕНКА**
**МІХАІЛ БАРЫСАВІЧ**
*100 год з дня нараджэння*
*(1924)*

**Кандраценка Міхаіл Барысавіч** (1924–2004) – работнік торфапрадпрыемства (машыніст торфанарыхтоўчага экскаватара), Герой Сацыялістычнай Працы.

Нарадзіўся 1 мая 1924 года ў вёсцы Трыніўкі Курынскага сельсавета былога Суражскага раёна (зараз Віцебскі раён). У 1941 годзе скончыў Курынскую няпоўную сярэднюю школу. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся на акупіраванай фашыстамі тэрыторыі. У красавіку 1942 года разам з бацькам і старэйшым братам Віктарам перайшоў лінію фронту пад Усвятамі праз «Віцебскія вароты», каб уліцца ў рады байцоў Чырвонай арміі. Пасля вайсковай падрыхтоўкі яго залічылі ў палкавую разведку. Служыў у асобным разведвальным эскадроне 6-й кавалерыйскай дывізіі імя А. Я. Пархоменкі. Пры выкананні баявых заданняў быў тройчы паранены. Дэмабілізаваўся з арміі ў верасні 1945 года. Некаторы час працаваў у калгасе. З красавіка 1946 года 34 гады адпрацаваў на торфапрадпрыемстве. Спачатку на торфазаводзе «ХХ гадоў Кастрычніка», а з 1964 года – на аднайменным тарфяным участку



**25 гадоў** таму (1999) заснаваны ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Казьянскі» ў Полацкім і Шумілінскім раёнах на базе былога аднайменнага паляўнічага заказніка.

**25 гадоў** таму (1999) у Пастаўскім і іншых раёнах Беларусі заснаваны Нацыянальны парк «Нарачанскі», дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова.

**25 гадоў** таму (1999) Віцебскі медыцынскі інстытут быў перайменаваны ў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт ордэна Дружбы народаў.

**25 гадоў** таму (1999) пабудаваны Віцебскі палац спорту (Лядовы палац спорту).(Архітэктары І. Боўт і А. Шафрановіч).

**25 гадоў** таму (1999) у в. Лявонпаль Мёрскага раёна заснаваны музей радзімазнаўства.

**25 гадоў** таму (1999) заснаваны Пастаўскі раённы архіў па асабовым складзе Пастаўскага раённага выканаўчага камітэта.

**25 гадоў** таму (1999) створаны Віцебскі народны ансамбль народнай песні «Сябрына» пры ВА «Маналіт». З 2007 г. дзейнічае пры ДУ «Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна». У 2007 г прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) у Віцебску створана народная эстрадна-вакальная студыя «Канстанта» пры Доме культуры Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. У 2008 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) у пасёлку Дачны Аршанскага раёна пры сельскай бібліятэцы створана народнае аматарскае аб’яднанне «Пралеска». У 2003 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) у Віцебску створаны ансамбль рускіх народных інструментаў выкладчыкаў на базе дзіцячай музычнай школы № 4. З 2005 г. – Віцебскі народны ансамбль «Кантраст», у 2006 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) створаны Віцебскі народны хор пры УП «Віцебскаблгаз». У 2009 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) створана Віцебская студыя эстраднай песні «Форум» пры гарадскім Цэнтры культуры (з 2007 г. – Цэнтр культуры «Віцебск»). У 2002 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) створаны Верхнядзвінскі народны клуб аматараў моды «Вобраз» пры дзіцячай школе мастацтваў. У 2004 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) Верхнядзвінскі эстрадны гурт «Праект» быў створаны пры СШ № 1 (з 2001 г. – пры раённым Доме культуры). У 2004 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) створана Вусцеўскае аматарскае аб'яднанне «Жаночыя сакрэты» пры сельскай бібліятэцы Аршанскага раёна. У 2003 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) Гарадоцкі фальклорны калектыў «Глейна» быў створаны пры раённым метадычным цэнтры народнай творчасці культасветработы. У 2007 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) створана Расонская ўзорная фальклорная група «Нежачкі» пры Цэнтры пазашкольнай работы (сучасная назва – «Расонскі Цэнтр дзяцей і моладзі»). У 2005 г. – прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**25 гадоў** таму (1999) у Пастаўскім раёне пры сельскім Доме культуры створаны Курапольскі народны клуб нацыянальнай кухні, гульні і абраду «Традыцыя». У 2003 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».



«Умные вещи» (сумесна з Анатолем Гранікам; СССР, Ленфільм, 1973).

Аляксандр Цвярскі шмат часу аддаваў грамадскай дзейнасці, быў членам Савета па дзіцячай і юнацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Расіі, членам Савета па беларускай літаратуры, членам праўлення Савета ветэранаў вайны – маскоўскіх пісьменнікаў.

Памёр Аляксандр Давыдавіч Цвярскі 10 лютага 1990 года.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.».

## ЛІТАРАТУРА


1. **Александр** Давыдович Тверской: к пятидесятилетию со дня рождения // Книги – детям : сборник материалов в помощь учителям, библиотекарям и пионерским вожатым 1973 / сост. Г. И. Трухачева ; оформ. И. Кошкарева. – Москва : Детская литература, 1973. – С. 135–136.
2. **Герчик, М.** …И ничто не забыто: [для сред. и ст. возраста] / М. Герчик // Неман. – 1967. – № 2. – С. 188–190. – Рец. на кнігу: Тверской, А. Д. Турецкий марш : повесть / А. Д. Тверской. – Москва : Детская литература, 1965. – 222 с.
3. **Гинзбург, Б.** Турецкий писатель из Витебска / Б. Гінзбург // Мішпоха. – 2004. – № 14. – С. 130–132. – Режим доступа: http://mishpoha.org/nomer14/index.php#Content. – Дата доступа: 10.08.2023.
4. **Симанович, Д.** Из далекого дня он глядит на меня… / Д. Симанович // Мішпоха. – 2004. – № 14. – С. 133. – Режим доступа: http://mishpoha.org/nomer14/a29.php. – Дата доступа: 10.08.2023.
5. **Халіп, У.** Там дзе прагучаў «турэцкі марш»…/ У. Халіп // Чырвоная змена. – 1966. – 27 сак. – С. 3.
6. **Цвярскі** Аляксандр Давыдавіч // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2003. – Кн. 2. – С. 542.

эпізод, вызначае самае галоўнае, самае характэрнае. Яго героі прадстаўлены ў складаных абставінах, у цяжкія часы, але іх высакароднасць, самаахвярнасць дазваляюць ім выходзіць з агню вайны яшчэ больш прыгажэйшымі. Кніга была перавыдадзена ў 1968 і 1983 гадах тыражом адпаведна 75000 і 100000 экзэмпляраў.

У 1981 годзе ў выдавецтве «Мерані» (г. Тбілісі) асобным выданнем выйшла літаратуразнаўчая праца А. Цвярскога пра Георгія Гуліа, рускага пісьменніка абхазскага паходжання – «Георгій Гуліа, як ён ёсць». Перавыдадзена выдавецтвам «Алашара» (г. Сухумі) у 1985 годзе. Пісьменніку-інтэрнацыяналісту А. Цвярскому належаць пераклады вершаў паэтаў розных народаў, у тым ліку – вершы і казкі яго сябра Назыма Хікмета, француза Поля Элюара, кубінца Нікаласа Гільена, чылійца Пабла Няруды, а таксама беларускага класіка Максіма Багдановіча, украінскіх паэтаў Паўла Тычыны, Максіма Рыльскага. Уладзіміра Сасюры. Перакладаў А. Цвярскі і прозу. Сярод яго перакладаў кнігі беларусаў Аляксея Якімовіча «Васільеў курган» і «Першая перамога» і Уладзіміра Мехава «Чырвоны губернатар» і «Апошняя яўка», аповесць Даіра Слаўковіча «Хвядоскавы канікулы», казкі ўкраінкі Аксаны Іваненкі «Сандалікі, поўная хуткасць!», раман Анатоля Дрофаня, «Таямніца блакітнага палаца», аповесць бурата Барадыя Мунгонава «Чорны вецер», «Таямніца Караідэлі» башкіра Кірэя Мэргэна, «Ягор Чэрын» якута Цімафея Смятаніна, «Казкі» Назыма Хікмета і іншы аутараў.

Дзейнасць А. Цвярскога як публіцыста пачалася з яго працы ў рэдакцыі «Піянерскай праўды». З таго часу на старонках цэнтральных газет і часопісаў часта з’яўляліся яго артыкулы, нарысы, галоўнай тэмай якіх была інтэрнацыянальная тэма. Ёсць у А. Цвярскога нямала крытычных прац аб дзіцячай літаратуры.

Аляксандр Цвярскі вядомы і як драматург. Ён аўтар п’есы «Рассказ одной девушки» і кінасцэнарыяў да фільма «Самые первые» (СССР, Ленфільм, 1961), а таксама фільма-казкі па матывах аднайменнай п’есы Самуіла Маршака



**20 гадоў** таму (2004) у Віцебску заснавана сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства па вытворчасці алкагольных і безалкагольных напояў ААТ «Дзвінскі бровар».

**20 гадоў** таму (2004) у Пастаўскім раёне адкрыўся дзіцячы рэабілітацыйны аздараўленчы цэнтр «Ветразь».

**20 гадоў** таму (2004) у в. Бычкі Ушацкага раёна быў заснаваны сядзіба-музей Васіля Быкава – філіял Ушацкага музея народнай славы.

**20 гадоў** таму (2004) у в. Акцябрская створаны Віцебскі раённы Цэнтр народных мастацкіх рамёстваў «Адраджэнне».

**20 гадоў** таму (2004) створаны Віцебскі ўзорны аркестр народных інструментаў «Спадчына» пры СШ № 25. У 2008 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**20 гадоў** таму (2004) у Віцебску створаны тэатр «Адзіны варыянт» пры ВДУ імя П. М. Машэрава (з 2007 г. – пры Цэнтры культуры «Віцебск»). У 2008 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў» і сучасная назва. Зараз – Віцебскі народны маладзёжны тэатр «Кола».

**20 гадоў** таму (2004) была створана Віцебская народная мужчынская вакальная група пры прыватным УП «Элект» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. У 2007 г. прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў».

**20 гадоў** таму (2004) створана Аршанская студыя эстрадных спеваў «Дубль №» пры гарадскім Цэнтры культуры. У 2007 г. прысвоена званне «Узорны аматарскі калектыў».

**20 гадоў** таму (2004) у Полацку пачала выходзіць серыя выданняў «Спадчына Полацкай зямлі», мэтай якой з’яўляецца публікацыя і передрукоўка гістарычных, археалагічных і крыніцазнаўчых твораў, прысвечаных мінуламу Полацка.

**20 гадоў** таму (2004) адкрыты Пакроўскі жаночы манастыр у захаваных будынках Талачынскага Пакроўскага манастыра базыльянаў – помніка архітэктуры віленскага барока.

**15 гадоў** таму (2009) створаны Гарадоцкі літаратурны клуб «Гараднянка» пры цэнтральнай раённай бібліятэцы.

# Студзень

**105 гадоў** таму (1919) адбыўся першы з’езд прафсаюзаў Віцебскай губерні.

**50 гадоў** таму (1974) пушчана першая чарга Аршанскага інструментальнага завода.

**1 студзеня** – 105 гадоў таму (1919) у Віцебску былі нацыяналізаваны ўсе кінатэатры.

**1 студзеня** – 95 гадоў таму (1929) адкрыта віцебскае аддзяленне Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна. З 1938 г. – Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна.

**2 студзеня** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Кляцкоў Мікалай Васілевіч, педагог, краязнаўца, другі сакратар Дубровенскага райкама ЛКСМБ (1967–1971), старшыня Дубровенскага гарадскога савета дэпутатаў (1971–1974), настаўнік геаграфіі СШ № 2 г. Дуброўна (1974–2000), ураджэнец в. Крапіўна Аршанскага раёна.

**2 студзеня** – 80 гадоў таму (1944) нарадзіўся Напрэенка Уладзімір Пятровіч, беларускі акварэліст, член Беларускага саюза мастакоў. Атрымаў адукацыю ў Віцебскім педагагічным інстытуце. Ураджэнец в. Антонаўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

**2 студзеня** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Андрэйчанка Уладзімір Паўлавіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, у 1994–2008 гадах – старшыня Віцебскага абласнога



Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Быў камандзірам узвода 28-га асобнага батальёна хімічнай абароны 70-й арміі 2-га Беларускага фронту. Пасля вайны вучыўся ў Ваеннай акадэміі, якую пакінуў, каб заняцца літаратурнай працай. У 1955 годзе скончыў філалагічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава. Некалькі гадоў працаваў у рэдакцыі «Піянерскай праўды». Пачаўшы друкавацца ў 1947 годзе, адразу вызначыў сваю тэму ў літаратуры: уся яго творчасць прысвечана інтэрнацыяналізму і дружбе народаў.

Аляксандр Цвярскі вядомы як даследчык творчасці знакамітага турэцкага паэта (іх звязвала вялікае сяброўства) Назыма Хікмета. Поўнае небяспекі жыццё гэтага выдатнага чалавека, які доўгія гады правёў у турме, яго барацьба і яго палымяныя вершы знайшлі адлюстраванне ў першай кнізе апавяданняў А. Цвярскога «Песня над Басфорам». Кніга пабачыла свет у 1959 годзе тыражом 90000 экзэмпляраў і вытрымала 7 перавыданняў.

Другой кнігай А. Цвярскога стала аповесць «Турэцкі марш». Яна прысвечана падзеям, якія адбываліся ў апошні передваенны год і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі. Аповесць амаль аўтабіяграфічная: у апісанні горада Віцязя няцяжка ўлавіць рысы роднага пісьменніку Віцебска, а школа, пра якую ідзе гаворка, – гэта тая самая школа, дзе ён вучыўся. Упершыню аповесць была надрукавана выдавецтвам «Дзіцячая літаратура» ў 1965 годзе тыражом 75 тысяч экзэмпляраў. Атрымала ў цэнтральным друку высокую адзнаку вядомых літаратараў краіны за яе мастацкія вартасці і за гнеўнае гарачае выкрыццё нацызму і расізму. Герояў аповесці, маладых людзей – Марка, Алега, Кацю, Агеньчыка, якія пасля заканчэння школы апынуліся на акупаванай фашыстамі зямлі, аб’яднала ў барацьбе з агульным ворагам непарушнае інтэрнацыянальнае сяброўства. Праз іх А. Цвярскі вядзе чытача ў яўрэйскае гета, куды трапляе Марк (галоўны герой, прататыпам якога з’яўляецца сам аўтар), у партызанскі атрад, у камсамольскае падполле, дзе юнакі супрацьстаяць здрадніку Грандту, учарашняму любімаму настаўніку дзесяцікласнікаў. Аўтар, ствараючы тую ці іншую выяву,

17. **Мезенцев, В.** Трудовая слава / В. Мезенцев // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2019. – 19 сак. – С. 2.

18. **Тригорлов, Е.** Женщина из Партизановки / Е. Тригорлов // Знаменосцы трудовой славы / сост. Г. С. Гужва, В. Г. Скопа, Е. Я. Рыклин. – Минск : Беларусь, 1984. – С. 190–192.

19. **Трыгорлаў, Я.** Вялікае жыццё: дэлегаты XXV з’езда КПСС / Я. Трыгорлаў // Віцебскі рабочы. – 1976. – 23 студз. – С. 2–3.

20. **Уладзіміраў, Н.** Гераіня з Партызанаўкі / Н. Уладзіміраў // Віцебскі рабочы. – 1975. – 8 сак. – С. 2.

21. **Шмерлінг, Л.** Яркае жыццё / Л. Шмерлінг // Ленінская праўда (Віцебск). – 1979. – 15 сак. – С. 2.

# Красавік



**ЦВЯРСКІ**
**АЛЯКСАНДР ДАВЫДАВІЧ**
*100 год з дня нараджэння*
*(1924)*

**Цвярскі Аляксандр Давыдавіч** (1924–1990) – савецкі пісьменнік, паэт, перакладчык, сцэнарыст, ураджэнец Беларусі. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1960 года.

Нарадзіўся 12 красавіка 1924 года ў Віцебску ў сям’і ўрача Давіда Мееравіча Цвярскога. У 1941 годзе скончыў сярэднюю школу № 10 г. Віцебска, у 1944 годзе – Вольскае ваеннае вучылішча хімічнай абароны.



выканаўчага камітэта. Ганаровы грамадзянін г. Віцебска (2023). Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. З 2008 г. – старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвертага, пятага, шостага, сёмага скліканняў. Ураджэнец в. Мар’янова Лёзненскага раёна.

**2 студзеня** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Яленскі Мікалай Георгіевіч, беларускі вучоны ў галіне педагогікі і філалогіі, доктар педагагічных навук, прафесар, ураджэнец в. Акунёва Мёрскага раёна.

**4 студзеня** – 130 гадоў таму (1894) нарадзіўся Пугачэўскі Палікарп Восіпавіч (1894–1939), военачальнік, камбрыг, ураджэнец в. Чарневічы Дзісенскага павета (цяпер у Глыбоцкім раёне).

**4 студзеня** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Ільніцкі Мікалай Мікалаевіч (1949–2006), музейны работнік, краязнаўца, дырэктар Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка (1994–2006), ураджэнец в. Баранава Полацкага раёна.

**5 студзеня** – 255 гадоў таму (1769) нарадзіўся Вітгенштэйн Пётр Хрысціянавіч (1769–1843), расійскі ваенны дзеяч, удзельнік вырашальных баёў у Айчынную вайну 1812 г. на тэрыторыі Беларусі (Полацкай бітвы і інш.), генерал-фельдмаршал. Ураджэнец г. Нежын, паводле іншых звестак г. Пераяслаў-Хмяльніцкі (Украіна).

**5 студзеня** – 225 гадоў таму (1799) нарадзіўся Сямашка Іосіф (1799–1868), уніяцкі і праваслаўны дзеяч Расійскай імперыі, ініцыятар і актыўны ўдзельнік Полацкага царкоўнага сабора (1839), які прыняў рашэнне аб далучэнні ўніяцкай царквы да праваслаўнай. З 1829 г. – вікарны епіскап мсціслаўскі Полацкай уніяцкай архіепархіі. Ураджэнец с. Паўлаўка Ліпавецкага пав. Кіеўскай губерні (цяпер у Вінніцкай вобласці, Украіна).

**5 студзеня** – 60 гадоў таму (1964) нарадзіўся Канстанцінаў Валерый Міхайлавіч, беларускі вучоны ў галіне матэрыялазнаўства сплаваў для ахоўных пакрыццяў, тэрмічнай і хіміка-тэрмічнай апрацоўкі металаў і сплаваў, доктар тэхнічных навук, ураджэнец г. Полацка.

**6 студзеня** – 175 гадоў таму (1849) нарадзіўся Сямеўскі Васіль Іванавіч (1849–1916), гісторык, эканаміст, грамадскі дзеяч, ураджэнец г. Полацка.

**7 студзеня** – 135 гадоў таму (1889) нарадзіўся Данілаў Сцяпан Мікалаевіч (1889–1978), вучоны ў галіне арганічнай хіміі, член-карэспандэнт АН СССР, кавалер двух ордэнаў Леніна, ордэна «Знак Пашаны», ураджэнец г. Віцебска.

**7 студзеня** – 60 гадоў таму (1964) нарадзіўся Бышнёў Ігар Іванавіч, беларускі вучоны-арнітолаг, эколаг, кандыдат біялагічных навук, рэжысёр, сцэнарыст, аператар дакументальнага кіно. У 1985–1999 гг. працаваў у Бярэзінскім біясферным запаведніку. Аўтар тэлеперадачы «Мільён



Работніца і сялянка. – 1975. – № 4. – С. 10–11.

7. **Карпенка, Л.** Жыве ў вёсцы герой: расказваюць юнкоры Запольскай сярэдняй школы / Л. Карпенка // Ленінская праўда (Віцебск). – 1981. – 20 кастр. – С. 4.

8. **Курносава, Н.** Вера ў будучыню / Н. Курносава // Ленінская праўда (Віцебск). – 1976. – 24 лют. – С. 3.

9. **Курносава, Н.** Давер’е апраўдаю / Н. Курносава // Ленінская праўда (Віцебск). – 1975. – 11 сак. – С. 3.

10. **Курносава, Н.** Партыі роднай сардэчнае дзякуй / Н. Курносава // Ленінская праўда (Віцебск). – 1975. – 13 лют. – С. 1.

11. **Курносава** Настасся Захараўна // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1981. – Т. 5 : Біяграфічны даведнік. – С. 347.

12. **Курносава** Настасся Захараўна // Памяць: Віцебскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: А. П. Красоўскі [і інш.] ; уклад. У. І. Мезенцаў ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. – С. 674.

13. **Курносова** Анастасия Захаровна // Женщины Белоруссии – Герои Социалистического Труда: альбом-фотовыставка / авт. текста А. Б. Адамович [и др.]. – Минск : Беларусь, 1975. – [Л. 11].

14. **Курносова** Анастасия Захаровна // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 15.

15. **Курносова** Анастасия Захаровна // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич [и др.]. – Витебск : Витебская областная типография, 2009. – С. 264.

16. **Курносова** Анастасия Захаровна // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биографический справочник / сост. И. Н. Кулан, В. И. Козак, Е. Е. Соколов ; под общ. ред. А. Н. Новикова. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2014. – С. 138.

самаадданай працай Анастасія Захараўна ўносіла важкі ўклад у новыя працоўныя здзяйсненні гаспадаркі. Яе, да самага выхаду на пенсію, па праве называлі правафлангавай пяцігодкі. На заслужаны адпачынак ветэран працы А. З. Курносава пайшла ў 1979 годзе. Персанальны пенсіянер саюзнага значэння не парывала сувязей з родным калгасам, была частым госцем у школьнікаў.

Памерла Анастасія Захараўна Курносава 14 мая 1992 года.

Узнагароджана ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі, у тым ліку бронзавым медалём ВДНГ СССР. Адзначана ганаровымі граматамі Віцебскага абкама КПБ і аблвыканкама, Віцебскага райкама КПБ і райвыканкама. А. З. Курносава неаднаразова абіралася дэпутатам Віцебскага абласнога і раённага Саветаў дэпутатаў працоўных (з 1977 года – народных дэпутатаў), членам Віцебскага райкама кампартыі Беларусі. Была дэлегатам III з’езда калгаснікаў Беларусі (1970), XXV з’езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза (1976).

Да 1992 года лепшай свінарцы, якая першынствавала ў раённым спаборніцтве, уручаўся пераходзячы прыз імя Анастасіі Захараўны Курносавай.

***Біяграфія прадстаўлена краязнаўцам Канстанцінам Гайдуковым***

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Бельская, Г.** Сустрэча з героямі працы / Г. Бельская, Т. Андрэева // Ленінская праўда (Віцебск). – 1978. – 19 кастр. – С. 2.
2. **Бохан, Х.** Прыклад камуніста / Х. Бохан // Віцебскі рабочы. – 1976. – 31 сак. – С. 1.
3. **Евгеньева, С.** Непросто семье Героя / С. Евгеньева // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2004. – 22 мая. – С. 2.
4. **Ермалаеў, М.** Вялікае жыццё: дэлегат з’езда / М. Ермалаеў // Ленінская праўда (Віцебск). – 1976. – 15 студз. – С. 2.
5. **Залатая** Зорка – Герою працы // Віцебскі рабочы. – 1975. – 12 лют. – С. 1.
6. **Каралёва, В.** Толькі сэрцам пачую… / В. Каралёва //




| | |
|---|---|
| | пытанняў пра прыроду» на тэлеканале «Мір». Лаўрэат Спецыяльнай Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне кіно і тэлебачання (2003, 2006). Ураджэнец в. Халаме’е Гарадоцкага раёна. |
| **8 студзеня** – 125 гадоў | таму (1899) нарадзіўся Башко Язэп Станіслававіч (1889–1946), ваенны лётчык, Георгіеўскі кавалер, ураджэнец в. Кастырэ Дзвінскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Латвіі). |
| **8 студзеня** – 105 гадоў | таму (1919) выйшаў у свет артыкул «Художественные заметки» Марка Шагала. |
| **8 студзеня** – 100 гадоў | таму (1924) нарадзіўся Савіцкі Алесь (сапр. Аляксандр Ануфрыевіч; 1924–1915), беларускі пісьменнік, дзяржаўны дзеяч, ганаровы грамадзянін г. Полацка, ураджэнец г. Полацка. |
| **8 студзеня** – 70 гадоў | таму (1954) скасавана Полацкая вобласць – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР. |
| **9 студзеня** – 155 гадоў | таму (1869) нарадзіўся Пшчолка Аляксандр Раманавіч (1869–1943), пісьменнік, публіцыст, этнограф, фалькларыст, ураджэнец в. Чарсцвяды Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер ва Ушацкім раёне). |
| **9 студзеня** – 115 гадоў | таму (1909) нарадзілася Осіпава Марыя Барысаўна (1909–1999), удзельніца Мінскага камуністычнага падполля і партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1943), ураджэнка в. Серкавіцы Магілёўскай губерні (цяпер у Талачынскім раёне). |

**10 студзеня** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Гейнэ Аркадзь Андрэевіч (1919–1942), паэт, ураджэнец г. п. Бешанковічы.

**10 студзеня** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Сачак Міхаіл Рыгоравіч (1929–2020), беларускі вучоны ў галіне хірургіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Ганаровы акадэмік беларускай медыцынскай акадэміі. Ураджэнец в. Варонічы Гродзенскай вобласці. З 1966 г. працаваў у Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. У 1979–1996 гг. – рэктар Віцебскага медыцынскага інстытута. Узнагароджаны знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь». Кавалер ордэна «Знак Пашаны». Ганаровы грамадзянін горада Віцебска. Лаўрэат ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2013».

**11 студзеня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Зюлькоў Пётр Маркавіч (1924–1944), Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Камандзір узвода кіравання батарэі мінамётнага палка ў баі за в. Трылесіна Шумілінскага раёна карэкціраваў агонь батарэі (1944), ураджэнец в. Конаўка Калужскай вобласці (Расія).

**11 студзеня** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Паўлава Ала Іванаўна, педагог, краязнаўца, настаўнік гісторыі Ноўкінскай СШ Віцебскага раёна (1984–2010), ураджэнка г. Эйшышкес (Літва).



перадавала на адкорм. За поспехі, дасягнутыя ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і выкананні пяцігадовага плана продажу дзяржаве прадуктаў жывёлагадоўлі, была ўзнагароджана ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

Падчас дзявятай пяцігодкі (1971–1975) А. Курносава ўпэўнена выйшла на больш высокія паказчыкі і замацавала іх. Уключыўшыся ва Усесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне planaў пяцігодкі, яна прыняла абавязацельствы атрымаць за гэты перыяд 1060 парасят ад замацаванай групы свіней. Асабістую пяцігодку выканала датэрмінова, атрымаўшы і выгадаваўшы да адкорму 1556 жывёл. За датэрміновае выкананне народнагаспадарчага плана 1974 г. імя перадавой свінаркі, майстра жывёлагадоўлі 1-га класа, было занесена на абласную Дошку Гонару. Высокапрадукцыйная праца Анастасіі Захараўны па вырошчванні маладняку дазволіла калгасу «Расія» даваць дзяржаве больш высакаякаснага мяса. Толькі за 1974 год у гаспадарцы павялічылі вытворчасць і рэалізацыю свініны ўтрая больш, чым у папярэднім.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 10 лютага 1975 года за выдатныя поспехі, дасягнутыя ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, і праяўленую працоўную доблесць у датэрміновым выкананні заданняў дзявятай пяцігодкі і прынятых абавязацельстваў па павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі Курносавай Анастасіі Захараўне было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля «Серп і Молат».

Да пачатку дзясятай пяцігодкі (1976–1980) свінаферма калгаса «Расія» патрабавала карэннай рэканструкцыі і механізацыі. Згодна з новай спецыялізацыі сельгаспрадпрыемства (цяпер – сельскагаспадарчае аддзяленне «Навасёлкі» ААТ «Віцебская бройлерная фабрыка»), а менавіта вырошчванне маладняку буйной рагатай жывёлы, ферма ў бліжэйшай перспектыве падлягала ліквідацыі. Але «Расія» павінна была даваць прадукцыю, выконваць планавыя заданні і прынятыя абавязацельствы па продажу дзяржаве прадуктаў жывёлагадоўлі. Сваёй

раёна захопнікі нанеслі яму вялізныя страты. Пацярпелі і жыхары Жыраспёраў, дзе ацалела толькі 16 дамоў з 53 даваенных.

Пасля вызвалення вёскі ў лістападзе 1943 года А. Курносава прымала ўдзел у аднаўленні калгаснай гаспадаркі. Тады ж пайшоў на фронт і загінуў (прапаў без вестак) яе бацька. У гэты перыяд, у толькі што створаную Суражскую машынна-трактарную станцыю тэрмінова патрабаваліся трактарысты. Ішла вайна, і большасць мужчын ваявалі на фронце. Анастасія Курносава паступіла і да лета 1944 года скончыла курсы трактарыстаў пры раённай МТС. Старанная, працавітая дзяўчына-трактарыст была заўважана кіраўніцтвам мясцовага калгаса. Ёй было прапанавана перайсці працаваць у калгас – спачатку на малочнатаварную ферму, затым на свінагадоўчую. Галіне жывёлагадоўлі Анастасія Захараўна прысвяціла 35 гадоў працоўнай біяграфіі. На працы яна праявіла самыя лепшыя рысы свайго характару і дзелавыя якасці.

Спасцігаць тонкасці прафесіі жывёлавода ёй давялося ва ўмовах, калі на свінаферме адсутнічала механізацыя і ўся работа выконвалася ўручную. Анастасія Захараўна займалася самаадукацыяй, вывучала перадавы вопыт, ужываючы ўсё новае і прагрэсіўнае на практыцы. Аптымальныя ўмовы ўтрымання і добры догляд за жывёламі, умелае кармленне, да грамаў улічаны рацыён і вывераны па гадзінах рэжым, далі выдатныя вынікі. А. Курносава выйшла на перадавыя пазіцыі ў сацыялістычным спаборніцтве сярод жывёлаводаў раёна. Пачынаючы з восьмай пяцігодкі (1966–1970) вынік нялёгкай, настойлівай працы Анастасіі Захараўны, якую перавялі свінаркай у новы адкормачны цэх, ішоў па ўзыходзячай. Разам з П. А. Грыбанавай і А. Ф. Лявонавай яна стала наглядаць свінаматак, прымаць апарасы, вырошчваць маладняк і ў двухмесячным узросце перадаваць яго ў групу дарошчвання. А. Курносава паспяхова асвоіла работу на рэканструяванай вытворчасці. Па ініцыятыве перадавой калгасніцы ў цэху былі ўстаноўлены электраабагравальныя лямпы для парасят, абсталяваны спараныя станкі для падкорму жывёл. Яна больш за іншых у гаспадарцы атрымлівала парасят, усіх, да аднаго, вырошчвала і



**12 студзеня** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Дзям'янаў Анатоль Рыгоравіч, работнік лясной гаспадаркі, поўны кавалер ордэна Працоўнай Славы. Працаваў вадзіцелем Полацкага леспрамгаса, ураджэнец г. п. Обаль Шумілінскага раёна.

**13 студзеня** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Завадскі Уладзімір Георгіевіч (1919–1992), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Оршы.

**14 студзеня** – 80 гадоў таму (1944) нарадзіўся Барздыка Міхаіл Фёдаравіч, беларускі мастак, графік, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец в. Шклянцы Докшыцкага раёна.

**15 студзеня** – 125 гадоў таму (1899) нарадзіўся Скальскі Сцяпан Уладзіміравіч (1899–1972), беларускі акцёр. З 1926 г. па 1965 г. працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

**15 студзеня** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Фамін Яўхім Майсеевіч (1909–1941), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, адзін з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці (1941), ураджэнец в. Калышкі Віцебскага павета (цяпер у Лёзненскім раёне).

**15 студзеня** – 90 гадоў таму (1929) нарадзілася Ліліна Злата Юнаўна (1882–1929), прафесар, рэвалюцыянерка, дзеяч міжнароднага жаночага руху, ураджэнка г. п. Друя.

**15 студзеня** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Башлакоў Юрый Андрэевіч, беларускі вучоны-гісторык, ураджэнец г. Оршы.

**16 студзеня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Кірычук Васіль Паўлавіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец с. Славацічы Валынскай вобл. (Украіна).

**16 студзеня** – 70 гадоў таму (1954) нарадзілася Кухарэнка Ніна Уладзіміраўна, беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ураджэнка г. Паставы.

**18 студзеня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Смірноў Уладзімір Яфімавіч (1924–1943), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. Камандзір аддзялення старшы сяржант Смірноў загінуў у баі за в. Шумшына Лёзненскага раёна. Ураджэнец г. Барнаула (Расія).

**18 студзеня** – 75 гадоў таму (1949) нарадзілася Круцько Эльвіра Ціханаўна, беларускі вучоны ў галіне хіміі і тэхналогіі палімерных матэрыялаў, доктар тэхнічных навук, кандыдат хімічных навук, прафесар, ураджэнка г. п. Бешанковічы.

**19 студзеня** – 85 гадоў таму (1939) нарадзілася Мархель Таццяна Рыгораўна, актрыса, народная артыстка Беларусі. У 1970–1986 гг. працавала ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

**20 студзеня** – 105 гадоў таму (1919) пачаліся заняткі ў «Вольнай майстэрні» М. Шагала ў Віцебскім народным мастацкім вучылішчы.

**23 студзеня** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Ідаль Эдуард Антонавіч (парт. псеўданім Андрэй; 1909–1938), дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.



# *Сакавік*



## КУРНОСАВА АНАСТАСІЯ ЗАХАРАЎНА

*100 год з дня нараджэння*

*(1924)*

**Курносава Анастасія (Настасся) Захараўна** (1924–1992) – жывёлавод, Герой Сацыялістычнай Працы. З 1944 г. – свінарка калгаса «Расія» Віцебскага раёна Віцебскай вобласці.

Нарадзілася 22 сакавіка 1924 года ў в. Жыраспёры Казакоўскай воласці Веліжскага павета (цяпер в. Партызанаўка Запольскага сельсавета Віцебскага раёна) у сялянскай сям'і Захара Віктаравіча і Ірыны Фёдараўны Курносавых. Атрымала толькі пачатковую адукацыю, скончыўшы чатыры класы Жырасперскай пачатковай школы. З 1935 года, ва ўзросце 11 гадоў, пачала працаваць паляводам у мясцовым калгасе, дапамагала маці даглядаць калгасную жывёлу.

У гады Вялікай Айчыннай вайны сям'я Курносавых знаходзілася на акупаванай ворагам тэрыторыі раёна. З утварэннем у лютым 1942 года Віцебскіх (Суражскіх) «варот» – вёска Жыраспёры апынулася ў цэнтры партызанскай зоны 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Тут дзейнічала савецкая ўлада. Анастасія Курносава разам з аднавяскоўцамі працавала ў калгасе. Нямецка-фашысцкія захопнікі імкнуліся ліквідаваць партызанскую зону і самі «вароты». Мясцовым жыхарам давялося перажыць не адну карную аперацыю. За 26 месяцаў акупацыі Суражскага

8. **Лазоўская, Б.** Мастак Уладзімір Гоманаў / Б. Лазоўская // Голас Сенненшчыны. – 2009. – 31 студз. – С. 8.

9. **Лазука, Б. А.** Гоманаў Уладзімір Кірылавіч / Б. А. Лазука // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал.: У. У. Андрыевіч [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2012. – Т. 3 : Г–З. – С. 81.

10. **Лазуко, Б. А.** Гомонов Владимир Кириллович / Б. А. Лазуко // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2006. – Т. 3 : Герасименко–Картель. – С. 118.

11. **Лях, Е.** Говорящие пейзажи / Е. Лях // Лепельскі край. – 2012. – 21 снеж. – С. 5.

12. **Мышкавец. І. В.** Гоманаў Уладзімір Кірылавіч // Максім Багдановіч : энцыклапедыя / склад. І. У. Саламевіч, М. В. Трус ; рэдкал.: Т. У. Бялова (гл. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2011. – С. 175.

13. **Салавей, Л. Ф.** Гоманаў Уладзімір Кірылавіч / Л. Ф. Салавей // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1997. – Т. 5 : Гальцы–Дагон. – С. 330.

14. **Фатыхава. Г. А.** Гоманаў Уладзімір Кірылавіч // Францыск Скарына : энцыклапедыя / [пад нав. рэд. Г. Я. Галенчанкі, А. А. Сушы]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 2017. – С. 131.

15. **Яўгенаў, А.** Уладзімір Гоманаў: чалавек, творца, сенненец / А. Яўгенаў // Голас Сенненшчыны. – 2014. – 8 лют. – С. 1, 5.



**23 студзеня** – 105 гадоў тому (1919) у Браславе адбылася першая канферэнцыя сялянскіх, рабочых і батрацкіх дэпутатаў.

**23 студзеня** – 65 гадоў таму (1959) нарадзіўся Каплякоў Сяргей Віктаравіч, беларускі спартсмен (плаванне вольным стылем), майстар спорту СССР міжнароднага класа (1976), заслужаны майстар спорту СССР (1979), чэмпіён XXII Алімпійскіх гульняў (1980), сярэбраны прызёр XXI Алімпійскіх гульняў (1976), прызёр чэмпіянатаў свету, чэмпіён Еўропы, трэнер, ураджэнец г. Оршы.

**23 студзеня** – 55 гадоў таму (1969) на I Віцебскай абласной канферэнцыі прафсаюза рабочых нафтавай і хімічнай прамысловасці была створана Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў хімічнай, горнай і нафтавай галін прамысловасці.

**24 студзеня** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Кротава Наталля Уладзіміраўна, прафсаюзны работнік. З 1994 г. – спецыяліст, вядучы, галоўны спецыяліст Віцебскага абласнога камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў спажыўкааперацыі, з 2002 г. – намеснік дырэктара. З верасня 2007 г. – старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў спажывецкай кааперацыі. Ураджэнка в. Прудзіны Крупскага раёна Мінскай вобласці.

**25 студзеня** – 100 гадоў таму (1924) у Віцебску адкрыўся Прамысловы банк.

| | |
|---|---|
| **25 студзеня** – 65 гадоў | таму (1959) нарадзіўся Вінніца Генадзь Рувімавіч, краязнавец, першы гісторык аршанскага яўрэйскага таварыства, ураджэнец г. Оршы. |
| **26 студзеня** – 460 гадоў | таму (1564) на рацэ Ула каля г. Чашнікі адбылася Ульская бітва 1564, Чашніцкая бітва, бітва паміж войскамі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы ў часы Інфлянцкай вайны 1558–1582. |
| **27 студзеня** – 110 гадоў | таму (1914) нарадзіўся Асмалоўскі Міхаіл Сцяпанавіч (1914–1977), беларускі архітэктар. У 1950 г. займаўся планіроўкай вёскі Лукомль Чашніцкага раёна. |
| **27 студзеня** 105 гадоў | таму (1919) нарадзіўся Альшэўскі Мікалай Міхайлавіч (1919–1944), Герой Савецкага Саюза. Камандзір танка малодшы лейтэнант вызначыўся ў баі за раз'езд Пагост Аршанскага раёна, ураджэнец п. Сквіра (цяпер горад) Кіеўскай вобласці (Украіна). |
| **28 студзеня** – 105 гадоў | таму (1919) адбылося афіцыйнае адкрыццё Віцебскага народнага мастацкага вучылішча (Народнай мастацкай школы) (з 1920 г. – Дзяржаўныя майстэрні, з 1921 г. – мастацка-практычны інстытут, з 1923 г. – Віцебскі мастацкі тэхнікум, у 1939–1941 гг. – Віцебскае мастацкае вучылішча). |
| **28 студзеня** – 80 гадоў | таму (1944) нарадзіўся Вінаградаў Міхаіл Кліменцьевіч (1944–2020), заслужаны архітэктар Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2004, 2008), ураджэнец в. Навасады Чашніцкага раёна. |



Мастак часта прыязджаў у г. Сянно. Уладзімір Гоманаў марыў аб стварэнні мастацкага музея ў родным горадзе, але заўчасная смерць перашкодзіла гэтаму. Памёр Уладзімір Кірылавіч Гоманаў 20 лістапада 1998 года. Праз год сын мастака Леанід Уладзіміравіч падараваў гораду шэраг твораў бацькі. 4 снежня 1999 года ў г. Сянно адкрылася мастацкая галерэя Уладзіміра Кірылавіча Гоманава. якая з 2013 г. размяшчаецца ў левым крыле першага паверха Сенненскага гісторыка-краязнаўчага музея.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Бынькоў, А.** Узгадаваны на сенненскіх краявідах / А. Бынькоў // Витебские вести. – 2014. – 20 февр. – С. 24.
2. **Гоманаў** Уладзімір Кірылавіч // Беларускі саюз мастакоў: 1938–1998 : энцыклапедычны даведнік / аўт.-склад.: Б. А. Крэпак [і інш.]. – Мінск : ВТАА «Кавалер Паблішэрс», 1998. – С. 131.
3. **Гоманаў** Уладзімір Кірылавіч // Памяць: Сенненскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.] ; уклад. С. В. Шайко ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Паліграфафармленне, 2003. – С. 548.
4. **Гоманаў** Уладзімір Кірылавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1986. – Т. 2 : Габой–Карціна. – С. 112–113.
5. **Гоманаў** Уладзімір Кірылавіч // Янка Купала : энцыклапедыя / рэдкал.: У. У. Андрыевіч і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017. – Т. 1 : А–З. – С. 249.
6. **Гоманаў** Уладзімір Кірылавіч // Яны нарадзіліся на Сенненшчыне : біяграфічны даведнік / склад. А. В. Бараноўскі. – Віцебск : ВДУ імя Машэрава, 2016. – С. 42–43.
7. **Іўеў, Л.** Ён пісаў сэрцам / Л. Іўеў // Голас Сенненшчыны. – 2000. – 26 лют. – С. 2 ; 28 сак. – С. 2 ; 16 мая. – С. 3 ; 5 ліп. – С. 3.

выкладаў у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. У 1967 г. стаў членам Беларускага саюза мастакоў. У 1990 г. атрымаў званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі».

Творчасць Уладзіміра Гоманава фарміравалася ў канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. Ён працаваў у розных жанрах станковага жывапісу: пісаў сюжэтна-тэматычныя кампазіцыі, пейзажы, партрэты, нацюрморты. Вялікае значэнне надаваў шчырасці пачуццяў, дасканаламу вывучэнню жыцця. Мастак імкнуўся вывучаць і знаходзіць у натуры самае характэрнае, тыповае, раскрываць псіхалагічны стан герояў. Паступова У. Гоманаў выпрацоўваў уласны почырк. У сюжэтна-тэматычных кампазіцыях звяртаўся да сімволіка-асацыятыўных, метафарычных вырашэнняў. Часта выкарыстоўваў пейзаж, з дапамогай якога ствараў рамантычна-эпічны настрой сваіх работ. Найбольш значныя творы Уладзіміра Гоманава: «Апошні бой Заслонава» (1964), «А хто там ідзе?» (1969, трыпціх), «9 мая. Ветэраны» (1980), «На сценах старажытнага Слуцка» (1973), «Дажынкі» (1978), «Мой родны кут» (1982), «Свет Скарыны» (1991), «Крыжы зямлі» (1995), «Божа, дапамажы» (1996), серыя «З эцюднікам па Еўропе» (1986) і іншыя. Ён з'яўляецца аўтарам партрэтаў жывёлавода В. А. Данільчыка (1973), драматурга А. Петрашкевіча (1984), Кастуся Каліноўскага («Чорная пятля», 1989) і іншых. Творчасць Уладзіміра Гоманава спалучае лірыку і публіцыстыку. Карціны вызначаюцца чысцінёй колеру, гармоніяй кампазіцыі, народным тыпажом. Творы мастака знаходзяцца ў музеях Беларусі і за яе межамі, у тым ліку ў Расіі, Германіі, Вялікабрытаніі, Іспаніі і іншых краінах.

Уладзімір Кірылавіч Гоманаў, які ў савецкі час ўзначальваў у Беларускім саюзе мастакоў шэфскую камісію па сялу, шмат год прысвяціў прапагандзе выяўленчага мастацтва. Па яго ініцыятыве ў г. Лідзе была арганізавана мастацкая галерэя, якой жывапісец падараваў шэраг уласных твораў. Такіх галерэй у Беларусі было арганізавана больш за дзесяць, у тым ліку ў п. Крынічны Мозырскага раёна Гомельскай вобласці. Галерэя, якая ў далейшым стала філіялам Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.



**29 студзеня** – 100 гадоў тааму (1924) нарадзіўся Баханькоў Арцём Яфімавіч (1924–2001), беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук, прафесар, ураджэнец в. Саламір'е Полацкага раёна.

**29 студзеня** – 85 гадоў таму (1939) нарадзілася Шабунёва Ларыса Яўгенаўна, педагог, краязнаўца, калекцыянер, гісторык, дырэктар Слабодскай СШ Лепельскага раёна, ураджэнка м. Лёзна Віцебскай акругі (цяпер Лёзненскі раён).

**30 студзеня** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Генкін Абрам Львовіч (1909–2001), кандыдат тэхнічных навук, інжынер-віцэ-адмірал, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1962), ураджэнец г. Оршы.

**30 студзеня** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Клімаў Міхаіл Трафімавіч, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны настаўнік рабочай моладзі Беларусі. Працаваў на Аршанскім ільнокамбінаце (1960–1989), ураджэнец в. Міхайлавічы Горацкага раёна Магілёўскай вобласці.

**30 студзеня** – 95 гадоў таму (1929) нарадзілася Каргапольцава Ніна Міхайлаўна, селекцыянер-ільнавод. З 1953 г. працавала навуковым супрацоўнікам у аддзеле селецыі і насенняводства лёну на Беларускай занальнай ільняной вопытнай станцыі (г. Глыбокае), ураджэнка в. Слабодка Туманскага раёна Смаленскай вобласці (Расія).

## Люты

**105 гадоў** таму (1919) сфарміравана віцебская камісія па справах мастацтва і мастацкай прамысловасці.

**100 гадоў** таму (1924) у Віцебску адкрылася калонія для непаўналетніх.

**30 гадоў** таму (1994) у Оршы адкрыты помнік памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія загінулі ў Афганістане.

**2 лютага** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Гоманаў Уладзімір Кірылавіч (1929–1998), беларускі жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец г. Сянно.

**2 лютага** – 65 гадоў таму (1959) нарадзіўся Морхат Віктар Іосіфавіч (1959–2013), беларускі вучоны ў галіне афтальмалогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, вынаходнік СССР. З 1983 г. працаваў у Віцебскім медыцынскім інстытуце (з 1997 г. – загадчык кафедры). Ураджэнец г. Віцебска.

**4 лютага** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Шапо Уладзімір Дзмітрыевіч, беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў, працуе ў станковай графіцы, акварэлі, дэкаратыўна-афарміцельскім мастацтве. Ураджэнец г. п. Відзы Браслаўскага раёна, жыве ў г. Наваполацку.

**5 лютага** – 135 гадоў таму (1889) нарадзіўся Хозераў Іван Макаравіч (1889–1947), расійскі і беларускі мастацтвазнавец, гісторык архітэктуры.



## Люты



**ГОМАНАЎ**

**УЛАДЗІМІР КІРЫЛАВІЧ**

*95 год з дня нараджэння*

*(1929)*

**Гоманаў Уладзімір Кірылавіч** (1929–1998) – беларускі мастак-жывапісец, член Беларускага саюза мастакоў, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

Нарадзіўся 2 лютага 1929 года ў г. Сянно. Але сям’я Гоманавых нядоўга пражыла ў горадзе. Кірыл Лаўрэнцьевіч Гоманаў, бацька будачага мастака, служыў у органах дзяржаўнай бяспекі. Гэта стала прычынай частых пераездаў сям’і. Спачатку па службе ён быў пераведзены з Беларусі ў Туркестан, потым сям’я пераехала ў Крым. У маі 1941 года, напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, маці з сынам Уладзімірам вярнуліся на радзіму ў г. Сянно. У пасляваенны перыяд Уладзімір Кірылавіч стаў студэнтам аднаго з уральскіх фабрычна-завадскіх вучылішчаў. Потым было зноў вяртанне ў Беларусь. На радзіме ўладкаваўся ў Сенненскі раённы Дом культуры, дзе працаваў мастаком і мастацкім кіраўніком самадзейнасці. У 1956 г. скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, у 1962 г. – Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (дыпломная карціна «Працоўны рытм»). Яго педагогамі былі вядомыя жывапісцы Х. Ліўшыц, А. Мазалёў, У. Сухаверхаў, В. Цвірка. З 1962 г. У. Гоманаў пачаў удзельнічаць у мастацкіх выставах. З 1963 па 1978 г.

гісторыі беларускай лінгвістыкі / Д. Дзятко, П. Міхайлаў. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. – С. 243–250.

7. **Булыка, А. М.** Баханькоў Арцем Яфімавіч / Францыск Скарына : энцыклапедыя / [пад нав. рэд. Г. Я. Галенчанкі, А. А. Сушы]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2017. – С. 45–46.

8. **Германовіч, І. К.** Баханькоў Арцем Яфімавіч / І. К. Германовіч // Беларуская мова : энцыклапедыя: А–Я / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1994. – С. 78.

9. **Запрудскі, С. М.** Даследаванне беларускай літаратурнай мовы 1920–1930-х гг. у Беларусі ў савецкі час / С. М. Запрудскі // Веснік БДУ. Серыя 4, Філалогія, журналістыка, педагогіка. – 2016. – № 3. – С. 31–40.

10. **Коласава, Л.** Адданы роднай мове / Л. Коласава // Полацкі веснік. – 2014. – 28 студз. – С. 7.

11. **Крыўко, М.** Яго партрэт у лічбах / М. Крыўко // Літаратура і мастацтва. – 2014. – 24 студз. – С. 7.

12. **Міхайлаў, П. А.** Лексікограф Арцём Баханькоў / П. А. Міхайлаў, С. Фацеева // Роднае слова. – 2014. – № 1. – С. 48–49.

13. **Шчэрбін, В.** Прадстаўнік беларускага лексікаграфічнага мэйнстрыму / В. Шчэрбін // Веды. – 2014.– 3 февр (№ 5). – С. 7.



У 1926 г. разам з М. Шчакаціхіным даследаваў Полацкі Сафійски сабор XI ст. Абследаваў верхнія часткі Полацкай Спаскай царквы XII ст. У 1928 г. правёў раскопкі Барысаглебскай і Пятніцкай цэркваў XII ст. Ураджэнец г. Смаленска (Расія).

**6 лютага** – 60 гадоў таму (1964) нарадзілася Беразоўская Таццяна Дзмітрыеўна, беларуская мастачка, настаўніца, ураджэнка г. Віцебска.

**7 лютага** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Паўлаў Савелій Яфімавіч (1934–2017), пісьменнік, публіцыст, дзяржаўны дзеяч Беларусі, кандыдат гістарычных навук, прафесар Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва. Ураджэнец в. Самуйлы Браслаўскага павета (цяпер у Браслаўскім раёне).

**8 лютага** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Лапо Аркадзь Іванавіч (1904–1983), беларускі вучоны ў галіне селекцыі і раслінаводства. Акадэмік НАН Беларусі (1950), член-карэспандэнт (1940) Акадэміі аграрных навук Беларусі, ураджэнец в. Жданоўка Гарадоцкага павета Віцебскай губерні (цяпер у Шумілінскім раёне).

**9 лютага** – 230 гадоў таму (1794) у Віцебску адкрыта першая бібліятэка (пры Народным вучылішчы).

**9 лютага** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Сцёпін Віктар Аляксандравіч (1919–2007), ваенны дзеяч, Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Шумілінскага і Бешанковіцкага раёнаў у Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец г. Рослаўль Смаленскай губерні.

**10 лютага** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Свіршчэўскі Браніслаў Станіслававіч (1904–1954), савецкі вучоны, прафесар, доктар тэхнічных навук, акадэмік УАСГНІЛ, спецыяліст у галіне механізацыі сельскай гаспадаркі, заснавальнік навуковай дысцыпліны «Эксплуатацыя машынна-трактарнага парку», лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Ураджэнец г. Віцебска.

**10 лютага** – 100 гадоў таму (1924) у сувязі з першым узбуйненнем БССР была ліквідавана Віцебская губерня, частка якой была перададзена Пскоўскай губерні РСФСР.

**10 лютага** – 60 гадоў таму (1964) адкрыты Віцебскі радыётэхнічны тэхнікум, з 1965 – Віцебскі політэхнічны тэхнікум, з 2001 – Віцебскі дзяржаўны політэхнічны тэхнікум, з 2009 – Віцебскі дзяржаўны політэхнічны каледж. З 2016 года – як падраздзяленне Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. У 2021 г. на базе політэхнічнага каледжа і дзяржаўнага прафесійнага ліцэя № 5 прыборабудавання створаны Віцебскі дзяржаўны каледж электратэхнікі.

**11 лютага** – 105 гадоў таму (1919) у Віцебску арганізаваны сімфанічны аркестр.

**12 лютага** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Іафінаў Самуіл Абрамавіч (1909–2002), вучоны ў галіне эксплуатацыі машынна-трактарнага парку, стваральнік навуковай школы, ураджэнец г. Віцебска.



А. Я. Баханькоў плённа працаваў у галіне лексікаграфіі, быў пачынальнікам сучаснай беларускай тлумачальнай і вучэбнай лексікаграфіі. Прымаў удзел як укладальнік, член рэдкалегіі, навуковы рэдактар 5-томнага Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы (1977–1984), «Беларуска-рускага слоўніка» (1988–1989), тлумачальных слоўнікаў беларускай і рускай моў для сярэдняй школы, якія перавыдаваліся звыш 10 разоў. З'яўляўся рэдактарам фразеалагічнага слоўніка Ф. Янкоўскага «Беларуская фразеалогія» (1968). Збіраў лексіку роднай гаворкі на Полаччыне і надрукаваў некалькі яе падборак у дыялектных зборніках, як навуковы рэдактар сам уклаў і адрэдагаваў зборнік «Народнае слова» (1976), планаваў сумесна з М. Суднікам укласці «Слоўнік гаворак Полаччыны».

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, двума медалямі «За адвагу», юбілейнымі медалямі.

Памёр Арцём Яфімавіч Баханькоў 12 жніўня 2001 года.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Баханьков** Артем Ефимович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 37.
2. **Баханьков** Артем Ефимович // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол.: Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2006. – Т. 2 : А–Герань – С. 219–220.
3. **Баханькоў, А. А.** Той самы Баханькоў / А. А. Баханькоў ; гутарыла А. Грышчук // Літаратура і мастацтва. – 2014. – 24 студз. – С. 7.
4. **Баханькоў** Арцем Яфімавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1996. – Т. 2 : Аршыца–Беларусцы. – С. 357.
5. **Баханькоў** Арцем Яфімавіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.]. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 1 : А–Б. – С. 521.
6. **Баханькоў** Арцем Яфімавіч // Мовазнаўцы : нарысы па

Паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную сінтаксісу паўднёва-заходніх гаворак Беларусі. Асноўнымі кірункамі дзейнасці ў акадэмічным інстытуце для А. Я. Баханькова сталі дыялекталогія, лексікалогія, лексікаграфія. У 1986 годзе ён узначаліў аддзел лексікалогіі, лексікаграфіі. Разам з працай у фундаментальнай акадэмічнай навуцы А. Я. Баханькоў шмат сіл аддаваў педагагічнай дзейнасці. Быў старшынёй дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі на філалагічным факультэце БДУ, кіраваў напісаннем дыпломных работ. Для Міністэрства адукацыі і розных выдавецтваў адрэцэнзаваў больш за трыццаці падручнікаў. У 1992 годзе ён быў прызначаны загадчыкам-арганізатарам кафедры беларускай мовы пры Прэзідыуме Акадэміі навук Беларусі і цалкам прысвяціў сябе педагагічнай дзейнасці.

На заслужаны адпачынак Арцём Яфімавіч пайшоў у 1998 годзе.

А. Я. Баханькоў аўтар шматлікіх фундаментальных навуковых прац па лексіцы, дыялекталогіі, гісторыі беларускай мовы, прац энцыклапедычнага характару і рэцэнзій на працы калег. Аднак найбольшы ўнёсак у скарбонку беларускага мовазнаўства зроблены ім у галіне лексікалогіі і лексікаграфіі. У калектыўнай манаграфіі «Гістарычная лексікалогія беларускай мовы» (1970) і манаграфіі «Развіццё лексікі беларускай літаратурнай мовы ў савецкі перыяд: сацыялінгвістычны нарыс» (1982) падрабязна для свайго часу прааналізаваў сацыяльна-эканамічныя і культурна-гістарычныя ўмовы, у якіх адбывалася фарміраванне беларускай нацыі, паказаў залежнасць змяненняў у лексіцы ад сацыяльных і ўнутраных фактараў, даследаваў крыніцы і шляхі ўзбагачэння лексікі новымі словамі: асваенне літаратурнай мовай лексічных багаццяў народных гаворак, выкарыстанне словаўтваральных і семантычных неалагізмаў, ажыўленне ўстарэлых слоў і запазычванне з іншых моў. Пад кіраўніцтвам Арцёма Яфімавіча Баханькова была арганізавана праца над фундаментальным навуковым даследаваннем «Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы», якая была апублікавана асобнай манаграфіяй у 1994 годзе.



**12 лютага** – 80 гадоў таму (1944) нарадзіўся Гіргель Сяргей Сяргеевіч, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, ураджэнец в. Цімошкава Мёрскага раёна.

**14 лютага** – 120 гадоў тому (1904) нарадзіўся Нікалаевіч Аляксей Мікалаевіч (1904–1965), военачальнік, генерал-лейтэнант, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец м. Астроўна Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер аграгарадок у Бешанковіцкім раёне).

**14 лютага** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Яроменка Мікалай Мікалаевіч (1949–2001), акцёр тэатра і кіно, кінарэжысёр, народны артыст Расіі, лаўрэат прэміі УЛКСМ, ураджэнец г. Віцебска.

**15 лютага** – 65 гадоў таму (1959) нарадзіўся Васючэнка Пётр Васілевіч (1959–2019), беларускі празаік, крытык, драматург, літаратуразнаўца, ураджэнец г. Полацка.

**16 лютага** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Заспіцкі Андрэй Міхайлавіч (1924–2019), беларускі скульптар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974, 1977). Аўтар помнікаў Ф. Скарыну ў Полацку, «У гонар вызвалення Віцебска» ў Віцебску (1989, з М. Рыжанковым). Ураджэнец г. Мазавец (Польшча).

**17 лютага** – 105 гадоў таму (1919) нарадзілася Кулакоўская Тамара Нікандраўна (1919–1986), беларускі вучоны ў галіне аграхіміі і глебазнаўства, член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар, акадэмік УАСГНІЛ, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнка г. Полацка.

**17 лютага** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Сяржантаў Іван Якаўлевіч (1919–1943), Герой Савецкага Саюза. У гады Вялікай Айчыннай вайны – лётчык-знішчальнік на Паўднёвым фронце, ураджэнец в. Якаўлевічы Горацкага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Аршанскім раёне).

**17 лютага** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Янчанка Сцяпан Яфімавіч (1924–1999), беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі, ураджэнец в. Анціпенкі Дубровенскага раёна.

**17 лютага** – 90 гадоў таму (1934) заснаваны вучгас «Падбярэззе» Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

**17 лютага** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Шарай Рыгор Сцяпанавіч, краязнаўца, заснавальнік і кіраўнік маладзёжна-пошукавага клуба ЮНЕСКА «Русічы» на базе Аршанскага дзяржаўнага політэхнічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа, ураджэнец г. Оршы.

**18 лютага** – 145 гадоў таму (1879) нарадзіўся Каржанеўскі Мікалай Леапольдавіч (1879–1958), географ, гляцыёлаг, доктар геаграфічных навук, ураджэнец в. Завярэжжа Віцебскай губерні. Аўтар Карты Паміра і Каталога ледавікоў Цэнтральнай Азіі.

**19 лютага** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Аўраменка Валерый Лявонцевіч (1939–2022), харавы дырыжор, выкладчык, прафесар, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у







## БАХАНЬКОЎ АРЦЁМ ЯФІМАВІЧ

*100 год з дня нараджэння*

*(1924)*

**Баханькоў Арцём Яфімавіч**(1924–2001) – беларускі вучоны, мовазнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар.

Нарадзіўся 29 студзеня 1924 года ў в. Саламір'е Полацкага раёна. Пасля заканчэння сямігодкі паступіў у Полацкае педагагічнае вучылішча, якое скончыў у 1941 годзе. У гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся на акупіраванай фашыстамі тэрыторыі: працаваў разам з бацькамі па гаспадарцы, падтрымліваў сувязь з партызанамі. З мая 1943 года – палітрук узвода партызанскага атрада «Бальшавік» брыгады імя К. Варашылава. Пасля прарыву блакады Полацка-Лепельскай партызанскай зоны ў маі 1944 года трапіў у палон. Змог уцячы. І ў верасні 1944 года стаў байцом Чырвонай арміі. Ваяваў з фашыстамі ў складзе Ідрыцкай Чырванасцяжнай дывізіі. Тройчы быў паранены і тройчы за гераізм адзначаны падзякамі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Перамогу сустрэў у Румыніі.

Пасля вайны працаваў у школах Полацкага раёна. У 1955 годзе скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут. Пасля заканчэння аспірантуры педінстытута з 1960 года Арцём Яфімавіч звязаў свой лёс з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук Беларусі.

**30 снежня** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Труфанаў Пётр Цярэнцьевіч (1909–1980), удзельнік вызвалення Бешанковіцкага раёна ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. Ураджэнец с. Баравое Усманскага павета Тамбоўскай губерні (цяпер у Усманскім раёне Ліпецкай вобласці, Расія).

**31 снежня** – 85 гадоў таму (1939) была прынята Дырэктыва аб адкрыцці Лепельскага пяхотнага вучылішча. Вучылішча было сфарміравана ў студзені–лютым 1940 г.



галіне культуры і мастацтва. Узнагароджаны медалём «Ветэран працы», медалём Францыска Скарыны. З 1982 года выкладаў у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, дэкан вакальна-харавога факультэта (1988–2013), быў хормайстрам і мастацкім кіраўніком заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь харавой капэлы Палаца культуры прафсаюзаў (Мінск). Ураджэнец г. Гарадка.

**22 лютага** – 320 гадоў таму (1704) нарадзіўся Вяжбіцкі (Вяржбіцкі) Казімір Юзаф (1704–1755), каталіцкі рэлігійны дзеяч, педагог, прафесар Віленскай акадэміі, ураджэнец Віцебскага ваяводства.

**23 лютага** – 165 гадоў таму (1859) нарадзіўся Ікаў Канстанцін Мікалаевіч (1859–1895), маскоўскі антраполаг, археолаг. У час экспедыцыі ў Мінскую і Віцебскую губерні (1886) сабраў матэрыялы для асноўнай працы па антрапаметрыі беларусаў, рускіх і ўкраінцаў.

**23 лютага** – 145 гадоў таму (1879) нарадзіўся Малевіч Казімір Севярынавіч (1879–1935), мастак, тэарэтык мастацтва, педагог, адзін з заснавальнікаў абстрактнага мастацтва і супрэматызму, у 1919–1922 гг. – выкладчык Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Ураджэнец г. Кіеў (Украіна).

**23 лютага** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Казлоў Арсенцій Яўхімавіч (1919–1971), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Газьба Гарадоцкага раёна.

**23 лютага** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Саевіч Цімафей Аляксандравіч (1919–2003), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. З 1943 г. – на фронце, зрабіў 160 вылетаў на разведку ворага, выяваў на тэрыторыі г. Віцебска і г. Полацка. Ураджэнец в. Сухаполь Архангельскага раёна.

**23 лютага** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Жданко Рыгор Сямёнавіч (1924–1987), дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Крукоўшчына Ушацкага раёна.

**25 лютага** – 125 гадоў таму (1899) нарадзіўся Макавецкі Фёдар Яфрэмавіч (1899–1974), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Багданаўка Аршанскага павета (цяпер у Талачынскім раёне).

**25 лютага** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Лузгін Васіль Іванавіч (1914–1998), партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Ураджэнец в. Дрымаўшчына Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Чашніцкім раёне).

**26 лютага** – 105 гадоў таму (1919) ва Ушачах адкрылася польская нацыянальная школа.



**27 снежня** – 45 гадоў таму (1979) адкрыты рух электравозаў на чыгуначным участку Орша–Вязьма.

**28 снежня** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Васільева Галіна Сцяпанаўна, беларуская мастачка, член Беларускага саюза мастакоў, выкладчык кафедры дызайну Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, дацэнт, ураджэнка г. Полоцка.

**29 снежня** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Хідзекель Лазар Маркавіч (1904–1986), мастак, архітэктар, член авангарднага аб’яднання мастакоў УНОВИС, створанага К. С. Малевічам. Прымаў удзел у віцебскіх акцыях, вулічных праектах, выстаўках, афармляў выданні УНОВИСа (сумесна з І. Чашнікам), ураджэнец г. Віцебска.

**29 снежня** – 95 гадоў таму (1929) прайшоў 1-ы з'езд калгаснікаў Гарадоцкага раёна.

**29 снежня** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Пруднікаў Віктар Сяргеевіч, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, доктар ветэрынарных навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі экалогіі. З 1976 г. працуе ў Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, у 2007–2019 гг. – загадчык кафедры патанатоміі і гісталогіі. Ураджэнец в. Кулішова Буда Смаленскай вобл.

**29 снежня** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Мянжынскі Валерый Станіслававіч, беларускі вучоны-гісторык, археограф, кандыдат гістарычных навук, спецыяліст па Метрыцы ВКЛ. Ураджэнец г. Віцебска.

Сяло пад Віцебскам. Ураджэнец маёнтка Падгайна (знаходзіўся каля в. Гайна Лагойскага раёна Мінскай вобласці).

**24 снежня** – 70 гадоў тому (1954) нарадзіўся Рублеўскі Сяргей Васілевіч, празаік і паэт. У 1990–2008 гг. – галоўны рэдактар абласной газеты «Народнае слова». У 2008–2013 гг. – намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкама, начальнік аддзела па архівах і справаводстве. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама (2003), лаўрэат літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес» (2012). Ураджэнец в. Бабча Лепельскага раёна.

**25 снежня** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Шэлег Анатоль Рыгоравіч (1909–1988), беларускі акцёр, народны артыст Беларусі. З 1931 г. – акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа. Ураджэнец г. Мінска.

**25 снежня** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Пятаковіч Аляксандр Францавіч (1914–1988), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Сянно.

**25 снежня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Курыленка Уладзімір Цімафеевіч (1924–1942), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. З 1941 г. – партызан-падрыўнік атрада І. Шырокава, які дзейнічаў на тэрыторыі Смаленскай вобласці, ураджэнец в. Бабінічы Віцебскага раёна.



**28 лютага** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Кандрашоў Пётр Пятровіч (1924–1998), Герой Сацыялістычнай Працы. Працаваў у галіне сельскай гаспадаркі Віцебскай вобласці. З 1959–1984 – старшыня калгаса «Маладая гвардыя» Мёрскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Славы III ступені, ордэнам «Знак Пашаны», ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Ураджэнец в. Дзямідавічы Клімавіцкага павета Гомельскай губерні (цяпер у Магілёўскай вобласці).

**28 лютага** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Панасюк Уладзімір Андрэевіч (1924–1990) усходазнаўца, мовазнаўца, перакладчык з кітайскай мовы, ураджэнец г. Полацка.

**28 лютага** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Канапацкі Ібрагім Барысавіч (1949–2005), беларускі гісторык, грамадскі і рэлігійны дзеяч. Кандыдат гістарычных навук. Унёс вялікі ўклад у аднаўленне мячэці ў г. п. Відзы Браслаўскага раёна. Ураджэнец г. п. Смілавічы Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці.

# Сакавік

**85 гадоў** таму (1939) адкрыўся Віцебскі абласны Дом народных мастацтваў. З 1980 г. – абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-выхаваўчай работы, з 2006 г. – Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці. Сучасная назва – ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці».

**1 сакавіка** – 95 гадоў таму (1929) нарадзілася Лось Еўдакія Якаўлеўна (1929–1977), паэтэса, аўтар шэрагу зборнікаў, твораў для дзяцей, ураджэнка в. Старына Ушацкага раёна.

**1 сакавіка** – 35 гадоў таму (1989) заснаваны Аршанскі музей гісторыі і культуры горада, у 1992 г. – адкрыты для наведвальнікаў, з 1994 г. – філіял Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны.

**1 сакавіка** – 20 гадоў таму (2004) адкрыўся Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей у аг. Акцябрская Віцебскага раёна.

**3 сакавіка** – 105 гадоў таму (1919) нарадзілася Маршалава Ефрасіння Яфрэмаўна (1919–1999), Герой Сацыялістычнай Працы. З 1944 г. – палявод у калгасе «Наперад!», у 1956–1975 гг. – звеннявая льнаводчага звяна калгаса імя XX з'езда КПСС Дубровенскага раёна. Ураджэнка в. Дзяругі (зараз Каўровае) Дубровенскага раёна.

**3 сакавіка** – 105 гадоў таму (1919) пачаў работу першы губернскі з'езд камсамола.



**21 снежня** – 100 гадоў таму (1924) пачала працаваць Гарадоцкая гідраэлектрастанцыя.

**21 снежня** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Ступень Аляксандр Пятровіч, мастак-афарміцель, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнец г. Полацка.

**21 снежня** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Ізаітка Анатоль Сяргеевіч (1954–2014), беларускі жывапісец, член Беларускага саюза мастакоў. З 1989 г. – мастак Віцебскага камбіната «Мастацтва», ураджэнец г. Полацка.

**23 снежня** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Бераў Міхаіл Залманавіч (сапр. Маісей; 1909–2003), беларускі кінааператар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум (1930). У гады Вялікай Айчыннай вайны быў кінааператарам на Заходнім і 3-м Беларускім франтах. Яго кадры ваенных гадоў былі выкарыстаны ў кінаэпапеі «Вялікая Айчынная». Ураджэнец г. Веліж Веліжскага павета Віцебскай губерні (цяпер г. Веліж Смаленскай вобласці, Расія).

**23 снежня** – 55 гадоў таму (1969) у Чашніцкім раёне ўведзены ў строй 1-ы энергаблок Лукомскай ДРЭС.

**24 снежня** – 240 гадоў таму (1784) нарадзіўся Даленга-Хадакоўскі Зарыян Якаўлевіч (сапраўднае імя – Чарноцкі Адам; 1784–1825), беларускі славяназнавец, адзін з пачынальнікаў беларускай, украінскай, рускай і польскай археалогіі, старажытнай гісторыі, фальклarystыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Вывучаў гарадзішча Старое

**19 снежня** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Пятрэнка Мікалай Макаравіч (1919–1997), дзеяч аматарскага мастацтва, кампазітар, педагог, заслужаны настаўнік Беларусі, ганаровы грамадзянін г. Полацка. З 1960 г. працаваў у Полацкім педагагічным вучылішчы. Ураджэнец в. Барбароў Рэчыцкага павета Гомельскай губерні (цяпер у Мазырскім раёне Гомельскай вобласці).

**20 снежня** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Пузікаў Пётр Дзмітрыевіч (1919–1977), беларускі філосаф, аўтар навуковых прац, доктар філасофскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, ураджэнец в. Падоры Шумілінскага раёна.

**21 снежня** – 130 гадоў таму (1894) нарадзіўся Бердыган Казімір Іосіфавіч (1894–1972), вучоны, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнец в. Паноры Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Верхнядзвінскім раёне).

**21 снежня** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Кашавой Пётр Кірылавіч (1904–1976), савецкі ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945), удзельнік вызвалення Віцебска, Оршы, ураджэнец г. Александрыя Кіраваградскай вобласці (Украіна).

**21 снежня** – 105 гадоў таму (1919) нарадзілася Хейнман Фаіна Барысаўна (1919–?), вучоны ў галіне марфалогіі нервовай сістэмы, доктар медыцынскіх навук, прафесар. У гады Вялікай Айчыннай вайны была франтавым хірургам, капітанам медыцынскай службы. Ураджэнка г. Віцебска.



**3 сакавіка** – 95 гадоў таму (1929) нарадзілася Супрун Лідзія Якаўлеўна (1929–2014), беларускі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. З 1962 г. працавала ў Віцебскім медыцынскім універсітэце. Ураджэнка г. Калінкавічы.

**4 сакавіка** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Собаль Валянцін Енісеевіч, археолаг, кандыдат гістарычных навук, ураджэнец г. Паставы Віцебскай вобласці.

**5 сакавіка** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Філіпенка Леанід Мікалаевіч (1914–2012), Герой Савецкага Саюза, ганаровы грамадзянін г. Віцебска.

**5 сакавіка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Клімчанка Яўген Іванавіч (1924–1989), Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік прамысловасці Беларусі, заслужаны настаўнік рабочай моладзі, ураджэнец в. Лагаўшчына Талачынскага раёна.

**5 сакавіка** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Бадзягін Уладзімір Іванавіч (1934–2002), спартсмен па пяцібор'і, трэнер па футболе. Заслужаны трэнер БССР, чэмпіён II Спартакіяды БССР па сучасным пяцібор'і, з 1958 г. – трэнер Віцебскага абласнога савета ДСТ «Чырвонае Знамя», з 1960 г. – старшы трэнер, з 1975 г. – кіраўнік футбольнай каманды «Дзвіна» (Віцебск). Ураджэнец г. Віцебска.

**6 сакавіка** – 155 гадоў таму (1869) нарадзіўся Арленеў Павел Мікалаевіч (сапр. Арлоў; 1869–1932), рускі акцёр. У 1889–1890 гг. – у складзе рускай тэатральнай трупы працаваў у Полацку.

**6 сакавіка** – 60 гадоў таму (1964) нарадзіўся Міхно Уладзімір Фёдаравіч (1964–2019), журналіст, пісьменнік, краязнаўца, ураджэнец в. Чэрцы Лепельскага раёна.

**7 сакавіка** – 140 гадоў таму (1884) у Санкт-Пецярбургу нарадзіўся Цшохер Альфрэд Аскаравіч, з 1919 г. – эмісар Віцебскай музычнай акругі, з 1921 г. выкладаў гісторыю музыкі ў Віцебскай народнай кансерваторыі, у 1932 г. вярнуўся ў Санкт-Пецярбург.

**7 сакавіка** – 100 гадоў таму (1924) Віцебск наведаў рускі пісьменнік А. М. Талстой.

**7 сакавіка** – 80 гадоў таму (1944) у Віцебску адкрыўся абласны Дом дзіцяці.

**8 сакавіка** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Крэмень Анатоль Сцяпанавіч (1929–2021), Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны будаўнік Беларусі, будаўнік Віцебскага будаўнічага трэста № 9, наваполацкага трэста № 16. Ураджэнец в. Любін, Пухавіцкага раёна.

**9 сакавіка** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Дзежыц Валянцін Канстанцінавіч (1904–1964), беларускі жывапісец, педагог. У 1931–1941 гг. – выкладчык мастацкага вучылішча ў Віцебску, з 1948 г. – Віцебскага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава. Ураджэнец г. Хельсінкі (Фінляндыя).



**13 снежня** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Варонін Мікалай Мікалаевіч (1904–1976), расійскі археолаг, гісторык мастацтва, доктар гістарычных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Ленінскай прэміі. Вывучаў збудаванні і фрэскі Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра каля Полацка, ураджэнец г. Уладзімір (Расія).

**14 снежня** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Макаранка Уладзімір Сцяпанавіч (1929–2005), вучоны ў галіне паталагічнай фізіялогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ураджэнец г. Віцебска.

**15 снежня** – 130 гадоў таму (1894) нарадзіўся Юдовін Саламон Барысавіч (Шлоймэ Барухавіч) (1894–1954), мастак, аўтар прац у станкавай і кніжнай графіцы, экслібрысе. Ураджэнец мястэчка Бешанковічы Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер г. п. Бешанковічы Бешанковіцкага раёна).

**16 снежня** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Анцімонаў Леанід Сяргеевіч (1934–2012), беларускі графік, жывапісец, педагог, у 1964–2005 гг. выкладаў у ВДУ імя П. М. Машэрава, ураджэнец в. Куляшы Сенненскага раёна.

**17 снежня** – 135 гадоў таму (1889) нарадзіўся Васілеўскі Даніла Мінавіч (1889–1963), краязнавец (даследчык Віцебшчыны), гісторык, літаратуразнавец, ураджэнец в. Новае Сяло Віцебскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Шумілінскім раёне).

**4 снежня** – 95 гадоў тому (1929) нарадзіўся Баразна Лявон Цімафеевіч (1929–1972), беларускі мастак, этнограф, грамадскі дзеяч, ураджэнец в. Новае Сяло Талачынскага раёна.

**5 снежня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзілася Рубіцель Кацярына Захараўна (1924–2009), Герой Сацыялістычнай Працы. З 1944 г. – у калгасе «Чырвоныя застенкі», з 1951 г. – палявод, у 1959–1972 гг. – звеннявая льнаводчага звяна калгаса «Прагрэс» Дубровенскага раёна, ураджэнка в. Чырвоныя Засценкі Дубровенскага раёна.

**7 снежня** – 95 гадоў Таму (1929) адбылася 1-я канферэнцыя жанчын-калгасніц Віцебскай акругі.

**12 снежня** – 150 гадоў таму (1874) нарадзіўся Сулім-Самойла Андрэй Фаміч (1874–1933), вучоны-гігіеніст, доктар медыцынскіх навук, ураджэнец г. Полацка.

**12 снежня** – 130 гадоў таму (1894) нарадзіўся Турлай Андрэй Аляксеевіч (1894–1937), партыйны і прафсаюзны дзеяч Беларусі, наркам саўгасаў БССР. У 1933 г. – сакратар, у 1935 г. – 1-ы сакратар Полацкага райкама КП(б)Б. Ураджэнец в. Кракаўка Слонімскага павета Гродзенскай губерні (цяпер у Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці).

**12 снежня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Пашкевіч Нічыпар Еўдакімавіч (1924–2003), беларускі крытык, літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук, заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнец в. Філістава Талачынскага раёна.



**9 сакавіка** – 95 гадоў таму (1929) створаны Боркавіцкі раён – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР. Да 1930 г. – у Полацкай акрузе. У 1931 г. – скасаваны.

**10 сакавіка** – 60 гадоў таму (1964) нарадзілася Гаравая Людміла Генадзеўна, народны майстар выцінанкі і спіральнага пляцення, вывучае народныя традыцыі Гарадоччыны, член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. У 2016 годзе ёй прысвоена званне «Народны майстар Беларусі». Ураджэнка в. Свір Мядзельскага раёна Мінскай вобласці.

**11 сакавіка** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Крапцоў-Зайчанка Мікалай Васілевіч (1914–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Ужур Енісейскай губерні (цяпер у Краснаярскім краі, Расія).

**11 сакавіка** – 70 гадоў таму (1954) нарадзілася Лазаковіч Тамара Васілеўна (1954–1992), беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіёнка XX Алімпійскіх гульняў (1972 г.), чэмпіёнка свету, абсалютная чэмпіёнка Еўропы, абсалютная чэмпіёнка V Спартакіяды народаў СССР, чэмпіёнка СССР. З 1976 г. была дзяржаўным трэнерам СССР па Віцебскай вобласці. Ураджэнка с. Гусева, Калінінградскай вобласці.

**12 сакавіка** – 195 гадоў таму (1829) нарадзіўся Грабніцкі Отан Мікалаевіч (1829–1865), удзельнік паўстання 1863–1864 гг. на Беларусі, ураджэнец маёнтка Арэхаўна Лепельскага павета (цяпер ва Ушацкім раёне).

**12 сакавіка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Томскі Аляксей Арсеньевіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. Пахаваны ў в. Войтава Віцебскага раёна. Ураджэнец с. Савацьева Цвярской губерні.

**12 сакавіка** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Аўдошка Мікалай Пятровіч (1934–1979), Герой Сацыялістычнай Працы, член-карэспандэнт Беларускай інжынернай акадэміі. Ураджэнец в. Меніца Полацкага раёна.

**12 сакавіка** – 70 гадоў таму (1954) праведзены збор камсамольскага актыву г. Віцебска, прысвечаны адпраўцы першых 180 камсамольцаў у Казахстан на асваенне цалінных земляў.

**15 сакавіка** – 70 гадоў таму (1954) у Оршы згодна Пастановы Савета Міністраў СССР № 437 заснаваны вячэрні тэхнікум пры Аршанскім ільнокамбінаце, з 1956 г. – вячэрні тэкстыльны тэхнікум, з 1973 г. – Аршанскі механіка-тэхналагічны тэхнікум, з 2002 г. – Аршанскі дзяржаўны механіка-эканамічны каледж.

**16 сакавіка** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Лабуноў Уладзімір Архіпавіч, вучоны ў галіне мікра- і нанаэлектронікі, дзяржаўны дзеяч Беларусі, акадэмік НАН Беларусі (1986; член-карэспандэнт 1980), доктар тэхнічных навук, прафесар. Заслужаны вынаходнік Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец г. Оршы.



**1 снежня** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Платонаў Уладзімір Пятровіч, беларускі матэматык, прафесар, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі і прэміі Ленінскага камсамола, ураджэнец в. Стайкі Аршанскага раёна.

**2 снежня** – 140 гадоў таму (1884) нарадзіўся Пустынін Міхаіл Якаўлевіч (сапр. Разенблат; 1884–1966), літаратар, журналіст, паэт-сатырык, адзін з арганізатараў і асноўных аўтараў першага ў краіне Тэатра рэвалюцыйнай сатыры ў Віцебску. У Віцебску жыў і працаваў у 1918–1922 гг.

**2 снежня** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Васільеў Васіль Вячаслававіч, беларускі мастак, педагог, член Беларускага саюза мастакоў. Працуе ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. Ураджэнец г. Оршы.

**3 снежня** – 165 гадоў таму (1859) у Віцебску пачаў працаваць тэлеграф.

**3 снежня** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Кананюк Віталь Іванавіч (1919–?), генерал-маёр войск сувязі, спецыяліст у галіне ваеннай навукі, прафесар Ваеннай акадэміі сувязі імя С. М. Будзённага. Ураджэнец в. Вышадкі Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці.

**3 снежня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзілася Арцёменка Ганна Фёдараўна (1924–2010), Герой Сацыялістычнай Працы. У 1946–1948 гг. працавала ў Полацкім абласным упраўленні сельскай гаспадаркі, у 1950–1991 гг. – вязальшчыца віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі КІМ. Ураджэнка в. Беляі Полацкага раёна.

Сахаліне, ледавік на Камчатцы, мінерал багдановічыт AgBiSe2. Ураджэнец г. Люцын Віцебскай губерні (зараз г. Лудза, Латвія).

**30 лістапада** – 125 гадоў таму (1899) нарадзіўся Лынькоў Міхась (Міхаіл Ціханавіч; 1899–1975), народны пісьменнік Беларусі, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа, ураджэнец в. Зазыбы Віцебскага павета Віцебскай губерні (цяпер в. Зазыбы 2 у Віцебскім раёне).

**30 лістапада** – 105 гадоў Таму (1919) выдадзены каталог Першай дзяржаўнай выставы віцебскіх мастакоў.

## Снежань

**110 гадоў** таму (1914) у Віцебску створаны артылерыйскія майстэрні, з 1918 г. – завод сельскагаспадарчых машын, зараз – Віцебскі станкабудаўнічы завод «Вістан».

**80 гадоў** таму (1944) у Віцебску пачала работу адноўленая фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі».

**80 гадоў** таму (1944) у г. п. Шаркаўшчына пачала выдавацца раённая газета «Сялянская праўда». З 1967 г. – «Кліч Радзімы».

**70 гадоў** таму (1954) адкрыты Лепельскі краязнаўчы музей.

**35 гадоў** таму (1989) выйшаў першы нумар гарадской газеты «Витебский курьер».

**20 гадоў** таму (2004) у Віцебску пачала выдавацца газета «Вести ВГТУ».



**17 сакавіка** – 235 гадоў таму (1789) нарадзіўся Бучынскі Вінцэнцій (1789–1853), філосаф, тэолаг, крытык, заснавальнік і рэдактар першага на Беларусі літаратурна-навуковага часопіса «Полацкі штомесячнік» (1818–1820), выкладчык Полацкай езуіцкай акадэміі.

**17 сакавіка** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Шаўроў Аляксей Сямёнавіч (1904–1976), дзяржаўны дзеяч Беларусі, заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання БССР, ураджэнец в. Шабуні Віцебскага павета (цяпер Віцебскі раён).

**17 сакавіка** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Забела Уладзімір Паўлавіч, беларускі рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, прафесар. З 1970 г. – у Беларускім тэатры імя Я. Коласа, ураджэнец г. Вільнюс (Літва).

**17 сакавіка** – 35 гадоў таму (1989) у Оршы адкрыта Гарадская выставачная зала.

**18 сакавіка** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Франкфурт Аляксандр Ізраілевіч (1904–1977), беларускі вучоны ў галіне ўнутранай медыцыны, доктар медыцынскіх навук, прафесар. У 1959–1970 гг. працаваў у Віцебскім медыцынскім інстытуце. Ураджэнец п. Станаў Хмяльніцкай вобл.

**18 сакавіка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Бяляўскі Васіль Мікалаевіч (1924–2008), беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, трыма медалямі «За баявыя заслугі», медалём «За

перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.». Ураджэнец в. Крашына Аршанскага раёна.

**18 сакавіка** – 80 гадоў таму (1944) нарадзілася Харытончык Зінаіда Андрэеўна, беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар, ураджэнка г. Дзісна Мёрскага раёна.

**19 сакавіка** – 135 гадоў таму (1889) нарадзіўся Фогт Фёдар Адольфавіч (1889–1939), мастак-графік, акварэліст, педагог. З 1928 г. – у Віцебскім мастацкім вучылішчы (намеснік дырэктара, кіраўнік майстэрні графічнага мастацтва), ініцыятар і арганізатар графічнага аддзялення, ураджэнец г. Санкт-Пецярбург.

**19 сакавіка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Пячонкін Якаў Міхайлавіч (1924–2004), архівіст, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. – начальнік аддзела Дзяржархіва Полацкай вобласці, старшы навуковы супрацоўнік архіўнага аддзела УМУС Полацкай вобласці, з 1955 г. – загадчык гарадскога архіва. У 1964–1986 гг. – дырэктар філіяла Дзяржархіва Віцебскай вобласці ў г. Полацку. Ураджэнец в. Шчаперня Полацкага раёна.

**20 сакавіка** – 135 гадоў таму (1889) нарадзіўся Родзевіч Часлаў Іванавіч (1889–1942), беларускі грамадскі дзеяч, збіральнік і прапагандыст фальклору. Уваходзіў у першую беларускую трупу Ігната Буйніцкага. Ураджэнец фальварка Кур'янаўшчына Вілейскага павета Віленскай губерні (цяпер Лагойскі раён Мінскай вобл.).



**26 лістапада** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Рабцэвіч Валянцін Навумавіч (1934–2008), беларускі нумізмат, археолаг, доктар гістарычных навук. У 1979–2007 гг. – кіраўнік археалагічнай экспедыцыі БДУ, якая праводзіла раскопкі старажытна-рускіх курганоў у Віцебскай, Гомельскай, Мінскай абласцях. Ураджэнец в. Краснае Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці.

**27 лістапада** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Звездачотаў Мікалай Пятровіч (1904–1985), акцёр Беларускага тэатра імя Я. Коласа (1929–1977), народны артыст Беларусі, ураджэнец г. Пензы (Расія).

**27 лістапада** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Жыгуноў Алесь (сапр. Аляксандр Міхайлавіч), беларускі паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама (1995), «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2014). Узнагароджаны нагрудным знакам Саюза пісьменнікаў Беларусі «За вялікі ўклад у літаратуру» (2014 г.). Ураджэнец в. Тройца Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці.

**29 лістапада** – 160 гадоў таму (1864) нарадзіўся Багдановіч Карл Іванавіч (1864–1947), падарожнік, геолаг, географ, акадэмік Польскай Акадэміі навук. Імем вучонага названы вулкан Курыльскіх астравоў, мыс на Паўднёвым

**24 лістапада** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Беранштэйн Фелікс Якаўлевіч (1904–1977). З 1935 г. – загадчык кафедры біяхіміі Віцебскага ветэрынарнага інстытута і Віцебскага медыцынскага інстытута. У 1945–1972 гг. – у Віцебскім ветэрынарным інстытуце (да 1971 г. – загадчык кафедры арганічнай біялагічнай хіміі), ураджэнец г. Роўна (Украіна).

**24 лістапада** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Фамін Мікалай Пятровіч (1914–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. Стралковы батальён пад камандаваннем маёра 22.06.1944 г. каля в. Карташы Шумілінскага раёна прарваў умацаваную абарону праціўніка. Ураджэнец с. Вялікі Сурмет Арэнбургскай вобласці (Расія).

**25 лістапада** – 310 гадоў таму (1714) нарадзіўся Жаброўскі Тамаш, беларускі архітэктар, матэматык, магістр філасофіі і вольных навук (1752), выкладчык Полацкага калегіума, кіраўнік будаўніцтва езуіцкага кляштара ў Полацку, ураджэнец Навагародскага павета Навагародскага ваяводства, Вялікае Княства Літоўскае.

**26 лістапада** – 105 гадоў таму (1919) створана Заходнядзвінская ваенная флатылія (1919–1924) загадам РВСР з 2-га атрада Ваенна-рачной флатыліі Савецкай Латвіі (база ў г. Віцебску), аператыўнае аб’яднанне баявых рачных караблёў у грамадзянскую вайну на Заходнім фронце.



**20 сакавіка** – 60 гадоў таму (1964) нарадзілася Гушча Марына Леанідаўна, загадчык Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору, майстар ткацтва ручнікоў і габеленаў, член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці. У 2016 г. ёй прысвоена званне «Народны майстар Беларусі».

**22 сакавіка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзілася Курносава Анастасія Захараўна (1924–1992), Герой Сацыялістычнай Працы. З 1944 г. – свінарка калгаса «Расія» Віцебскага раёна, ураджэнка в. Партызанаўка Віцебскага раёна.

**23 сакавіка** – 110 гадоў таму (1914) нарадзілася Плыгаўка Лідзія Пятроўна (1914–2002), Герой Сацыялістычнай Працы. З 1949 г. – калгасніца, у 1951–1970 гг. – звеннявая льнаводчага звяна калгаса «Парыжская камуна» Глыбоцкага раёна, ураджэнка в. Ліхабалоцце Глыбоцкага раёна.

**23 сакавіка** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Шпакаў Аляксей Пракоф’евіч, (1929–2014), беларускі вучоны ў галіне заатэхнікі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. З 1953 па 2009 год працаваў у Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Ураджэнец в. Вербеж Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобл.

**23 сакавіка** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Ласкаўнёў Аляксандр Пятровіч, беларускі вучоны ў галіне матэрыялазнаўства, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, ураджэнец г. п. Расоны.

**24 сакавіка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзілася Крупская Ганна Міхайлаўна (1924–1994), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнка в. Мураўшчына Полацкага раёна.

**24 сакавіка** – 65 гадоў нарадзілася (1959) Гагалінская Людміла Васілеўна, краязнаўца, бібліятэкар, ураджэнка в. Гаі Верхнядзвінскага раёна.

**25 сакавіка** – 30 гадоў таму (1994) у Полацку адкрыты музей-бібліятэка Сімяона Полацкага, філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка

**26 сакавіка** – 125 гадоў таму (1899) нарадзіўся Бладыка Нікіфар Міхайлавіч (1899–?), беларускі педагог, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1937), ураджэнец в. Рамашкіна Магілёўскай губерні (цяпер у Талачынскім раёне).

**26 сакавіка** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Казаравец Мікалай Уладзіміравіч, беларускі вучоны ў галіне жывёлагадоўлі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, ураджэнец в. Харкі Пастаўскага раёна.

**26 сакавіка** – 70 гадоў таму (1954) нарадзілася Катовіч Таццяна Віктараўна, беларускі тэатразнаўца, педагог, доктар мастацтвазнаўства, прафесар. Член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнка г. Віцебска.

**27 сакавіка** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Піменаў Васіль Васілевіч (1954–2005), удзельнік вайны ў Афганістане, Герой Савецкага Саюза (1984).



**21 лістапада** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Іларыёнаў Сцяпан Іларыёнавіч (1904–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. Ураджэнец в. Кіўсерт-Янішава Казанскай губерні (цяпер у Чувашыі).

**21 лістапада** – 120 гадоў таму (1904) нарадзілася Пятрова Кацярына Васілеўна (1904–1985), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, доктар ветэрынарных навук, прафесар. Працавала ў Віцебскім ветэрынарным інстытуце ў 1937–1938 і 1940–1941 гг. Ураджэнка г. Алатыр Сімбірскай губерні (цяпер у Чувашыі).

**21 лістапада** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Зімянін Міхаіл Васілевіч (1914–1995), сакратар ЦК КПСС, палітычны і дзяржаўны дзеяч Беларусі і СССР, журналіст, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец г. Віцебска.

**22 лістапада** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Улюценка Віктар Васілевіч (псеўданім Антон Параскевін), краязнаўца, калекцыянер, урач, член Беларускага саюза журналістаў, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2015, 2021). Узнагароджаны Ганаровым Знакам «2000 лет Христианству», нагрудным знакам Саюза пісьменнікаў Беларусі «За вялікі ўклад у літаратуру» (2017 г.), медалём Францыска Скарыны (2020). Ураджэнец г. п. Шуміліна.

начальніка штаба 1-га Далёкаўсходняга фронту, удзельнік вайны з Японіяй (1945), ураджэнец в. Пушча Гарадоцкага раёна.

**18 лістапада** – 100 гадоў таму (1924) Віцебскі філіял літаратурнага аб'яднання «Маладняк» быў арганізацыйна аформлены ў складзе 5 чалавек. Існаваў да 1928 года.

**18 лістапада** – 90 гадоў таму (1934) прайшла І канферэнцыя жанчын-калгасніц Сенненскага раёна.

**19 лістапада** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Канцавы Міхаіл Пятровіч, беларускі мастак, скульптар, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец г. Барані Аршанскага раёна.

**20 лістапада** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Пшонка Уладзімір Іванавіч, лепельскі мастак-жывапісец, ураджэнец в. Свядзіца Лепельскага раёна.

**20 лістапада** – 60 гадоў таму (1964) нарадзілася Аржаннікава Таццяна Пятроўна, беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), майстар спорту СССР міжнароднага класа, чэмпіёнка свету, прызёр чэмпіянату Еўропы. Трэнер-выкладчык аддзялення спартыўнай гімнастыкі (дзяўчыны) СДЮШАР № 1 г. Віцебска. Ураджэнка г. Віцебска.

**21 лістапада** – 205 гадоў таму (1819) нарадзіўся Паплонскі Ян (1819–1885), педагог, кандыдат філасофіі, арганізатар педагагічнай справы, ураджэнец мястэчка Відзы Браслаўскага павета Віленскай губерні (цяпер г. п. Відзы Браслаўскага раёна).



Камандзір батальёна парашутна-дэсантнага палка вызначыўся ў кастрычніку 1983 г. пры разгроме буйной групоўкі душманаў. Ураджэнец г. Віцебска.

**27 сакавіка** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Пагарэлая Ксенія Максімаўна, беларуская арганістка, у 2019 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь». З 1988 г. – арганістка канцэртнага зала Полацкага Сафійскага сабора, арганізатар Міжнароднага фестывалю арганнай музыкі «Званы Сафіі» ў Полацку, ганаровы грамадзянін г. Полацка. Ураджэнка г. Краснадар (Расія).

**28 сакавіка** – 65 гадоў таму (1959) нарадзіўся Навуменка Якаў Паўлавіч (1959–2012), беларускі эстрадны спявак. Заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

**30 сакавіка** – 130 гадоў таму (1894) нарадзіўся Зарака-Заракоўскі Баляслаў Францавіч (1894–1963), савецкі і польскі военачальнік, генерал-лейтэнант (СССР, 1946), генерал дывізіі (ПНР, 1945), удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец г. Полацка.

**31 сакавіка** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Хоміч Франц Ігнатавіч, педагог, краязнаўца, ураджэнец в. Седлярова Дунілавіцкага раёна Полацкай вобласці (зараз у Пастаўскім раёне).

# Красавік

**125 гадоў** таму (1899) нарадзіўся Раскін Аўсей Львовіч (1899–?), прафсаюзны і гаспадарчы работнік. У 1910–1918 гг. – рабочы-шавец віцебскіх і полацкіх прыватных прадпрыемстваў. З 1921 г. – адказны сакратар Полацкага павятовага прафбюро, з 1923 г. – старшыня Віцебскага губернскага аддзела прафсаюза харчавікоў. Ураджэнец г. Полацка.

**105 гадоў** таму (1919) пачала выдавацца газета «Известия Городокского исполнительного комитета Совета рабочих и крестьянских депутатов». З 1991 г. – «Гарадоцкі веснік».

**75 гадоў** таму (1949) нарадзілася Каваленка Лілія Васілеўна, віцебскі майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У маляванках распрацоўвае тэму народнага свята.

**1 красавіка** – 190 гадоў таму (1834) нарадзіўся Забелін Іосіф Вікенцьевіч (1834–1875), вучоны-медык, ураджэнец Віцебскай губерні.

**2 красавіка** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Афтаназі Раман (1914–2004), польскі бібліятэкар, гісторык, дакументазнаўца, даследчык гісторыі магнацкіх і шляхецкіх сядзібаў, архітэктуры маёнткаў, паркавага мастацтва, гісторыі мастацкіх збораў і бібліятэк, генеалогіі ўладальнікаў сядзіб, у тым ліку Віцебшчыны. Ураджэнец г. Моршын Аўстра-Венгрыі (цяпер у Львоўскай вобл., Украіна).



**12 лістапада** – 115 гадоў таму (1909) нарадзілася Кроз Дора Захараўна (1909–1997), беларуская артыстка оперы (лірыка-каларатурнае сапрана), ураджэнка г. Сянно.

**12 лістапада** – 105 гадоў таму (1919) у Віцебску створаны гарадскі народны хор пад кіраўніцтвам М. В. Анцава (1865–1945).

**15 лістапада** – 115 гадоў таму (1909) было адчынена Лужаснянскае ніжэйшае сельскагаспадарчае вучылішча – першая сельскагаспадарчая ўстанова Віцебскай губерні. Зараз – Лужаснянскі аграрны каледж Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

**15 лістапада** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Слямнёў Міхаіл Аляксандравіч, вучоны-філосаф, доктар філасофскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік народнай адукацыі Беларусі, выдатнік асветы СССР. Ураджэнец в. Малыя Стайкі Гарадоцкага раёна.

**16 лістапада** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Канапелька Анатоль Мікалаевіч (1939–2002), паэт, перакладчык, літаратуразнавец. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча» Віцебскага аблвыканкама (2003, пасмяротна), ураджэнец г. п. Расоны.

**18 лістапада** – 125 гадоў таму (1899) нарадзіўся Шалахаў Георгій Акімавіч (1899–1987), генерал-лейтэнант. У гады Вялікай Айчыннай вайны – начальнік штаба арміі і грамадзянскіх войск на Далёкім Усходзе, намеснік

**7 лістапада** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Васілеўскі Павел Антонавіч (1924–?), партыйны, гаспадарчы і прафсаюзны дзеяч, удзельнік размініравання тэрыторыі Віцебскай вобласці пасля Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Карпаўцы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці.

**8 лістапада** – 160 гадоў таму (1864) нарадзіўся Ціхамiраў Клаўдзій Іванавіч (1864–1929), педагог, гісторык, краязнавец. У 1910–1921 гг. дырэктар Віцебскага настаўніцкага інстытута. Ураджэнец в. Славіхіна Стараруската павета Наўгародскай губерні.

**8 лістапада** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Жыткевіч Зміцер Максімавіч (1904–1955), беларускі паэт, празаік, публіцыст. Ураджэнец в. Халамер'е Гарадоцкага раёна.

**8 лістапада** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Камінскі Іван Іларыёнавіч (1919–1974), удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Мяккія Сенненскага павета (цяпер в. Масоры Сенненскага раёна).

**9 лістапада** – 100 гадоў таму (1924) у Віцебскім раёне быў адкрыты санаторый «Сасноўка» .

**11 лістапада** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Заборскі Георгій Уладзіміравіч (1909–1999), беларускі архітэктар, народны архітэктар СССР, заслужаны будаўнік Беларусі, акадэмік Расійскай акадэміі архітэктуры і будаўнічых навук, адзін з аўтараў генплана г. Полацка (1949), ураджэнец г. Мінска.



**2 красавіка** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Зуеў Юрый Панцеляймонавіч, беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў, ганаровы член Расійскай акадэміі мастацтваў, працуе ў манументальным і станковым жывапісе, дэкаратыўнай пластыцы. Кавалер ордэна Францыска Скарыны. Ураджэнец г. Бійск Алтайскага краю, Расія). Жыве ў г. Віцебску.

**3 красавіка** – 105 гадоў таму (1919) быў адкрыты першы губернскі з'езд настаўнікаў і работнікаў народнай адукацыі.

**3 красавіка** – 95 гадоў таму (1929) прынята пастанова Віцебскага выканкама «Аб электрыфікацыі Віцебскага раёна ў сувязі з пускам Асінстроя».

**4 красавіка** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Кашыра Юрый Фадзеевіч (1904–1943), беларускі рымска-каталіцкі святар, мучанік, блажэнны Рымска-каталіцкага касцёла, ураджэнец в. Александрова Мёрскага раёна.

**5 красавіка** – 135 гадоў таму (1889) нарадзіўся Кардовіч Іосіф Мітрафанавіч (1889–1967), дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, у 1949–1953 гг. быў старшынёй Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, ураджэнец в. Друцк Магілёўскай губерні (цяпер у Талачынскім раёне).

**5 красавіка** – 115 гадоў таму (1909) нарадзілася Нікіфарава Марыя Філіпаўна (1909–?), прафсаюзны дзеяч. У 1926 г. пачала працоўную дзейнасць рабочай швейнай фабрыкі, ураджэнка г. Віцебска.

**5 красавіка** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Рамашкін Цімафей Цярэнцьевіч (1919–1954), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1954), ураджэнец в. Марчанкі Гарадоцкага раёна.

**5 красавіка** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Чалей Іван Вацлававіч, інжынер-тэхнолаг, доктар тэхнічных навук, прафесар, член Рэгіянальнай беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі Санкт-Пецярбурга, ураджэнец г. Паставы.

**6 красавіка** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Крачкоўскі Анатоль Вячаслававіч, краязнаўца, журналіст, член Саюза журналістаў Беларусі. Аўтар кніг па гісторыі Бешанковіччыны. Ураджэнец в. Круляўшчызна Докшыцкага раёна.

**7 красавіка** – 125 гадоў таму (1899) нарадзіўся Галуза Іларыён Рыгоравіч (1899–1977), вучоны ў галіне заалогіі і паразіталогіі, акадэмік АН Казахстана, доктар біялагічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ураджэнец в. Даргейкі Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Сенненскім раёне).



**5 лістапада** – 85 гадоў таму (1939) нарадзілася Пятрушына Вера Андрэеўна (1939–2010), Герой Сацыялістычнай Працы. У 1954–1994 гг. – свінарка племзавода «Рэканструктар» Талачынскага раёна. Ураджэнка в. Кутавец Крупскага раёна Мінскай вобласці.

**6 лістапада** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Цябут Дзмітрый Васілевіч (1914–1987), партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Пуканаўка Полацкага павета Віцебскай губерні (цяпер у Полацкім раёне).

**6 лістапада** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Гарулёў Мікалай Аляксандравіч (1919–1980), беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнец в. Баева Горацкага павета Гомельскай губерні (цяпер у Дубровенскім раёне).

**7 лістапада** – 125 гадоў таму (1899) нарадзіўся Тарасенка Васіль Радзівонавіч (1899–1972), беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. У 1961–1962 гг. даследаваў Верхні замак у г. Полацку, ураджэнец г. Пётркаў-Трыбунальскі (Польшча).

**7 лістапада** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Сушко Павел Міхайлавіч (1909–1974), паэт, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Сушкі Дзісненскага павета Віленскай губерні (зараз – Мёрскі раён).

З 1946 г. – у Віцебску, з 1999 г. – Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт ордэна Дружбы народаў (ВДМУ).

**3 лістапада** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Прышывалка Анатоль Пятровіч (1924–1997), беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, ураджэнец в. Нізгалава Бешанковіцкага раёна.

**4 лістапада** – 135 гадоў таму (1889) нарадзіўся Разэнгольц Аркадзь Паўлавіч (1889–1938), савецкі ваенны і дзяржаўны дзеяч, адзін са стваральнікаў савецкай ваеннай і грамадзянскай авіяцыі, ураджэнец г. Віцебска.

**4 лістапада** – 100 гадоў таму (1924) заснаваны Віцебскі ветэрынарны інстытут на базе Віцебскага вышэйшага сельскагаспадарчага тэхнікума. У 1944–1994 гг. – «Віцебскі ордэна „Знак Пашаны“ ветэрынарны інстытут імя Кастрычніцкай рэвалюцыі», з 1994 г. – Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны.

**4 лістапада** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Карніловіч Сяргей (1929–1993), беларускі грамадскі дзеяч у эміграцыі, ураджэнец в. Таргуны Докшыцкага раёна.

**5 лістапада** – 120 гадоў таму (1904) нарадзілася Хадасевіч-Лежэ Надзея Пятроўна (1904–1983), французская мастачка, ураджэнка в. Асецішча Віцебскай губерні (цяпер у Докшыцкім раёне).



**8 красавіка** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Глагоўская Алена Віталеўна, палітолаг, гісторык, краязнаўца, журналіст, даследчык дзейнасці беларускага мастака з Браслаўшчыны Пётры Сергіевіча.

**9 красавіка** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Шчарбіна Васіль Васілевіч (1914–1942), удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. З ліпеня 1941 г. – камандзір разведвальна-дыверсійнага атрада, які дзейнічаў на тэрыторыі Полацка, ураджэнец ст. Нікітаўка Кацярынаслаўскай губерні (цяпер у Данецкай вобласці).

**11 красавіка** – 80 гадоў таму (1944) пачалася Полацка-Лепельская бітва 1944 (11.04.1944–15.05.1944) – баі партызанскіх брыгад Полацка-Лепельскай партызанскай зоны супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.

**12 красавіка** – 120 гадоў таму (1904) нарадзілася Лі Соф'я Дзмітрыеўна (1904–1980), беларуская мастачка. Заслужаны работнік культуры Беларусі, ураджэнка в. Обаль Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Сенненскі раён).

**12 красавіка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Цвярскі Аляксандр Давыдавіч (1924–1990), пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў СССР, ураджэнец г. Віцебска.

**13 красавіка** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Модэль Міхась (Мендэль Моўшавіч) (1904–1980), пісьменнік, крытык, беларускі тэатразнавец, ураджэнец мястэчка Камень Лепельскага павета (цяпер аграгарадок у Лепельскім раёне).

**14 красавіка** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Пянькоўскі Валянцін Антонавіч (1904–1969), савецкі военачальнік, генерал арміі. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнік вызвалення Віцебска, Полацка, ураджэнец г. Магілёва.

**14 красавіка** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Аляксееў Іван Епіфанавіч (1909–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Полацка.

**15 красавіка** – 105 гадоў таму (1919) Віцебск наведала руская актрыса Марыя Ярмолава (1853–1928).

**16 красавіка** – 65 гадоў таму (1959) нарадзіўся Шацько Рыгор Іванавіч (1959–2023), беларускі акцёр. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь. Вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. З лістапада 1997 года па 2012 год працаваў дырэктарам тэатра. Лаўрэат Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» – за міжнародную культурную дзейнасць (2002). Ураджэнец в. Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобласці.



# Лістапад

**155 гадоў** таму (1869) у Віцебску гастраляваў славуты піяніст і кампазітар А. Р. Рубінштэйн (1829–1894).

**105 гадоў** таму (1919) у Віцебск прыехаў мастак Казімір Малевіч (1878–1935).

**30 гадоў** таму (1994) заснаваны Віцебскі філіял установы адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносін».

**1 лістапада** – 150 гадоў таму (1874) нарадзіўся Вышалескі Сяргей Мікалаевіч (1874–1958), эпізаатолаг, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарнай медыцыны, акадэмік НАН Беларусі, прафесар, заслужаны дзеяч навукі СССР, Ганаровы член ВАСХНІЛ. З 1928 г. – загадчык кафедры эпізааталогіі Віцебскага ветэрынарнага інстытута, адначасова дырэктар Віцебскага навукова-даследчага ветэрынарнага інстытута, ураджэнец мястэчка Обаль Полацкага павета Віцебскай губерні (цяпер г. п. Обаль Шумілінскага раёна).

**1 лістапада** – 90 гадоў таму (1934) у Віцебску заснаваны бальніца-медыцынскі інстытут, з 1938 г. – Віцебскі медыцынскі інстытут. У Вялікую Айчынную вайну эвакуіраваны ў Чалябінск, з 1943 г. – у Яраслаўль (на базе Віцебскага медыцынскага інстытута быў створаны Яраслаўскі медыцынскі інстытут).

**29 кастрычніка** – 100 гадоў тому (1924) створаны Кузняцоўскі раён, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР (1924–1927). Былы Лосвідскі раён, які ўваходзіў у Віцебскую акругу, быў перайменаваны. 26.03.1927 г. – скасаваны, тэрыторыя далучана да Віцебскага раёна.

**31 кастрычніка** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Кокштыс Тадэвуш Антонавіч, беларускі акцёр, народны артыст Беларусі (1984). Артыст, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, у якім працуе з 1958 года. Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны, ордэнам «Знак Пашаны», Знакам і Ганаровай граматай Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», прэміяй імя Ігната Буйніцкага Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускага саюза тэатральных дзеячаў, прызам Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная Паўлінка» і інш. Ураджэнец в. Хоўхлава Маладзечанскага раёна.



**17 красавіка** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Гапяёнак Мікалай Іванавіч (1919–2008), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, лётчык, Герой Савецкага Саюза, кандыдат ваенных навук, ураджэнец в. Глінішча Гарадоцкага павета (цяпер у складзе в. Бярозна Гарадоцкага раёна).

**17 красавіка** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Пахомаў Мікалай Ільіч (1919–1988), партыйны дзеяч Беларусі, журналіст, удзельнік партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, кандыдат гістарычных навук, прафесар. У 1959–1964 гг. – сакратар Віцебскага абкама КПБ, у 1963–1964 гг. – 2-і сакратар Віцебскага прамысловага абкама КПБ, ураджэнец в. Вольшчына Гарадоцкага раёна.

**17 красавіка** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Фалей Антаніна Уладзіміраўна, беларуская мастачка, член Беларускага саюза мастакоў. З 1987 г. выкладае ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. Працуе ў галіне тэкстылю, графікі і акварэлі, аб'екта. Ураджэнка г. Баранавічы Брэсцкай вобласці.

**18 красавіка** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Ран Лазар Саулавіч (1909–1989), графік, жывапісец. У 1932 г. – скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум. Ураджэнец г. Дзвінска Віцебскай губерні (цяпер г. Даўгаўпілс, Латвія).

**18 красавіка** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Смірноў Канстанцін Васілевіч (1919–1982), Герой Сацыялістычнай Працы. Удзельнік партызанскага руху ў гады

Вялікай Айчыннай вайны, з 1944 г. – старшыня калгаса імя Дзімітрава Талачынскага раёна. Ураджэнец в. Пярвушына Кастрамской вобласці (Расія).

**18 красавіка** – 65 гадоў таму (1959) нарадзіўся Магучы Валерый Уладзіміравіч, віцебскі скульптар, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнец в. Кавердзякі Брэсцкага раёна.

**19 красавіка** – 80 гадоў таму (1944) нарадзілася Беліцкая Людміла Іванаўна, краязнаўца, ураджэнка г. п. Лёзна Віцебскай вобласці.

**20 красавіка** – 125 гадоў таму (1899) заснавана Віцебскае таварыства апекі над дзецьмі.

**20 красавіка** – 30 гадоў таму (1994) у Оршы заснаваны музей Уладзіміра Караткевіча, філіял Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны. 26 лістапада 2000 года, да 70-годдзя з дня нараджэння пісьменніка, быў адкрыты будынак музея з невялікай экспазіцыяй толькі ў адной зале. З лютага 2002 г. музей адчыніў дзверы для наведвальнікаў.

**21 красавіка** – 105 гадоў таму (1919) нарадзілася Раўдзіна Тамара Уладзіміраўна (1919–1991), археолаг, кандыдат гістарычных навук, даследавала старажытны г. Браслаў (1956), ураджэнка г. Дзвінск Віцебскай губерні (цяпер г. Даўгаўпілс, Латвія).

**21 красавіка** – 80 гадоў таму (1944) нарадзілася Піліпеня Яўгенія Ніканаўна (1944–2014), заслужаны дзеяч культуры Беларусі, музыкант, ураджэнка в. Залессе Лёзненскага раёна.



**25 кастрычніка** – 140 гадоў таму (1884) нарадзіўся Дубінскі Сяргей Антонавіч (1884–1937), беларускі археолаг. Даследаваў гарадзішчы і курганныя могільнікі каля Віцебска, Полацка. У 1926–1928 гг. – вывучаў гарадзішча Германы каля г. Оршы. Ураджэнец в. Наройкі Бельскага павета Гродзенскай губерні.

**25 кастрычніка** – 75 гадоў таму (1949) нарадзілася Ісаёнак Марыя Іванаўна, беларускі жывапісец, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнка в. Кісялі Гарадоцкага раёна.

**27 кастрычніка** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Лаўрыновіч Эдуард Віктаравіч (1909–1982), удзельнік партызанскага руху ў Гомельскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Кулакова Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Верхнядзвінскім раёне).

**27 кастрычніка** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Гаўрылаў Пётр Філіпавіч (1914–1968), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. Ураджэнец с. Пясочнадуброўка Томскай губерні (цяпер Томскай вобласці, Расія).

**28 кастрычніка** – 100 гадоў таму (1924) адкрыўся I Віцебскі акруговы з'езд камсамола.

**29 кастрычніка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Буглоў Яўген Данілавіч (1924–2011), вучоны-патафізіёлаг, доктар медыцынскіх навук, ураджэнец в. Стрыжнева Лёзненскага раёна.

**22 кастрычніка** – 25 гадоў тому (1999) створана Віцебскае абласное ўпраўленне Міністэрства па надзвычайных сітуацыях у выніку рэарганізацыі Віцебскага абласнога ўпраўлення ваенізаванай пажарнай службы МУС Рэспублікі Беларусь.

**23 кастрычніка** – 120 гадоў таму (1904) нарадзілася Іванова Праскоўя Сцяпанаўна (1904–1970), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарнай паразіталогіі, доктар ветэрынарных навук. У 1956–1970 гг. – загадчык кафедры паразіталогіі Віцебскага ветэрынарнага інстытута, ураджэнка с. Вялікае Воснае Усцюжанскага павета Наўгародскай губерні (зараз ва Усцюжанскім раёне Валагодскай вобласці, Расія).

**23 кастрычніка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Лепешаў Іван Якаўлевіч (1924–2014), беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук, прафесар. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ураджэнец в. Іскозы Дубровенскага раёна.

**23 кастрычніка** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Кудзін Васіль Савельевіч (1929–1987), Герой Сацыялістычнай Працы. З 1954 г. – механізатар, з 1964 г. – звеннявы бульбаводчага звяна калгаса імя Энгельса Талачынскага раёна, ураджэнец г. Талачын.

**24 кастрычніка** – 160 гадоў таму (1864) нарадзіўся Бялыніцкі-Біруля Аляксей Андрэевіч (1864–1937), заолаг, географ, краязнавец, вучоны, удзельнік Палярнай экспедыцыі (1900–1901), ураджэнец в. Бабкоў Аршанскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Аршанскім раёне).



**22 красавіка** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Атрашкевіч Валерый Іосіфавіч (1939–1990), аўтар навуковых даследаванняў па гісторыі беларускай літаратуры, паэт, дацэнт Магілёўскага педінстытута, ураджэнец в. Красная Горка Ушацкага раёна.

**22 красавіка** – 65 гадоў таму (1959) нарадзіўся Кухто Сяргей Васілевіч (1959–1999), беларускі мастак, працаваў у неаміфалагічным жанры, у аснове большасці работ – аўтарская інтэрпрэтацыя міфаў пра кентаўра. Ураджэнец г. Віцебска.

**23 красавіка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Шалуха Барыс Фёдаравіч (1924–2003), краязнавец, педагог, ураджэнец в. Заложжа Аршанскага раёна.

**24 красавіка** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Дамскі Якаў Уладзіміравіч (1934–2009), савецкі шахматыст, журналіст, майстар спорту СССР па шахматах, міжнародны арбітр. З 1965 г. у Маскве – карэспандэнт і спартыўны каментатар Цэнтральнага тэлебачання і Усесаюзнага радыё. Аўтар і суаўтар звыш 10 кніг пра шахматы і шахматыстаў. Ураджэнец г. Віцебска.

**24 красавіка** – 75 гадоў таму (1949) нарадзілася Еранькова Валянціна Рыгораўна, тэатральны рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, узнагароджана знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», медалём Францыска Скарыны. Ураджэнка г. Лепеля.

**25 красавіка** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Іваноў Уладзімір Усцінавіч (1949–2010), беларускі акварэліст, дырэктар Віцебскага камбіната «Мастацтва» (1988–1992), старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Беларускага саюза мастакоў (1995–2001), ураджэнец в. Мурожніца Шумілінскага раёна.

**26 красавіка** – 70 гадоў таму (1954) нарадзілася Канявалава Наталля Юр'еўна, беларускі вучоны ў галіне біяхіміі, доктар біялагічных навук, прафесар, прарэктар па вучэбнай рабоце ВДМУ, лаўрэат ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2012». Ураджэнка г. п. Відзы Браслаўскага раёна.

**27 красавіка** – 70 гадоў таму (1954) нарадзілася Трафімовіч Тамара Рыгораўна, беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук, ураджэнка в. Бельчыца Полацкага раёна.

**28 красавіка** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Бязлюдаў Артур Іосіфавіч (1934–1996), дзяржаўны дзеяч Беларусі, вучоны-эканаміст, ураджэнец г. Барань Аршанскага раёна.

**29 красавіка** – 95 гадоў таму (1929) нарадзілася Паўлава Маіна Пятроўна, вучоны ў галіне педыятрыі і гематалогіі, ураджэнка в. Падмішнеўе Шумілінскага раёна.

**29 красавіка** – 65 гадоў таму (1959) нарадзіўся Шайко Сяргей Васілевіч, краязнаўца, педагог, гісторык, удзельнік стварэння Сенненскага раённага краязнаўчага музея, ураджэнец Украіны.



**18 кастрычніка** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Пронька Павел Сяргеевіч (1949–2018), беларускі біяхімік, доктар біялагічных навук, ураджэнец г. Паставы.

**20 кастрычніка** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Хандогін Мікалай Іванавіч (1909–1989), франтавы карэспандэнт, найбольш вядомы па фотахроніцы блакаднага Ленінграда. Ураджэнец в. Валынцы Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Верхнядзвінскім раёне).

**20 кастрычніка** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Мельнічэнка Эдуард Міхайлавіч (1939–2001), вучоны-стаматолаг, доктар медыцынскіх навук, прафесар. заслужаны дзеяч навукі Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

**21 кастрычніка** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Кірпічоў Іларыён Паўлавіч (1914–1999), удзельнік савецка-фінляндскай вайны, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1940), ураджэнец в. Якаўлевічы Аршанскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Аршанскім раёне).

**21 кастрычніка** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Навіцкі Уладзімір Іосіфавіч, беларускі вучоны-гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, лаўрэат прэміі НАН Беларусі і Сібірскага аддзялення РАН імя акадэміка В. А. Капцюга, ураджэнец в. Боркавічы Верхнядзвінскага раёна.

**14 кастрычніка** – 80 гадоў таму (1944) нарадзіўся Глушко Міхаіл Фёдаравіч (1944–1998), беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнец в. Буда Сенненскага раёна.

**14 кастрычніка** – 60 гадоў таму (1964) нарадзіўся Жук Ігар Леанідавіч, беларускі мастак, ураджэнец г. Оршы.

**15 кастрычніка** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Ракіта Сяргей (сапр. Законнікаў Сяргей Васілевіч; 1909–1942), паэт, ураджэнец в. Ліцвінава Аршанскага павета (зараз – Дубровенскі раён).

**16 кастрычніка** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Караткевіч Дзмітрый Андрэевіч (1904–1942), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага антыфашысцкага падполля ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Драздова Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Талачынскім раёне).

**17 кастрычніка** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Бабіна Марыя Паўлаўна, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, тэрапеўт, ветсанэксперт, доктар ветэрынарных навук, прафесар. З 1986 г. працуе ў Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Ураджэнка г. Тураў Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

**18 кастрычніка** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Благавешчанскі Аляксей Сяргеевіч (1909–1994), савецкі ваенны дзеяч, Герой Савецкага Саюза (1938), генерал-лейтэнант авіяцыі, удзельнік вызвалення г. Оршы, г. Віцебска ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец г. Брэста.



# Май

**125 гадоў** таму (1899) прайшла першая рабочая маёўка ў Віцебску.

**125 гадоў** таму (1899) у Віцебску адкрылася гарадская бібліятэка імя А. С. Пушкіна. Зараз – бібліятэка-філіял № 4 імя А. Пушкіна ДУ «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска».

**80 гадоў** таму (1944) у гады Вялікай Айчыннай вайны партызанскія злучэнні Полацка-Лепельскай зоны пасля працяглых жорсткіх баёў з фашысцкімі карнікамі ў ноч з 4 на 5 мая 1944 года каля в. Пліна і Паперына Ушацкага раёна здзейснілі аперацыю «Прарыў», выйшлі з акружэння і вывелі 15 тыс. чалавек мірнага насельніцтва.

**1 мая** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Дароўскі Мікалай Сцяпанавіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Старое Рагавое Курскай вобласці (Расія).

**1 мая** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Кандраценка Міхаіл Барысавіч (1924–2004), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Трыніўкі Віцебскага раёна. Працаваў на торфапрадпрыемстве «Дабееўскі Мох» Шумілінскага раёна.

**1 мая** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Касалапаў Якаў Ягоравіч (1934–1982), беларускі кампазітар. З 1966 г. – выкладчык Віцебскага музычнага вучылішча і музычнай школы № 1 г. Віцебска. Займаўся апрацоўкай музычнага фальклору Віцебшчыны, ураджэнец г. Оршы.

**1 мая** – 85 гадоў таму (1939) у Віцебску адкрыты помнік А. С. Пушкіну.

**1 мая** – 65 гадоў таму (1959) дала ток Клясціцкая ГЭС на рацэ Нішча Расонскага раёна. Яго атрымалі вёскі Кавалі, Маркова, Забалоцце, Сінск, Лапешчына, Казімірова, Пушча.

**3 ма** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Крук Віктар Фёдаравіч, мастак, педагог, член Беларускага саюза мастакоў, лаўрэат ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2014». Ураджэнец в. Крукоўшчына Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці. Жыве ў г. п. Шаркаўшчына.

**4 мая** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Фрадкін Марк Рыгоравіч (1914–1990), беларускі і расійскі кампазітар, народны артыст СССР (1985), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1979), ураджэнец г. Віцебска.

**5 мая** – 130 гадоў таму (1894) нарадзіўся Сліц Антон Іванавіч (1894–1945), ваенны дзеяч, генерал-маёр, удзельнік грамадзянскай вайны, вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, кавалер ордэна Леніна (1944, 1945), ураджэнец в. Анзулі Віцебскай губерні (цяпер у Латвіі).

**5 мая** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Самуйлаў Іван Савельевіч (1924–2006), Герой Сацыялістычнай Працы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1948 г. – палявод, у 1951–1989 гг. – брыгадзір паляводчай комплекснай брыгады калгаса «Новае жыццё» Лёзненскага



**10 кастрычніка** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Строчка Іван Іванавіч (1919–2001), ваенны дзеяч, Герой Савецкага Саюза. З 1941 г. – у гады Вялікай Айчыннай вайны на Паўднёвым, 1-м і 4-м Украінскім франтах, удзельнік баёў на Паўночным Каўказе, Украіне, Польшчы. Ураджэнец в. Пажарышча Сенненскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Бешанковіцкім раёне).

**10 кастрычніка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Вінаградаў Міхаіл Мікалаевіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Навінкі Цвярской губерні (цяпер у Цвярской вобласці, Расія).

**10 кастрычніка** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Сафроненка Аляксандр Вікенцьевіч, беларускі журналіст, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец в. Рэчыца Полацкага раёна.

**12 кастрычніка** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Пятаў Уладзіслаў Уладзіміравіч, беларускі вучоны ў галіне парашковай металургіі і матэрыялазнаўства машынабудаўнічых матэрыялаў, доктар тэхнічных навук, прафесар. З 1982 г. – у Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. Ураджэнец г. Віцебска.

**13 кастрычніка** – 25 гадоў таму (1999) заснавана Віцебская рымска-каталіцкая епархія, Віцебская дыяцэзія – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі ў межах Віцебскай вобласці.

**7 кастрычніка** – 60 гадоў тому (1964) СШ № 43 г. Віцебска прысвоена імя Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова.

**8 кастрычніка** – 165 гадоў таму (1859) нарадзіўся Брадоўскі Антон Рафаілавіч (1859–1928), калекцыянер, музейны работнік, заснавальнік Віцебскага губернскага музея (зараз – Віцебскі абласны краязнаўчы музей). Ураджэнец г. Новааляксандраўск Ковенскай губерні (цяпер г. Зарасай, Літва).

**8 кастрычніка** – 130 гадоў таму (1894) нарадзіўся Мінін Яфім Сямёнавіч (1894–1937), мастак-графік, ураджэнец г. Віцебска.

**8 кастрычніка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Барадулін Сяргей Дзмітрыевіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. Ураджэнец в. Лебедзі Вяцкай губерні (цяпер у Кіраўскай вобласці, Расія).

**9 кастрычніка** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Аксёнаў Аляксандр Нічыпаравіч (1924–2009), дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі. З 1965 г. – 1-ы сакратар Віцебскага абкама КПБ, ураджэнец в. Кунтараўка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.

**10 кастрычніка** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Альхоўскі Мікалай Іванавіч (1909–1978), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Межава Аршанскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Аршанскім раёне).



раёна, ураджэнец в. Засігава Лёзненскага раёна.

**6 мая** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Асінскі Ігар Мікалаевіч, журналіст, лаўрэат Прэміі прафсаюзаў Беларусі, кандыдат гістарычных навук, ураджэнец в. Заессе Чашніцкага раёна.

**7 мая** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Урублеўская Святлана Паўлаўна, беларуская мастачка, член Беларускага саюза мастакоў. Працуе ў галіне ручнога ткацтва і акварэлі. З 1983 г. выкладае ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. Дацэнт кафедры дызайну і моды.

**8 мая** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Ганчароў Мікалай Іванавіч (1934–1991), мастак, графік, мастацтвазнавец, пісьменнік, ураджэнец в. Заполле Віцебскага раёна.

**8 мая** – 75 гадоў таму (1949) нарадзілася Смірнова Ларыса Мікалаеўна, заслужаны архітэктар Беларусі, ураджэнка г. Полацка.

**9 мая** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Дзяніскевіч Мікалай Міхайлавіч (1904–1937), дзяржаўны дзеяч Беларусі. З 1926 г. – інструктар Аршанскага абкама КПБ, з 1928 г. – сакратар Асвейскага райкама КПБ, з 1930 г. – інструктар Полацкага акружнога камітэта КПБ, вядучы аргаддзелам Лепельскага райкама КПБ.

**9 мая** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Груца Аляксей Пятровіч (1924–2017), беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук, прафесар, лаўрэат дзяржаўнай прэміі СССР, ураджэнец в. Пішчыкі Дубровенскага раёна.

**9 мая** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Рубанік Васіль Васілевіч, беларускі вучоны ў галіне тэхнічнай акустыкі, доктар тэхнічных навук. член-карэспандэнт НАН Беларусі. З 1976 г. працаваў у Віцебскім аддзяленні Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, у 1998–2002 гг. – загадчык кафедры фізікі Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта. З 2002 года – дырэктар Дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут тэхнічнай акустыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». У 2014 годзе ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Ураджэнец в. Бутава Ушацкага раёна.

**13 мая** – 130 гадоў таму (1894) нарадзіўся Пацалуеўскі Аляксандр Пятровіч (1894–1948), мовазнавец, вучоны-цюрколаг, лінгвіст, этнограф, фальклярыст, ураджэнец в. Букмуйжа Рэжыцкага павета Віцебскай губерні (цяпер у Латвіі).

**13 мая** – 125 гадоў таму (1899) нарадзіўся Давыдаў Абрам Мардухавіч (1899–?), вучоны ў галіне тэрапіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык кафедры Віцебскага медыцынскага інстытута (1957–1975), ураджэнец г. Себежа Віцебскай губерні (цяпер у Пскоўскай вобласці, Расія).



Беларусі». Нарадзілася ў Маскве, бацька – беларускі пісьменнік Ігнат Дуброўскі (Чарняўскі).

**3 кастрычніка** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Летнікаў Фелікс Арцем'евіч, расійскі вучоны ў галіне геалогіі і геахіміі, заснавальнік навуковай школы па флюідным рэжыме літасферы і геаэнергетыцы геалагічных працэсаў, сінергетыкі геалагічных сістэм, акадэмік Расійскай АН, ураджэнец г. Полацка.

**4 кастрычніка** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Ласкін Барыс Савельевіч (1914–1983), сцэнарыст, ураджэнец г. Оршы.

**6 кастрычніка** – 105 гадоў таму (1919) арганізаваны Віцебскі губернскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК).

**7 кастрычніка** – 245 гадоў таму (1779) нарадзіўся Маеўскі Сяргей Іванавіч (1779–1849), военачальнік, мемуарыст, генерал-маёр, ураджэнец Полацкага павета Віцебскай губерні.

**7 кастрычніка** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Рубанаў Сяргей Фёдаравіч (1914–1987), Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны настаўнік Беларусі, кандыдат педагагічных навук, ураджэнец в. Жабыкі Аршанскага павета Магілёўскай губерні (цяпер у Дубровенскім раёне).

**7 кастрычніка** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Халіп Уладзімір Трафімавіч, драматург, мастацтвазнавец, празаік, публіцыст, тэатразнавец, кандыдат мастацтвазнаўства, ураджэнец в. Двор Пліна Ушацкага раёна.

**1 кастрычніка** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Юрчанка Трафім Пятровіч (1904–?), прафсаюзны і партыйны дзеяч. У 1949–1952 гг. – 2-і сакратар Віцебскага абкама КП(б)Б. Ураджэнец с. Гупалаўка Катоўскага раёна Днепрапятроўскай вобласці (Украіна).

**1 кастрычніка** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Абазоўскі Канстанцін Антонавіч (1919–1944), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, лётчык-штурмавік, ураджэнец в. Абухова Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Бешанковіцкім раёне).

**1 кастрычніка** – 65 гадоў таму (1959) нарадзіўся Космач Веньямін Аркадзевіч, беларускі вучоны-гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі. У 2009–2012 гг. – дырэктар Віцебскага філіяла Міжнароднага інстытута сацыяльных і працоўных адносін. У 2016–2020 гг.– дэкан гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава. Ураджэнец в. Талуі Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці.

**2 кастрычніка** – 90 гадоў таму (1934) нарадзілася Чарняўская Тамара Ігнатаўна, беларускі гісторык архітэктуры, кандыдат архітэктуры. Аўтар даследаванняў па гістарычнай планіроўцы і забудове Віцебска, помнікаў архітэктуры Беларусі: «Архитектура Витебска» (1980). Дзяржаўная прэмія Беларусі (1990) за ўдзел у выданні «Збору помнікаў гісторыі і культуры



**13 мая** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Сакалоўскі Міхаіл Ігнатавіч, падводнік, военачальнік, віцэ-адмірал (2005), кандыдат тэхнічных навук, член-карэспандэнт Акадэміі ваенных навук. Ураджэнец г. Віцебска.

**14 мая** – 210 гадоў таму (1814) нарадзіўся Касовіч Каятан Андрэевіч (1814–1883), вучоны ў галіне ўсходазнаўства, адзін з першых санскрытолагаў Расіі, ураджэнец г. Полацка.

**14 мая** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Клопаў Анісім Андрэевіч (1914–1995), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец в. Наваселле Ушацкага раёна.

**16 мая** – 140 гадоў таму (1884) нарадзіўся Каменскі Канстанцін Васілевіч (1884–1938), доктар сельскагаспадарчых навук, батанік, адзін з першых членаў Рускага батанічнага таварыства. З 1907 г. – асістэнт станцыі для выпрабавання насення, старшы батанік Галоўнага батанічнага саду ў Санкт-Пецярбургу, з 1926 г. – старшы спецыяліст аддзела насеннязнаўства. У 1931–1933 гг. – вучоны спецыяліст Інстытута раслінаводства Акадэміі сельскагаспадарчых навук. Старшы батанік Батанічнага Інстытута АН СССР (па спісах на 10.07.1932 г.) Ураджэнец г. Лепеля.

**16 мая** – 115 гадоў таму (1909) наардзіўся Мурзіч Васіль Іванавіч (1909–1979), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец г. Невеля Віцебскай губерні (зараз Пскоўская вобласць, Расія). З 1928 г. працаваў у Віцебскім дэпо.

**16 мая** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Акулінін Аркадзь Андрэевіч (1909–1986), беларускі вучоны ў галіне анатоміі хатніх жывёл, доктар біялагічных навук, прафесар. У 1947–1969 гг. – загадчык кафедры анатоміі Віцебскага ветэрынарнага сельскагаспадарчага інстытута, ураджэнец с. Вялікая Лазаўка Тамбоўскай вобласці (Расія).

**16 мая** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Кашыцкі Эдуард Сцяпанавіч, вучоны-медык, акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец в. Лутава Сяльцо Ушацкага раёна.

**18 мая** – 65 гадоў таму (1959) у г. п. Шуміліна адкрыта музычная школа.

**19 мая** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Авекаў Іван Аўдзеевіч (1919–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, лётчык, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Асінаўка Дубровенскага раёна.

**19 мая** – 70 гадоў таму (1954) нарадзілася Апіёк Тамара Уладзіміраўна, беларускі вучоны-гісторык, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Ураджэнка в. Андрыянава Дубровенскага раёна.

**20 мая** – 105 гадоў таму (1919) нарадзілася Звездачотава Лідзія Якаўлеўна (1919–1994), беларускі мастак-грымёр, заслужаны работнік культуры Беларусі. У 1929–1977 гг. – у Беларускім тэатры імя Я. Коласа. Ураджэнка г. Мінска.



# *Кастрычнік*

**130 гадоў** таму (1894) нарадзіўся Мышалаў Саламон Мееравіч (1894–1938), прафсаюзны і партыйны дзеяч, з 1930 г. – адказны сакратар Лепельскага райкама КП(б)Б, з 1934 г. – сакратар, 1-ы сакратар Дубровенскага райкама КП(б)Б, ураджэнец в. Амельна Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

**105 гадоў** таму (1919) у г. п. Лёзна створана Лёзненская цэнтральная раённая бібліятэка. З 1930 г. – пры Народным доме. З 1930 г. – самастойная ўстанова, з восені 1944 г. – раённая бібліятэка. У 1976 г. пры пераходзе да цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы набыла статус цэнтральнай раённай.

**95 гадоў** таму (1929) выдаў першую прадукцыю Верхнядзвінскі льнозавод, старэйшы льнозавод у Беларусі.

**95 гадоў** таму (1929) заснаваны Аршанскі эксплуатацыйны тэхнікум на базе школы фабрычна-завадскога навучання, якая рыхтавала памочнікаў машыністаў і дзяжурных па станцыі. У Вялікую Айчынную вайну (1941–1944) – у эвакуацыі, з 1942 г. – тэхнікум чыгуначнага транспарту, з 2008 г. – Аршанскі дзяржаўны каледж чыгуначнага транспарту Беларускай чыгункі. Сучасная назва – Аршанскі каледж – філіял установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту».

**85 гадоў** таму (1939) у г. Браславе пачала выдавацца раённая газета «Звязда». У 1941–1944 гг. – «Смерть фашизму» (друкавалася пры штабе партызанскай брыгады імя Жукава), з 1963 г. – «Браслаўская звязда».

**55 гадоў** таму (1969) (1969 г.) у г. Верхнядзвінску была адкрыта дзіцячая музычная школа.

**25 гадоў** таму (1999) у г. Наваполацку на базе спартыўнага клуба «Вымяральнік» (дзейнічаў з 1990 г.) заснавана СДЮШАР «Алімп» ААТ «Вымяральнік». З жніўня 2009 г. – установа «Спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву «Алімп» пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ААТ «Вымяральнік» па кікбоксінгу і тайландскім боксе.

**28 верасня** – 155 гадоў таму (1869) нарадзіўся Дубасаў Мікалай Аляксандравіч (1869–1935), рускі піяніст, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі. У 1921–1923 гг. – працаваў у Віцебску (выкладаў у народнай кансерваторыі, з 1922 г. – у музычным тэхнікуме). Ураджэнец г. Санкт-Пецярбург.

**28 верасня** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Анішчык (Гутар) Ганна Анфімаўна, беларускі мастак, ураджэнка в. Кулакова Пастаўскага раёна.

**29 верасня** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Тарасаў Канстанцін Міхайлавіч (1929–2022), ветэран працы, ганаровы дарожнік Рэспублікі Беларусь. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў блакадным Ленінградзе – на падсобных работах на заводзе «Бальшавік». З 1953 г. жыў і працаваў у г. Гарадку. У 1971–1995 гг. – начальнік Гарадоцкага ДРБУ № 106. Ураджэнец г. Ленінграда. Узнагароджаны памятным знакам «У гонар 75-годдзя поўнага вызвалення Ленінграда ад фашысцкай блакады».

**30 верасня** – 105-гадоў таму (1919) нарадзіўся Рылаў Валерый Дзмітрыевіч (1919–1944), Герой Савецкага Саюза. Камандзір аддзялення роты сувязі адным з першых 24.06.1944 г. пад агнём праціўніка на плыце і ўплаў пераправіўся цераз р. Заходняя Дзвіна каля в. Буй Бешанковіцкага раёна і ўстанавіў сувязь камандавання палка з яго ўдарнай групай. Ураджэнец г. Яранск Кіраўскай вобласці (Расія).



**20 мая** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Галецкі Пётр Антонавіч (1919–1942), удзельнік партызанскага руху на Віцебшчыне і Смаленшчыне ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1965), ураджэнец в. Майдан Талачынскага раёна.

**21 мая** – 85 гадоў таму (1939) нарадзілася Петрачкова Валянціна Цімафееўна (1939–2021), заслужаная артыстка Беларусі. Пасля заканчэння студыі Беларускага тэатра імя Я. Коласа (1958) да 2015 года працавала ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа. Ураджэнка г. Рудня Смаленскай вобласці (Расія).

**22 мая** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, ураджэнец г. Віцебска.

**22 мая** – 65 гадоў таму (1959) у Лёзна адкрыта дзіцячая музычная школа.

**22 мая** – 60 гадоў таму (1964) нарадзіўся Пушкін Ігар Аляксандравіч, беларускі вучоны-гісторык, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання. Адзін з ініцыятараў, стваральнікаў і першы дырэктар Музея гісторыі горада Магілёва (1992–2001). Ураджэнец г. Оршы.

**23 мая** – 110 гадоў таму (1914) нарадзілася Круганава Ефрасіння Акімаўна (1914–1983), беларускі геабатанік, кандыдат біялагічных навук, ураджэнка в. Старыя Вайханы Гарадоцкага раёна.

**23 мая** – 100 гадоў таму (1924) нарадзілася Навумава Соф'я Фадзееўна (1924–2000), беларускі вучоны ў галіне хіміі высокамалекулярных злучэнняў, доктар хімічных навук, ураджэнка в. Заазер'е Сенненскага раёна.

**23 мая** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Бруцкі Анатоль Паўлавіч, журналіст, краязнаўца, у 1982–1989 – рэдактар шумілінскай раённай газеты «Герой працы», у 1990–1994 – прэс-сакратар Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, у 1994–2013 гг. – у апараце Віцебскага аблвыканкама, ураджэнец в. Белавуша Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.

**25 мая** – 380 гадоў таму (1644) суддзя земскі браслаўскі Севасціян Святаполк Мірскі заснаваў праваслаўны манастыр у Мёрах.

**26 мая** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Караткоў Аркадзь Цімафеевіч, беларускі архітэктар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. У 1960–1970 гг. – кіраўнік групы Віцебскага філіяла інстытута «Белдзяржпраект», з 1988 г. – у Наваполацку (з 1990 г. – галоўны архітэктар). Ураджэнец г. Полацка.

**27 мая** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Бохан Дзмітрый Мікітавіч (1924–1944), удзельнік Аршанскага антыфашысцкага падполля, ураджэнец в. Падгайшчына Аршанскага раёна.



полацкага Барысаглебскага манастыра. Ураджэнец г. Магілёва.

**26 верасня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Чарнышэнка Іосіф Дзмітрыевіч (1924–1995), беларускі вучоны ў галіне педагогікі, доктар педагагічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі. З 1966 г. працаваў у Віцебскім педагагічным інстытуце (ВДУ імя П. М. Машэрава). Ураджэнец с. Кавалёўка Кіеўскай вобласці (Украіна).

**27 верасня** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Савіцкі Валянцін Мікалаевіч (1919–2006), беларускі жывапісец, член Беларускага саюза мастакоў, ураджэнец в. Звянячы Аршанскага павета Гомельскай губерні (цяпер у Талачынскім раёне).

**27 верасня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Сіпараў Іосіф Нікітавіч (1924–1994), беларускі вучоны ў галіне хірургіі і анкалогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. З 1963 г. – хірург Віцебскага абласнога аддзела аховы здароўя, з 1966 г. працаваў у Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Ураджэнец в. Задарожжа Сенненскага раёна.

**28 верасня** – 195 гадоў таму (1829) нарадзіўся Кусцінскі Міхаіл Францавіч (1829–1905), археолаг, калекцыянер, краязнавец. У 1850–1890 гг. упершыню на Беларусі пачаў фатаграфаваць працэс раскопак і складаць фотатэку помнікаў старажытнасцей, ураджэнец маёнтка Завідзічы Лепельскага павета (цяпер в. Завідзічы Лепельскага раёна).

**21 верасня** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Цюцюнаў Анатоль Дзмітрыевіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Бяленева Сенненскага раёна.

**22 верасня** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Домнін Уладзімір Іванавіч (1949–2012), контр-адмірал, ураджэнец г. Паставы.

**23 верасня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Вольскі Артур Віталевіч (сапр. Вольскі-Зэйдель; 1924–2002), паэт, драматург. У 1938–1941 гг. вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы.

**24 верасня** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Пецюкевіч Мар'ян Язэпавіч (1904–1983), беларускі этнограф, актыўны дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху перыяду Заходняй Беларусі, ураджэнец в. Цяцеркі Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні (цяпер у Браслаўскім раёне).

**25 верасня** – 70 гадоў таму (1954) нарадзілася Мельнікава Зоя Пятроўна, літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар. Працуе ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна. Ураджэнка в. Навасёлкі Докшыцкага раёна.

**25 верасня** – 65 гадоў таму (1959) пачалося будаўніцтва Полацкай ЦЭЦ для нафтаперапрацоўчага завода. Зараз Наваполацкая цеплаэлектрацэнтраль.

**26 верасня** – 405 гадоў таму (1619) нарадзіўся Іяўлевіч (Яўлевіч) Ігнацій (1619–1686), беларускі педагог, пісьменнік, грамадскі і царкоўны дзеяч. З 1655 г. – ігумен Богаяўленскага манастыра ў г. Полацку, пры якім адкрыў школу і бібліятэку. З 1660 г. – архімандрыт



**27 мая** – 70 гадоў таму (1954) нарадзілася Цытрон Галіна Станіславаўна, беларускі вучоны ў галіне глебазнаўства, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, ураджэнка в. Калінаўка Дубровенскага раёна.

**27 мая** – 65 гадоў таму (1959) нарадзіўся Косінец Аляксандр Мікалаевіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, беларускі вучоны ў галіне хірургіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, ураджэнец в. Роскі Сялец Аршанскага раёна. У 1997–2005 гг. – рэктар Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, у 2005–2008 гг. – намеснік прем'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, у 2008–2014 гг. – старшыня Віцебскага аблвыканкама, у 2014–2016 гг. – глава Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з мая 2017 года – памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**28 мая** – 130 гадоў таму (1894) нарадзіўся Перхаровіч Франц Іосіфавіч (1894–1961), генерал-лейтэнант, Герой Савецкага Саюза. Удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Заляддзе Докшыцкага раёна.

**28 мая** – 20 гадоў таму (2004) адкрыты Полацкі дзіцячы музей, філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**29 мая** – 85 гадоў таму (1939) нарадзілася Максімава Ларыса Паўлаўна, беларуская піяністка, канцэртмайстар, заслужаная артыстка Беларусі, ураджэнка г. Віцебска.

**29 мая** – 85 гадоў таму (1939) нарадзілася Пісарава Людміла Іванаўна (1939–2011), заслужаная артыстка Беларусі. Закончыла студыю пры Беларускім тэатры імя Я. Коласа (1964), у 1964–2004 гг. працавала ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа. Узнагароджана ордэнам Францыска Скарыны. Ураджэнка г. п. Руба Віцебскага раёна.

**30 мая** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Гаранскі Георгій Кірылавіч (1909–2002), галоўны архітэктар Оршы, аўтар Кургана Бессмяротнасці, адзін з аўтараў помніка «Кацюша», ураджэнец г. Оршы.

## Чэрвень

**105 гадоў** таму (1919) адбылася Першая справаздачная выстава Віцебскага мастацкага вучылішча.

**80 гадоў** таму (1944) была здзейснена Віцебска-Аршанская аперацыя 1944 – наступальная аперацыя войскаў 1-га Прыбалтыйскага (генерал арміі І. Х. Баграмян) і 3-га Беларускага (генерал арміі І. Д. Чарняхоўскі) франтоў у Вялікую Айчынную вайну, састаўная частка Беларускай наступальнай аперацыі 1944 г. «Баграціён».

**80 гадоў** таму (1944) 23–27 чэрвеня ў гады Вялікай Айчыннай вайны быў створаны Віцебскі «кацёл» – акружэнне вайскамі 3-га Беларускага і 1-га Прыбалтыйскага франтоў групоўкі нямецка-фашысцкіх войскаў у Віцебскім раёне ў ходзе Віцебска-Аршанскай аперацыі 1944 года.



царква і 2-павярховы жылы корпус (келлі манахаў). Ураджэнец Вале-Іманья каля г. Бергама ў Ламбардыі (Італія).

**20 верасня** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Тапівалдзіеў Мамадалі (1919-1969), удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай абласцей у Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. Узнагароджаны медалём «Залатая Зорка», ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі і інш. Ураджэнец кішлака Пандыган Ферганскай вобл. (Узбекістан).

**20 верасня** – 80 гадоў таму (1944) створана Полацкая вобласць – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка БССР. Існавала да 08.01.1954 г. (раёны, якія раней уваходзілі ў Віцебскую вобласць, былі зноў уключаны ў яе склад, астатнія былі перададзены ў Маладзечанскую вобласць).

**20 верасня** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Барсукоў Ігар Аляксеевіч (1949–2021), беларускі фотамастак. З 1981 г. – выкладчык і фатограф Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, член Беларускага саюза дызайнераў. Ураджэнец г. Віцебска.

**21 верасня** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Раманоўскі Пётр Міхайлавіч (1919–1977), беларускі мастак, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Ураджэнец г. Оршы.

**18 верасня** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Матыль Іван Аляксандравіч (1914–1961), журналіст, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Дуброўскія Коханаўскага раёна (цяпер у Талачынскім раёне).

**18 верасня** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Чубанаў Канстанцін Дзмітрыевіч, вучоны ў галіне экалогіі і лесазнаўства, ураджэнец г. Віцебска.

**19 верасня** – 90 гадоў таму (1934) нарадзіўся Швед Пётр Іванавіч (1934–2003), вучоны ў галіне аховы паверхні цвёрдых цел палімернымі матэрыяламі, былы рэктар Наваполацкага політэхнічнага інстытута, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец в. Шантарава Мёрскага раёна.

**19 верасня** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Абрамава Іна Аляксандраўна, краязнаўца, гісторык, музейны работнік, старшы захавальнік фондаў цэнтра культурна-выхаваўчай работы УУС Віцебскага аблвыканкама. Аўтар-складальнік кніг «Витебская губернская милиция, (1917–1924 гг.)», «Витебская милиция, (1924–1938 гг.)», «Всегда на посту. 100 лет витебской милиции». Ураджэнка г. Каменка-Бугская Львоўскай вобласці.

**20 верасня** – 280 гадоў таму (1744) нарадзіўся Кварэнгі Джакома (1744–1817), італьянскі архітэктар. У Полацку паводле яго праекта (1782) пабудаваны Полацкі Богаяўленскі манастыр-



**35 гадоў** таму (1989) адбыўся 1-ы конкурс «Віцебская прыгажуня», на якім перамагла Марыя Кежа – будучая Міс СССР-1990.

**1 чэрвеня** – 135 гадоў таму (1889) нарадзіўся Палонік Нікіфар Іванавіч (1889–?), прафсаюзны і гаспадарчы работнік. З сярэдзіны 1920 гг. на савецкай і гаспадарчай працы. Ураджэнец в. Селішча Барысаўскага раёна Мінскай вобласці.

**2 чэрвеня** – 85 гадоў таму (1939) адкрылася карцінная галерэя Ю. М. Пэна. Дзейнічала да ліпеня 1941 г.

**3 чэрвеня** – 125 гадоў таму (1899) нарадзіўся Кудраеў Уладзімір Георгіевіч (1899–1963), прафсаюзны, дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі. З 1943 г. – 1-ы сакратар Беластоцкага, з 1944 г. – Віцебскага абкамаў КП(б)Б. Ураджэнец г. Рагачоў Гомельскай вобласці.

**5 чэрвеня** – 170 гадоў таму (1854) нарадзіўся Пэн Юдаль (Іегуда) Маісеевіч (1854–1937), жывапісец, педагог, заснавальнік Віцебскай школы-майстэрні. З 1891 г. жыў у Віцебску, з 1919 г. – кіраўнік майстэрні Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, у 1923–1926 гг. выкладаў у навучальных установах г. Віцебска. Ураджэнец г. Новааляксандраўск (зараз г. Зарасай, Літва).

**5 чэрвеня** – 80 гадоў таму (1944) нарадзіўся Анісенка Валерый Данілавіч, беларускі акцёр, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прэміі «За духоўнае адраджэнне», прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі,

кавалер ордэна Ф. Скарыны. У 1965–1977 гг. – акцёр беларускіх тэатраў імя Я. Коласа і Я. Купалы. У 2012–2017 гг. – мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Ураджэнец г. Талачына.

**6 чэрвеня** – 125 гадоў таму (1899) заснавана Аршанская цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. С. Пушкіна як публічная бібліятэка. У Вялікую Айчынную вайну – знішчана, у 1944 г. – адноўлена, з 1959 г. – у спецыяльна пабудаваным будынку. З 2013 г. – цэнтральная бібліятэка ДУК «Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

**7 чэрвеня** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Філацьеў Іван Андрэевіч (1909–1944), Герой Савецкага Саюза. Памочнік камандзіра ўзвода малодшы сяржант вызначыўся ў баі пры вызваленні тэрыторыі Віцебскай вобласці, ураджэнец с. Лознае Валгаградскай вобласці.

**7 чэрвеня** – 105 гадоў таму (1919) створаны Віцебскі губернскі прафсаюз пажарных.

**7 чэрвеня** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Скарынкін Уладзімір Максімавіч, паэт, перакладчык, лаўрэат Нацыянальнай прэміі Італіі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы, ураджэнец г. Віцебска.

**8 чэрвеня** – 110 гадоў таму (1914) нарадзіўся Максімаў Фёдар Лазаравіч (1914–2006), беларускі народны майстар у галіне драўлянай скульптуры і жывапісу, ураджэнец в. Каралі (Каралёва) Віцебскага раёна.



Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа. Ураджэнец г. Мар’іна Горка Мінскай вобласці.

**15 верасня** – 100 гадоў таму (1924) адкрыта Чашніцкая цэнтральная раённая бібліятэка, як цэнтральная хата-чытальня, асновай кніжнага фонду якой сталі кнігі з прыватнай бібліятэкі Фейгіна. З 1977 г. у складзе ДУК «Чашніцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

**16 верасня** – 120 гадоў таму (1904) нарадзілася Кашэльнікава Раіса Мікалаеўна (1904–1980), беларуская актрыса, народная артыстка Беларусі. Працавала ў Беларускім другім дзяржаўным тэатры (г. Віцебск). Ураджэнка в. Баршчоўка Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці.

**17 верасня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзілася Клачкова Валянціна Аляксееўна (1924– пасля 2010), удзельніца партызанскага руху на Ушаччыне, партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнка в. Сарочына Ушацкага раёна.

**17 верасня** – 85 гадоў таму (1939) адбылося ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

**18 верасня** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Стулаў Іван Андрэевіч (1904–1964). З 1938 г. – першы сакратар Віцебскага абкама КП(б)Б. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Ураджэнец в. Шамбова Валагодскай вобласці (Расія).

руху. Ураджэнец в. Забаенне Лепельскага раёна.

**9 верасня** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Міксюк Святлана Фёдараўна, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар, працуе ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Ураджэнка г. Віцебска.

**10 верасня** – 130 гадоў таму (1894) нарадзіўся Варэйкіс Іосіф Міхайлавіч (1894–1939 гг.), партыйны і дзяржаўны дзеяч, у 1920–1921 гг. – старшыня Віцебскага губвыканкама.

**12 верасня** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Матукоўскі Мікалай Ягоравіч (1929–2001), беларускі драматург, журналіст, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат прэміі Саюза журналістаў СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец в. Калюціна Расонскага раёна.

**13 верасня** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Ляўданскі Эдуард Ігнацьевіч, вучоны ў галіне хімічнай тэхналогіі і тэхнікі, доктар тэхнічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец в. Верацеі Докшыцкага раёна.

**13 верасня** – 85 гадоў таму (1939) нарадзіўся Мемус Алесь (Аляксандр Іосіфавіч), мастак, краязнаўца, у 1974–1999 гг. выкладаў у Віцебскім дзяржаўным універсітэце. Ураджэнец в. Прусы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Жыве ў Віцебску.

**13 верасня** – 80 гадоў таму (1944) нарадзіўся Лабанок Алесь Іванавіч (1944–2005), акцёр, заслужаны артыст Беларусі. У 1969–2005 гг. працаваў у



**9 чэрвеня** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Міт Сяргей Міхайлавіч (1909–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Герой Савецкага Саюза. Камандзір танкавага ўзвода. Лейтэнант захапіў з экіпажам пераправу на р. Адроў каля в. Засеклі Аршанскага раёна. Ураджэнец в. Чарняцова Наўгародскай вобласці (Расія).

**11 чэрвеня** – 105 гадоў таму (1919) у Віцебску знаходзіўся з агітцягнікам «Кастрычніцкая рэвалюцыя» старшыня УЦВК М. І. Калінін.

**12 чэрвеня** – 90 гадоў таму (1934) нарадзілася Румянцава Зоя Міхайлаўна, прафсаюзны дзеяч. Працавала загадчыкам аддзела Браслаўскага райкама ЛКСМБ. Ураджэнка г. Мінска.

**12 чэрвеня** – 60 гадоў таму (1964) нарадзіўся Багніч Сяргей Анатолевіч, беларускі вучоны ў галіне спектраскапіі арганічных злучэнняў, доктар фізіка-матэматычных навук, ураджэнец г. Гарадка.

**13 чэрвеня** – 190 гадоў таму (1834) нарадзіўся Вераніцын Канстанцін Васілевіч (сапр. Васільеў; 1834-1904), літаратар, аўтар паэмы «Тарас на Парнасе», ураджэнец в. Астраўляны Віцебскага павета (цяпер у Гарадоцкім раёне).

**13 чэрвеня** – 115 гадоў таму (1909) створана Віцебская вучоная архіўная камісія (1909–1919) – гістарычнае таварыства, якое займалася збіраннем архіўных, фальклорна-этнаграфічных і археалагічных матэрыялаў.

**14 чэрвеня** – 115 гадоў таму (1909) нарадзіўся Кавалёў Іван Аляксандравіч (1909–1998), доктар гістарычных навук, прафесар, ураджэнец в. Арлова Полацкага раёна.

**15 чэрвеня** – 120 гадоў таму (1904) нарадзіўся Басулаеў Анатоль Фядотавіч (1904–1964), расійскі мастак тэатра, галоўны мастак Беларускага другога дзяржаўнага тэатра ў г. Віцебску (1934–1938 гг.).

**15 чэрвеня** – 85 гадоў нарадзіўся (1939) Бандарэнка Уладзімір Карпавіч (1939–2001), педагог, краязнаўца. З 1995 г. жыў у г. п. Лёзна, даследаваў паданні роднага краю, цікавіўся тэмай «Яўрэі на Лёзненшчыне».

**16 чэрвеня** – 95 гадоў таму (1929) нарадзіўся Тоўкач Анатоль Іларыёнавіч (1929–2004), беларускі жывапісец, член Беларускага саюза мастакоў. З 1956 г. працаваў на камбінаце «Мастацтва» ў Віцебску. Ураджэнец в. Засялечча Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

**19 чэрвеня** – 105 гадоў таму (1919) у Віцебску прайшоў першы на Беларусі камуністычны суботнік.

**19 чэрвеня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Быкаў Васіль Уладзіміравіч (1924–2003), беларускі пісьменнік, празаік, драматург, публіцыст, грамадскі дзеяч, народны пісьменнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Бычкі Ушацкага раёна.



**5 верасня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзілася Кароткая Валянціна Пракопаўна (1924–2012), Герой Сацыялістычнай Працы, звеннявая калгаса «XVIII партз'езд» Талачынскага раёна (1953–1979 гг.), ураджэнка в. Вугалеўшчына Талачынскага раёна.

**7 верасня** – 105 гадоў таму (1919) нарадзіўся Асіпенка Алесь (сапр. Аляксандр Харытонавіч; 1919–1994), беларускі пісьменнік, сцэнарыст, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, лаўрэат літаратурнай прэміі імя І. Мележа, ураджэнец в. Пушкары Віцебскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Віцебскім раёне).

**7 верасня** – 70 гадоў таму (1954) нарадзіўся Марчанка Валерый Рыгоравіч (1954–2022), пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, гвардыі падпалкоўнік у адстаўцы. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Чырвонай Зоркі Рэспублікі Афганістан, 26 медалямі. Лаўрэат «Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі» Віцебскага аблвыканкама (2019). Ураджэнец с. Парабель Томскай вобласці (Расія). Жыў у г. Віцебску.

**8 верасня** – 510 гадоў таму (1514) пад Оршай адбылася Аршанская бітва паміж войскамі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы.

**9 верасня** – 100 гадоў таму (1924) нарадзіўся Янкоўскі Іван Дзмітрыевіч (1924–2009), Герой Сацыялістычнай Працы. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім

**3 верасня** – 95 гадоў таму (1929) нарадзілася Іванюта Ганна Логвінаўна (1929–2008), Герой Сацыялістычнай Працы, звенявая льнаводчага звяна калгаса «Расія» (з 1970 г. – калгас імя Леніна) Талачынскага раёна. Ураджэнка Батурынскага раёна Заходняй вобласці (зараз – Смаленская вобласць).

**3 верасня** – 65 гадоў таму (1959) нарадзілася Джумантаева Тамара Аляксандраўна, культуролаг, музейны работнік, выкладчык, краязнаўца, уладальнік знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2011), лаўрэат ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны» (2014), ураджэнка г. Полацка.

**4 верасня** – 165 гадоў таму (1859) нарадзіўся Эпімах-Шыпіла Браніслаў Ігнатавіч (1859–1934), дзеяч беларускай культуры, выдавец, фальклярыст, мовазнавец, літаратуразнавец, правадзейны член Інбелкульта, ураджэнец фальварка Судзіловічы Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер Будзькаўшчына Полацкага раёна).

**4 верасня** – 75 гадоў таму (1949) нарадзіўся Дамашкевіч Мікалай Фёдаравіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, старшыня Сенненскага райвыканкама (1984–1985 гг.), 1-ы сакратар Сенненскага райкама КПБ (1985–1991 гг.). У 2010–2014 гг. – памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – галоўны інспектар па Віцебскай вобласці. Ураджэнец г. Жыткавічы Гомельскай вобласці.



